СПАДЧЫНА

Стары Улас

# Год беларуса





СПАДЧЫНА

Стары Улас

# Год беларуса

ВЕРШЫ. ВЕРШАВАНЫЯ АПАВЯДАННІ. ПУБЛІЦЫСТЫКА



МІНСК ● МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА ● 1990

ББК 84Бел7
С 77

*Серыя заснавана ў 1990 годзе*

*Укладанне, падрыхтоўка тэкстаў,
уступны артыкул і каментарыі
Вячаслава Рагойшы*

Эта книга — первое издание произведений Старого Уласа (Владислава Петровича Сивого-Сивицкого (1865—1939), белорусского поэта, о котором М. Горецкий сказал, что такие поэты «...имеют в нашей поэзии литературно-нравственное значение как поэты с мозолистой рукой, которые не только «из народа», но и «сам народ». Большинство стихотворений — художественная обработка народных легенд и преданий.

С $\frac{4702120202—130}{М 302(03)—90}$ 122—90

ISBN 5-340-00529-1

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1990

## ПАЭТ-САМАВУК З ВАЛОЖЫНА

У Валожыне на вуліцы Савецкай, 49 прыцягвае да сябе ўвагу ўрослая ў зямлю старасвецкая хаціна з прымацаванай да яе шыльдай: «У гэтым доме да 1914 года жыў вядомы беларускі збіральнік фальклору, паэт і публіцыст Стары Улас (Уладзіслаў Пятровіч Сівы-Сівіцкі)». «Вядомы» — сказана, відавочна, з разлікам на будучае, на перспектыву. Бо хто сёння (на вялікі жаль!) асабліва ведае Старога Уласа? Бо хіба можна назваць вядомым пісьменніка, у якога ні пры жыцці, ні пасля смерці не выйшла ніводнае кніжкі? Аднак наш час тым і вызначаецца, што мы вяртаем з забыцця асобных цікавых творцаў, даём ім новае жыццё, надзяляем шырокай вядомасцю. Упершыню з'яўляецца і кніжка Старога Уласа, пра што, зрэшты, марыў вялікі Янка Купала, нават згодны быў стаць рэдактарам такой кніжкі. Дарэчы, Іван Дамінікавіч і яго жонка Уладзіслава Францаўна былі па-чалавечы ўдзячныя Старому Уласу: у Вільні на пачатку стагоддзя ён іх упершыню пазнаёміў, стаў, па сутнасці, іхнім сватам...

Дык хто ж ён быў, Стары Улас? Чым заслужыў нашу ўвагу і павагу?

Нарадзіўся Уладзіслаў Пятровіч Сівы-Сівіцкі 10(23) сакавіка 1865 года ў валожынскіх сялян Пятра і Людвікі. Бацька яго, каб зарабіць на сям'ю (быў малазямельны), наняўся ку-

харам у мясцовы маёнтак графа Міхала Тышкевіча, аднаго з багацейшых магнатаў былой Расійскай імперыі. Аднак у 1874 годзе, калі сыну было ўсяго дзевяць гадоў, бацька памірае. Тым жа летам не стала і маці. Круглага сірату ў сваю немалую сям'ю прымае цётка Юзэфа Емільянская. Неўзабаве Уладзіслаў ідзе ў памочнікі да кухара таго ж графа Тышкевіча. Відаць, кемлівы і працавіты хлопец кінуўся ў вочы самому графу. Бо праз некаторы час яго, ужо дзецюка, прызначаюць кухарам, а затым, калі яму было каля трыццаці, ён становіцца аб'ездчыкам і, урэшце, ляснічым.

Кожны дзень Сівы-Сівіцкі конна аб'язджаў бясконцыя лясы графа, абшары Налібоцкай пушчы, судакранаючыся з прыродай ва ўсе поры года і сутак. Родныя краявіды цешылі сэрца, узнімалі настрой, абуджалі прагу творчасці. Праца аб'ездчыка і ляснічага давала магчымасць глыбей спазнаць і само жыццё: клопаты і скупую радасць ваколічных сялян, мітусню засцянковай шляхты, панскія забавы, пыхлівую разбэшчанасць царскіх чыноўнікаў. Усё гэта давала тэмы для вершаў і вершаваных апавяданняў, клалася ў вершаваныя радкі, увасаблялася ў творах пра беларускую восень і зіму, вясну і лета, пра нялёгкую, але адначасова радасную сялянскую працу, пра рэальнае і легендарнае ў жыцці роднага народа. Штодзённыя зносіны з дзесяткамі людзей насычалі лексікон Старога Уласа моўнымі самародкамі, абагачалі яго памяць і ўяву пярлінамі вусна-паэтычнай творчасці.

Сяляне паважалі высокага, прыгожага, з вусамі і невялікай — клінам — бародкай ляснічага, які паводзіў сябе з імі як з роўнымі, спачуваў ім, дапамагаў лесам, заступаўся за іх, калі трэба было, перад самім графам. З сялянамі Сівы-Сівіцкі заўжды гаварыў па-беларуску, што выклікала насмешкі, а то і нараканні мясцовага панства і засцянковай шляхты. Нават у роднай сям'і лічылі гэта своеасаблівым дзівацтвам, а то і здрадай «польскасці». Сям'я Старога Уласа была каталіцкай, а ва ўяўленні многіх беларусаў-католікаў каталіцкае веравызнанне

атаясамліваецца з польскай нацыянальнасцю. Сам жа паэтляснічы веравызнанне і нацыянальнасць выразна адрозніваў. У яго пашпарце ў адпаведных графах было запісана:рэлігія — рымска-каталіцкая, нацыянальнасць — беларусін...

Уладальнікі лясоў не давалі сваім службоўцам доўга затрымлівацца на адным месцы (успомнім хаця б лёс лесніка Міхала — бацькі Якуба Коласа). У 1914 годзе Сівога-Сівіцкага перавялі на службу пад Ашмяны (некаторы час жыў у Варнянах цяперашняга Астравецкага раёна). Праз нейкі час пераехаў з сям'ёю ў Вільню, а ў неспакойным 1920 годзе перабраўся ў Сужаны Немянчынскай гміны Віленскага павета. У 1934 годзе за больш чым саракагадовую службу атрымаў ад графа Тышкевіча кавалак зямлі ў суседніх Шашэльгішках і тут на сваёй гаспадарцы дажыў апошнія гады. Памёр ад запалення лёгкіх 30 верасня 1939 года. Пахаваны на Сужанскіх могілках.

Усё жыццё Стары Улас цягнуўся да навукі. Як падкрэслівае руплівы біёграф пісьменніка Г. Каханоўскі, «толькі праз самаадукацыю, дзякуючы прыроднай настойлівасці, дайшоў да ўсяго сам, стаў пісьменнікам». Калі яшчэ ў Валожыне не было і пачатковай школы, самавукам авалодаў рускай і польскай граматай (пісаў беларускай лацінкай, каліграфічным почыркам і амаль без памылак). Потым імкнуўся даць асвету сваім і чужым дзецям. Аддаў пад вясковую школку палову сваёй хаты, у якой вучыла — дарэчы, на роднай мове — спецыяльна нанятая настаўніца, тыповая беларуская «дарэктарка». Але ўлады пад пагрозаю закрыцця прымусілі перавесці выкладанне ў школцы на рускую мову. Усе дзеці Старога Уласа (а іх было васьмёра: чатыры сыны і чатыры дачкі) атрымалі сярэднюю адукацыю, а двое — і вышэйшую. Пісьменнік на пачатку стагоддзя сабраў неблагую, як на той час, хатнюю бібліятэчку з рускіх і польскіх кніг, якія даваў чытаць суседзям і знаёмым. Калі ж у выніку рэвалюцыі 1905—1907 гг. з'явіліся легальныя беларускія кніжкі і газеты, яны таксама папоўнілі кнігазбор

паэта-ляснічага. Чытанне, індывідуальнае і калектыўнае, стала добрай традыцыяй у вялікай сям'і Старога Уласа.

Пісаць паэт-самавук пачаў спачатку на «панскай», польскай мове — складаў вершы ў гонар сваёй нявесты, а потым жонкі Антаніны, ураджэнкі Вайцяхоўскай. Выпадковая сустрэча ў 1906 годзе з першай легальнай беларускай газетай «Наша доля» адкрыла яму вочы на працэс беларускага нацыянальнага адраджэння. З гэтага часу ён пачынае пісаць толькі па-беларуску, значна пашыраюцца ідэйна-тэматычныя і жанравыя абсягі ягонай творчасці.

Пісаў звычайна на золку, калі ўсе спалі, ці ў святы і прысвяткі, калі не трэба было ісці на службу і нельга было («грэх!») займацца фізічнай працай на сваёй невялікай гаспадарцы. Складаліся вершы і ў часе шматлікіх вандровак па лесе. Паступова складанне вершаў ператварылася ў прывычны штодзённы занятак, стала звычкай і, на жаль, не заўсёды (асабліва ў канцы 20-х — 30-я гады) забяспечвалася творчым натхненнем, абумоўлівалася высокімі ідэаламі Паэзіі. Ужо ў пачатку 30-х гг. у Старога Уласа было звыш тысячы вершаваных твораў, якія ён акуратна перапісваў у агульныя сшыткі, нумараваў, даваў ім нярэдка безаблічныя аднатыпныя назвы («Абразок»). Але да таго часу беларуская паэзія (і не толькі савецкая, але і заходнебеларуская) дасягнула значнага ўзроўню, у ёй з'явілася многа цікавых і арыгінальных творцаў. Вершаванне ж валожынскага паэта-самавука яўна адстала ад гэтага ўзроўню, і вершы яго перасталі друкаваць. Ён стаў пісаць пераважна «для сябе», застаўшыся ў памяці чытачоў лепшымі дарэвалюцыйнымі творамі...

Першыя публікацыі Старога Уласа адносяцца да 1909 года: допіс пра Валожын — 16 красавіка, верш «Сонейка прыгрэла» — 28 мая. З таго часу ён стаў актыўным аўтарам «Нашай нівы», апублікаваў у гэтай «народнай газеце» (А. Лойка), бадай, усё лепшае, што належыць яго пяру. Даючы ацэнку творчасці Старога Уласа, у сваёй вядомай «Гісторыі белару-

скае літаратуры» (Вільня, 1920) Максім Гарэцкі пісаў: «Яго творы цэнны для нас і арыгінальны тым, што паказваюць, як творыць сам народ. Нічога інтэлігенцкага ў іх няма, яны й ня вельмі часам складны, але чуецца ў іх сіла самое зямлі, беспасрэдны павеў самога жыцця беларускай вёскі. Яны — натуральны адростак народнай паэзіі, казак і гутарак, легенд, жартаў... Стары Улас і Лявон Лобік, а болей-меней А. Петрашкевіч і іншыя (паэты-нашаніўцы, сучаснікі Старога Уласа.— *В. Р.*) маюць у нашай паэзіі літаратурна-маральнае значэнне як песняры з мазольнаю рукою, што не толькі «з народа», але і «сам народ». Жывець душа народа — жывець народ!»

Гэта ацэнка, па сутнасці, не ўстарэла і сёння. Сціплае, нягучнае, але шчырае, па-народнаму простае, часам дасціпнае слова Старога Уласа і сёння можа парадаваць нас, як радуюць няхітрыя ўзоры народных майстроў: ганчароў, бондараў, рэзчыкаў па дрэве... Наша сённяшняе разуменне гэтага слова не разышлося і з кароткай заўвагай Максіма Багдановіча, зробленай ім у літаратурным аглядзе «За тры гады (1913): «Л. Лобік і Стары Улас далі некалькі дужа няхітрых, але верных і таму цікавых малюнкаў нашай вёскі». Відавочна, аўтар славутага «Вянка» ўказаў тут на самыя істотныя якасці паэзіі Старога Уласа, якія з цягам часу толькі паглыбляліся, выяўляліся больш выразна і своеасабліва.

Па характары таленту Стары Улас, несумненна, паэт эпічнага складу. Лірычных твораў у яго адносна няшмат, ды і многія з іх вызначаюцца апавядальнасцю, падзейнасцю. Такія малюнкі вясны («Вясна»), восені («Восень»), начнога пажару («Пажар»), сцэнкі сватаўства («Сватаўство»), здарэнне на вясковай вуліцы («Спрытны адказ»), на кірмашы («Пірог») і г. д. Сустракаюцца ў яго (праўда, нячаста) і радкі чыста лірычныя — як чалавечы ўздых ці выдых, выкліканыя захапленнем (некім ці нечым), нейкім назіраннем, нейкаю жыццёвай высноваю.

Накшталт гэтага чатырохрадкоўя:

*Слоўца адно, а часам другое,*
*Сказана мудра, у пору,*

*Душу адсвежыць, мысль заспакоіць,*
*Як бы адверне з плеч гору.*

Жывучы сярод народа і з народам, Стары Улас бачыў сацыяльную няроўнасць, сялянскую галечу, нішчымніцу. Для яго самога не ў навіну была сітуацыя, калі

*Часамі хлеба ні крупінкі,*
*Ані ўламаць, ані уліць,*
*А тут яшчэ і для скацінкі,*
*Бывае, трэба прыкупіць.*

*Хаця красуюць кветкі густа,*
*Пяе пяўцоў крылаты хор,*
*Але... сумна, калі ў клеці пуста*
*Ды у гумне свісціць віхор!*

(«Каму што»)

Ці ўсведамляў паэт, чаму так дзеецца і што трэба зрабіць, каб палепшыць жыццё? З аднаго боку, у яго ёсць разуменне, што «ў нашым краі дрэнь, брат, парадкі» («Цярплівы нябожчык»), што мужык «гаруе век свой на другіх», а на яго «пазірае ізвысока Духоўнік, пан, чыноўнік, жыд, Хоць з яго працы будзе сыт» («Пра паноў»), заклікае багатых скінуць «атласы і ядвабы, шубу з сабалямі», пакінуць пыху і «разам працаваць на кавалак хлеба» («З Новым годам»). Аднак гэта разуменне, так сказаць, стыхійна класавае, своеасаблівая, пачатая беларускай літаратурай яшчэ ў XIX стагоддзі «гутарка аб усім чыста, што баліць, але чаму баліць — не ведаем». Не ведаў і Стары Улас рэальнай прычыны тагачаснага народнага болю, не мог знаць, як гэтага болю пазбыцца. Далекаваты ён быў ад ідэалаў рэвалюцыйных дэмакратаў Янкі Купалы, Якуба Коласа,

Максіма Багдановіча... Тым больш далёка — ад памкненняў пісьменнікаў-рэвалюцыянераў з сацыялістычнай арыентацыяй: Цёткі, Алеся Гаруна, Цішкі Гартнага... Чалавек глыбока рэлігійны, які ва ўсіх жыццёвых сітуацыях звычайна кіраваўся пастулатамі дзесяці запаведзяў, ён стараўся не ўмешвацца ў палітыку, жыць па законах агульначалавечай маралі. Як у жыцці — гэтак і ў творчасці. На вяку Старога Уласа ўлада мянялася каля дзесяці разоў. Пражыўшы большую палову жыцця пры цары, паэт з'явіўся сведкам Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 года, акупацыі беларускіх зямель войскамі кайзераўскай Германіі, легіянерамі Пілсудскага, дажываў век у міжваеннай Польшчы, перад самаю смерцю сустрэў прыход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь... Здавалася б, колькі тэм для паэта-патрыёта! Аднак у вершах Старога Уласа — нават напісаных для «хатняга ўжытку», не друкаваных — мы не знойдзем прамога водгаласу ніводнай з гэтых падзей.

Чым жа тады жывілася творчасць паэта-самавука? Чым яна можа прывабіць нас сёння?

Найперш — сцвярджэннем здаровай народнай маралі, маральных прынцыпаў чалавека-працаўніка. А таксама — шчырай любоўю да роднага краю, беларускага селяніна, акварэльнымі малюнкамі беларускай прыроды, непаўторнымі краявідамі роднай зямлі.

Стары Улас услаўляў працу як аснову людскога агульнажыцця і чалавечага дабрабыту («Год беларуса», «Не спанатрыў»). З мяккім гумарам, а то і са здзеклівай іроніяй ён выкрываў асобныя людскія заганы: гультайства («Спрытны адказ»), п'янства сялян («Прыгавор»), іх залішнюю даверлівасць («Праўда»), казнакрадства аканомаў, пісараў і іншых дробных службоўцаў («Гдзе бярозы расахаты...»), непатрэбныя сваркі паміж суседзямі, хабарніцтва судовых работнікаў («Суд»), самадурства паноў («Іголка»), сквапнасць ксяндзоў («Легенда і праўда»), ілжывасць папоў («Патрапіла каса на камень»). Выказаўся ён і на адвечную тэму ўзаемаадносін бацькоў і

дзяцей («З кутка праўды»). Пры гэтым не падтрымаў нараканні бацькоў на дзяцей, бо калісьці, у маладосці, на думку паэта, бацькі былі такія ж, як іхнія дзеці, а можа, яшчэ і горшыя. Не прымаў Стары Улас і вайны як сродку вырашэння канфліктаў паміж чалавечымі супольнасцямі («З Новым годам»).

Часам паэт звяртаўся да народных легенд, паданняў. Але і тут яго цікавілі не легендарныя падзеі самі па сабе, а іх маральная падаснова. Так, у «Кумавых Магілах» апавядаецца пра тое, як на кумоў, што везлі ў санях толькі што ахрышчанае дзіця, напалі ваўкі. Каб самім уратавацца ад лютых звяроў, кумы кінулі ім дзіця. Ды ваўкі не звярнулі на яго ўвагі, а дагналі хрышчоных бацькоў і разарвалі. Аднак гэта яшчэ не ўсё пакаранне за такое антычалавечае злачынства: роўна трыста гадоў душы двух грэшнікаў вымушаны лётаць над месцам, празваным у народзе Кумавы Магілы, палохаючы падарожных. Вось як караецца чалавечы эгаізм, жаданне выратаваць сваё жыццё за кошт іншага! — гаворыць нам паэт сваім творам у поўнай згодзе і з народнай мараллю, і са сваім светаразуменнем.

З такім жа падтэкстам-высноваю і іншыя апрацоўкі народных легенд Старога Уласа: «Курган», «Цікавы» і інш. І ўсё ж больш яго цягнула да рэальнага жыцця, асабліва — да рэальных малюнкаў прыроды цэнтральнай і паўночна-заходняй Беларусі, якую ён, як работнік лесу, добра ведаў і, як сапраўдны патрыёт, шчыра любіў. Перад намі — цэлы вершаваны беларускі каляндар: «Зімою», «Вясна», «Сонейка прыгрэла», «Прамчаўся май», «У дажджлівы час», «Восень»... І вяршыня гэтага календара — напісанае ў 1909 годзе вершаванае апавяданне, дакладней — паэма «Год беларуса», адметны твор не толькі ў спадчыне Старога Уласа, але і ва ўсёй беларускай дарэвалюцыйнай паэзіі.

Пачынаецца «Год беларуса» з апісання роднага краю, якое нагадвае «малюнкі родныя і з'явы» Якуба Коласа:

*Край беларускі, край ты наш родны,*
*Неураджайны ты і бязводны,*
*Нечарназёмна твая зямліца:*
*Глей, або гліна, ці каменіца.*
*Дробны загоны і скібы тонкі,*
*А замест межаў дык баразёнкі,*
*Доўгія ніўкі і надта вузкі,*
*Як быццам мотуз ад добрай стужкі...*

Ёсць у «Годзе беларуса» і апісанне народа, што жыве ў гэтым краі:

*Народ наш ціхі, прытом нясмелы —*
*Яго згубілі часты раздзелы.*
*Акром бядоты у беларуса*
*Добрае сэрца, хоць часам куса;*
*Вось, як той кажа, і з ім бывае,*
*Ён дае раду, не наракае...*

Беларускі селянін і беларуская прырода — галоўныя дзейныя асобы паэмы Старога Уласа «Год беларуса». Вясна, лета, восень, зіма — гэта і прадмет паэтычнага выяўлення, і фон, на якім паказана жыццё беларускага мужыка ў розныя поры года. Тым самым «Год беларуса» выклікае ў памяці вядомую паэму класіка літоўскай літаратуры Крысціёніса Данелайціса «Чатыры пары года». Хоць тут, несумненна, не запазычанне, нават не творчая вучоба (наўрад ці ў тыя часы беларускі паэт мог што-небудзь ведаць пра Данелайціса), а звычайнае тыпалагічнае падабенства. Розныя цыклы сялянскай працы знайшлі адлюстраванне ў «Годзе беларуса» — вясновы («Аруць, і сеюць, і барануюць... То стрэхі правяць, платы гародзяць, Ячмені сеюць, гнаі вывозяць І садзяць спешку або хунтоўку...»), летні («Бліснуць на сонцы сярпы і косы, Звіняць мянташкі, растуць пракосы»), асенні («Жніво ярное — гэта ўжо восень... Тут жыта сеяць, снапы ўбіраці, Араць на зіму і ляны рваці...»), зімовы

(«Малаціць трэба і веяць збожжа... Хто каля дому корміць каровы, А хто да лесу едзе па дровы»). Самыя розныя віды сялянскай працы апісаны ў паэме: прадзіва кудзелі, тканне, догляд скаціны, сенаванне, начлег, нават няхітрыя грашовыя падзаробкі («...на соль, на боты, На мерку газы ці на фунт мазі»). Так, як і ў жыцці,— найперш цяжкая, але жаданая і патрэбная праца («Працуюць людзі, поту не чуюць...»; «Хоць залівае з працы пот вочы, Кожан вясёлы, кожан ахвочы...»), паміж якой — кароткія ўцехі: вясковыя ігрышчы («Пачнуць усе гуртам песенькі пеці, Скачуць, гуляюць, крычаць, як дзеці...»), народныя абрады («Ёсць маладзіца, дык мой ты браце, Ну, дык снапшчыну тады спраўляюць, А усе жнейкі гулянкі маюць...»).

«Год беларуса» — узор жывой беларускай народнай мовы, яе цэнтральных і паўночна-заходніх гаворак, што склалі аснову літаратурнай нормы. Увогуле, мова Старога Уласа даволі багатая, па-народнаму сакавітая, у ёй увасобіліся народны тып мыслення, тыпова народная вобразнасць. У паэме дзесяткі назваў тыпова беларускіх з'яў прыроды, раслін, жывёл, уласных імён. Верш паэмы — акцэнтна-складовы (дакладна — чатырохакцэнтны дзесяцiскладовік), пераходная форма ад сілабікі да сілаба-тонікі. Ён надае твору гутарковасць, інтанацыю нязмушанай размовы — традыцыя, якая ідзе яшчэ ад ананімных беларускіх гутарак XIX стагоддзя. Усім гэтым паэма таксама прыцягвае нашу ўвагу. Яна застаецца не толькі помнікам пэўнага часу, але і творам, які можа (і павінен!) уключыцца ў жывую плынь сённяшняга літаратурнага працэсу, узбагаціць чытача духоўна і эстэтычна.

Уяўленне пра Старога Уласа як літаратара і чалавека пэўным чынам пашырае яго публіцыстычная творчасць. Допісы, падпісаныя псеўданімам Стары Улас, пачалі з'яўляцца ў «Нашай ніве», як ужо адзначалася, з 1909 года. Аднак, па ўсёй верагоднасці, пісьменнік стаў кантактаваць з газетай крыху раней. У прыватнасці, у № 2 «Нашай нівы» за 1908 год была на-

друкавана наступная невялікая нататка за подпісам «Валожынскі», якая і зместам, і стылем надта блізкая да таго, што і як пазней друкавалася тут за подпісам Стары Улас: «М. Валожын Ашмянскага павета Віленскай губерні. У в. Пешкуры ўжо няма хлеба, ядуць бульбу, дый яе мала. Заработкі слабыя, па дварах за малацьбу плацяць 15 к. у дзень. А п'юць валожынскія беларусы больш ды больш, п'юць не толькі манапольку, але і «саматужку», і «лякероўку». П'юць мужыкі, п'юць і «інтэлігенты». Вось які глухі, цёмны і няшчасны наш кут! Народ абяднеў яшчэ і таму, што няма пашы, сервітуты неяк адабралі. Ад гэтага і скаціны сталі мужыкі менш гадаваць. Скаціну прыходзіцца трымаць на выгане, гдзе нічога не расце».

9 красавіка 1909 года ў рубрыцы «Паштовая скрынка» рэдакцыя газеты, звяртаючыся да валожынскага карэспандэнта, пісала: «М. Валожын Віленскай губерні Ашмянскага павета. *Старому Уласу.* «Цяперака многа пішуць і гаворацць, што мужыкі не ўмеюць дабівацца сваіх правоў; можа, гэта і праўда, але як прыйдзецца іх дабівацца, дык ніхто не парадзіць нашаму брату, і часта ён ходзіць так, як сляпы каля плоту, і то там, гдзе, здаецца, павінен быў бы ён знайсці добрую параду і апеку...» — Мы даведаемся аб гэтай справе акуратне і вас заведамім, што рабіць!» А ўжо праз тыдзень «Наша ніва» змясціла допіс валожынскага аўтара, падпісаны: Стары Улас. У натацы апісвалася мястэчка Валожын, нацыянальны і рэлігійны склад яго жыхароў («дзве часці яўрэяў, а трэцяя часць хрысціянаў, больш праваслаўных»), яго тагачасны «культурны патэнцыял» («ёсць валасць, аптэка, дзве манапольці; ёсць 4 вучылішчы, у тым валаснoе рамеснае, гдзе вучаць плесці кошыкі»). З таго часу на працягу пяці гадоў у «Нашай ніве» рэгулярна з'яўляліся допісы Старога Уласа. Пра што ён пісаў? Пра надвор'е і ўраджаі, пажары і самагубствы, пашырэнне п'янства і абыякавыя адносіны да продкаў, іх магіл, факты зладзейства і спадману, рынчаныя цэны, розныя бытавыя здарэнні... З гэтых допісаў праглядвае спагада Старога Уласа да

чужога гора, чужой бяды, яго паважлівае стаўленне да прадстаўнікоў іншых народаў (пра пагарэльца яўрэя І. Шварца: «Шкада, бо гэта добры чалавек, і прытым небагаты»), да бедных і цёмных сялян («Бедныя, цёмныя людзі! Калі ж і да іх загляне сонца ў ваконца?»). Ужо самі загалоўкі асобных допісаў — па-народнаму дасціпныя, дакладныя, афарыстычныя — многае гавораць і пра літаратурныя здольнасці валожынскага карэспандэнта, і пра самую сутнасць яго нататак: «Думаем — за морам, а смерць — за плячыма», «Служы пану верна, а ён нос адверне», «Праспаў бядак ногі», «Бядуй не бядуй, а за працу бярыся», «Канец света, бо не ўскрэсла прасвета», «Кепскае тое ігрышча, дзе кулак свішча», «Вінаватых шмат, а ў атвеце Ігнат», «У нас калі хочаш каго знайсці, то мусіш у карчму пайсці», «П'юць, п'юць і душу прадаюць»...

Мужычая беднасць, п'янства, бойкі, калецтвы... І ўсё гэта, на думку дапісчыка,— ад беззямелля. «У нашай воласці вялікая зямельная цесната,— пісаў Стары Улас у «Нашай ніве» 7 мая 1909 года.— У нас мужыцкі надзел быў ад 8 да 12 дзесяцін, а цяпер многа людзей падзялілася на 6, 8, 10 і 16 часцей, не гаворачы аб трацінках і чацвярцінках. У Валожынскай воласці жыве 13 тысяч душ, хат усяго 2062; з іх 673 хаты маюць менш адной дзесяціны, 833 хаты маюць па дзве дзесяціны, 377 хат ад двух да трох дзесяцін, і толькі 178 хат маюць больш трох дзесяцін. На душу наогул выходзіць трохі больш як палавіна дзесяціны — з усіх валасцей павета Валожынская найбяднейшая». І тут жа дадаваў: «У нашым двары (відаць, меўся на ўвазе двор графа Тышкевіча.— *В. Р.*) прадаецца зямля па 100 рублёў дзесяціна, а банк дасць 40—50 рублёў, дык багаты купляе зямлю, бо можа далажыць, а бедны не мае сілы купіць. Так і гінем ад малазямелля; хто можа, параязджае ў Амерыку, Пецярбург і другія месцы».

Стары Улас прапаноўваў і свае рэцэпты ад хранічнай хваробы малазямелля: арганізацыя сялянскіх хаўрусаў, пераход

на хутары («Браты беларусы! Кідайма старыя парадкі, а пераходзьма жывей на хутары. Будзе менш няшчасцяў, а карысці многа»). Як на сённяшняе наша разуменне, такія «лекі» наўрад ці маглі б вылечыць такую хваробу. Аднак пісьменніку нельга адмовіць у шчырым жаданні дапамагчы братам-мужыкам, паказаць некаторыя пуцявіны да больш культурнага і заможнага жыцця.

Шчырасць і праўдзівасць ўсяго, што было напісана Старым Уласам, напісана вершам і прозаю, яшчэ задоўга да рэвалюцыі прыцягнула да пісьменніка чытацкую ўвагу. Яго вершы і вершаваныя апавяданні сістэматычна перадрукоўваліся ў штогадовых «Беларускіх календарах», дзе змяшчаліся побач з творамі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Алеся Гаруна і іншых выдатнейшых беларускіх паэтаў. Пяць яго вершаваных апавяданняў («Год беларуса», «Тры зладзеі», «Кумавы Магілы», «Не спанатрыў», «Цікавы») у пераважнай ступені абумовілі характар і вартасць тагачаснай мікраанталогіі беларускай паэзіі — зборніка «Апавяданні і легенды вершам розных аўтараў» (Вільня, 1914). Асобныя творы Старога Уласа ўключаліся ў розныя чытанкі, дэкламаваліся на літаратурных вечарах, нават за межамі Беларусі. На жаль, пазней імя паэта-самавука стала прызабывацца. Толькі пара яго вершаў трапіла на старонкі першага тома «Анталогіі беларускай паэзіі» (1961) і зборніка «Беларуская дакастрычніцкая паэзія» (1967). Як слушна заўважыў Г. Каханоўскі, «ніхто ні разу не паспрабаваў сабраць яго творы хоць бы ў невялікі зборнічак, а гэта была б наша ўдзячнасць і павага да чалавека-самавука, які ў меру сваіх здольнасцяў спрыяў развіццю роднай літаратуры».

І вось нарэшце, у 125-ю гадавіну з дня нараджэння Старога Уласа, яго першая кніга з'яўляецца ў свет, выходзіць у людзі. Будзем верыць, што яе спаткае шчаслівы чытацкі лёс, працяглае жыццё. Яе з'яўленню спрыялі краязнаўцы Генадзь Каханоўскі і Генадзь Равінскі, бібліёграф Ніна Ляшковіч,

якія дапамаглі адшукаць некаторыя творы Старога Уласа, удакладніць асобныя моманты яго біяграфіі. Ім — мая шчырая ўдзячнасць. Нізкі паклон і двум аматарам роднага пісьменства, беларускім патрыётам у Літве Алесю Курчэйку і Вінцэнту Янушэвічу, якія даглядаюць сціплую магілу пісьменніка.

*Вячаслаў Рагойша*

# Верши



* * *

Слоўца адно, а часам другое,
Сказана мудра, у пору,

Душу адсвежыць, мысль заспакоіць
Як бы адверне з плеч гору.

## ЗІМОЮ

І страху мала,
Дзіва няма,
Што ўжо настала
У нас зіма.

Снегу ў калена
І белы шлях.
Там дзядзька сена
Вязе ў санях.

А другі — дровы
Прэ на убой.
Гоняць каровы
На вадапой.

Ніхто зімою
Не зол нічуць.
Дзеці капою
Са школкі йдуць.

Гоман і смешкі
У іх гарой,
То зноў у снежкі
Б'юцца парой.

То лепяць дзеда,
Хоць ў рукі — зноб *.
А у суседа
Малоцяць боб.

---

* Словы, пазначаныя зорачкай, тлумачацца ў каментарыях.

## СВАТАЎСТВО

Раз зімоваю парою,
  Мусі, ў мясаедзе,
Сабраліся між сабою
  Нашыя суседзі.
А ці ўлетку, ці зімою
  Так па людзях ходзіць,
Што старыя між сабою
  Сватаўство заводзяць.
Дык як выпілі даволі
  Крэпкай саматужкі,
Янка наш хваліць паволі
  Стаў свае дачушкі.
«Старша,— кажа ён,— гадамі
  Мая Кацярына.
Каб вы, братцы, знаді самі —
  Анёл, не дзяўчына!
І паслушна, і набожна,
  Ціхая, як рыба,
Дык хто возьме, сказаць можна,
  Скарб дастане хіба!
А малодшая Мар'яна
  Да ўсякай работы,
Як да шыцця, так да ткання,
  Мае шмат ахвоты.
Мо на горб яе другія
  Звернуць з вас увагу,
Але я ёй дам за тое
  Сто рублёў пасагу».
Ўчуўшы гэта, ад парога
  Юрка Мікалаеў

Падыходзіць да старога
    Ды скора пытае:
«Ведаеце што, татуля,
    Можа, ў вас часамі
Ёсць Тацяна ці Настуля
    Ды з двума гарбамі?!»

## НА ВЯСЕЛЛЕ СВАЯКУ

Маючы часу крыху нядзеляй,
Дык пішу строчку адну, другу.
І выбачайце, што на вяселле
Да вас прыехаць я не магу.

Хоць мне бяседы вашай, прызнацца,
Як на сягоння дык будзе жаль,
Але не можна памеркавацца,
Калі нас дзеліць спорая даль.

Каб я меў крылы лёгкае пташкі,
Дык як, здаецца, у гэты час
Шпарка ляцеў бы, хоць стар і цяжкі,
Ў сваю старонку, туды да вас!

Дык пасылаю да вас па слове
З шчырага сэрца, хоць і за свет.
Прыміце, сынку, у роднай мове
Шчыра жаданне, шчыры прывет.

Дай табе, Божа, шчасця і долі,
Каб быць багатым, не гараваць,
Шчасця, здароўя, бяды ніколі,
Бацьку і матку каб шанаваць.

Не знаць ніколі калатні, сваркі,
Век весяліцца, не гараваць.
І пільнавацца каб гаспадаркі
Ды пры тым Бога не забываць.

І на астатку пры добрай волі
З душы і з сэрца гэтак для вас —
Хлеба і солі, грошай даволі
Вам пажадае Стары Улас.

## ЦЯРПЛІВЫ НЯБОЖЧЫК

Чуў я нядаўна, мае вы кветкі,
Сапраўды дзіўны выпадак гэткі.
Аб ім шырока усе казалі,
Можа, і праўда, калі не салгалі.
Быць мела гэта, скажам вашэці,
Ды у Вілейскім недзе павеце.
Неяк зімою, мусіць, пад поўня,
Адзін там дзядзька памёр раптоўна.
У гэткіх справах трэ асцярожна:
Такіх вось трупаў хаваць не можна,
Бо суддзя, доктар, як бы на кепства,
Мусяць уперад правесці следства.
Дык хоць прыбралі па смерці гарне,
А палажылі толькі ў трупярні.
Гэтак ці чулі без амбарасу *,
Як быць павінна, толькі да часу.
Пакуль да следства, то ж няма жарту,
Дык у дадатку стаўлялі варту,
Але, сказаўшы так, без галасу *,
Суддзя прыехаць не меў ўсё часу.
Усё збіраўся туды прыехаць.
А наш нябожчык высах, бы вехаць,
Толькі смярдзеці пачаў ён вельмі,
Покуль духоўнік прагнаў з трупэрні.
Зноў тарапаты *, ды варта смехаў,
Як той нябожчык дамоў прыехаў.
Клопат вялікі: дзе ж яго дзеці?
Ну дык унеслі зараз да клеці
І там да часу супачывае
Ды таго следства цярпліў чакае.

Яму такая, знаць, выйшла карта,
Што днём і ноччу пільнуе варта.
Хоць смурод душыць, сказаўшы ўперад,
А можа, прыйдзе на следства чэрад?
Пэўна ж, урэшце, як мне здаецца,
Можа, няшчасны калі дажджэцца?
Гэтак сказаўшы проста, без звадкі:
У нашым краі дрэнь, брат, парадкі.
Каб прыглядзецца толькі патросе,
Пэўна, і болей чаго б знайшлося.

## АБЯЦАДЛА

Абяцадла — рэч не цяжка:
Бусел — гэта будзе пташка,
Цар — ў пачоце быў калісьці,
Дуб — зімою ёсць без лісця,
Этна — то бугор агністы,
Фельчар — то не арганісты,
Грошык — дробная манета,
Гусь — дамова пташка гэта,
Іскра — жарка і пякуча,
Ель — шуміць, калі растуча,
Конь — баіцца шмат астрогі,
Ліс — ёсць звер чацвераногі,
Лось — вялікі ёсць, і годзе,
Мак — красуе ў агародзе,
Наста — дзеўка працавіта,
Окунь — рыба смакавіта,
Перац — горак будзе хіба,
Рак — гавораць, то не рыба,
Сучка — брэша, ёй уцеха,
Торба — меншая ад меха,
Улей — пчолам ёсць храміна,
Воўк — то дзікая скаціна,
Х — закінем у загладу,
У — чытаюць, але ззаду,
Заяц — то лясная кошка,
Жоўты — певень і какошка,
Змей — сярдзіты вельмі, падла,—
І ўсё будзе абяцадла.

# ВЯСНА

Ужо прайшла зіма цяжкая,
Мароз, мяцеліца ліхая,
Паплыў з вадою крыгай лёд,
І снег ад сонца тае ў лёт.
Ужо вады паўны разоркі,
І зачарнеліся узгоркі,
Як бы сухія лішайкі,
Ды зашумелі ручайкі.
А знізу лёгкі ветрык вее,
Ды сонейка так цёпла грэе,
Бор неяк весела шуміць,
У лузé травіца зеляніць.
І ўсё ўжо будзіцца ад сна,
Бо набліжаецца вясна!
Аджылі дробныя мурашкі,
Чарвякі, матылькі, а пташкі
Шчабечуць, звоняць і пяюць,
Людзям ахвоты паддаюць.
Жаваранычка ў прасторы
Шчабеча, як у сінім моры,
Плыве і бусел, і жураў,
І дрозд запеў і засвістаў.
А як тыкеля * ён засвішча,
Ляціць глушэц на такавішча.
Гудзіць лятучы тоўсты жук,
Балбоча ёмка цецярук,
Пішчаць дзесь чайкі на балоце,
Пліска хвастом трасе на плоце,
Гурчыць працяжна жабін хор,
І дзеці пруцца з хат на двор.

Прайшла зіма, як не бывала,
Усім лягчэй на сэрцы стала.
Настаў любы і мілы час,
Бо ўжо вясна прыйшла да нас!

## СОНЕЙКА ПРЫГРЭЛА...

Сонейка прыгрэла,
Растапіўся снег;
Поле зачарнела,
Ручаёк пабег.

Жучкі загудзелі,
Распусціўся сад,
Пташачкі запелі
На вясёлы лад.

Красачкі стракаты
Ўсюды зацвілі,
З песняю араты
Ўзяўся да зямлі.

Арэ, барануе
Родны свой загон
І трудоў не чуе,
І ні поту ён.

Сыпнула травіца,
Зелен кожны кут.
Урадзіць зямліца —
Вернецца за труд.

Як бы з-пад няволі
Выйшла ўсё з зімы.
Калі ж лепшай долі
Даждзёмся і мы?!

# З КУТКА ПРАЎДЫ

На свеце многа наракання
Ды многа слёз і многа бед,
Але, як кажа нам пазнанне,
Вядзецца гэта з даўніх лет.

На маладых старыя ўссеўшы,
Ды вельмі брыдка ганяць іх;
Але, так з боку паглядзеўшы,
Няма за што хваліць саміх.

Не адзін бацька наракае,
Што п'яніца яго сынок,—
Але няхай прыпамінае,
Як сам у водцы мокне, мок.

Другая маці зноў бядуе,
Кляне і плача на свой лёс:
Яе дачушка не шануе
І часта хвігі суне ў нос.

Сягоння гэта ёй не ліха,
Увагі к старасці няма!
А тое, бедная, забыла,
Што так рабіла і сама...

І часта голавы марочым,
Хоць тут адказ, здаецца, прост,
Што праўды толькі мы не хочам
Казаць ніколі на свой хвост.

## МОДА

Гаварыць тыкеля шкода,
Што у нас цяпер за мода.
А няхай яе мядзведзь! —
Прост няхораша глядзець.
Бо із гэнае прычыны
Пані, панны і мужчыны,
Шапянуўшы так, але
Хоць стаўляй у канапле!
Бо вось гляньце ж самі, людзі:
Голы лыткі, голы грудзі
Выстаўляюць кожан раз,
Як бы рэчы, напаказ.
Капялюшыкі таковы,
Што, сказаўшы без адмовы,
Выгляд будзе іх такі,
Як да ночы ёсць гаршкі.
Безрукавыя іх блюзкі
Ды спаднічкі вельмі вузкі
І кароткі, далібог,
Што разняць не можна ног.
Чаравічкі клінам трошкі
І як рэзгіны панчошкі,
Праз каторы, так сказаць,
Цыбы * голыя відаць.
А абцасы, Бог мой мілы! —
Усё роўна як бы шылы,
Не адважышся на скок:
Так і звернуцца набок.
І нарэшце — каб іх пранцы! —
Толькі глянуць на іх танцы,

Дык не толькі бярэ смех,
А ўзірацца будзе грэх!
І мужчыны тож таковы:
Голяць вусы і галовы,
Дык паны і панічы
Іздалёк, як таўкачы.
Погаласкі ж ёсць таковы,
Што і бабы ўжо галовы
Будуць скора ўсе галіць.
Што ж, і гэта можа быць!..

## ВЫГАВАРЫЛАСЯ

Неяк бачыць мне папала
Гэтку небыліцу,
Як кабета прадавала
На таргу курыцу.
Грэбень красны, сама чорна,
Але крылы рабы.
Непачэсна, непазорна —
От, вядома, ў бабы!
Дык праз гэтую прычыну,
Прызнацца вашэцям,
Ту мізэрную пташыну
Мала хто прымеціў.
Толькі нейкая купчыха
Туды прыдыбала
Ды, ці чуеш, як на ліха
Таргавацца стала.
Кажа: «Што за небыліца,
Хіба варта цуда?
Твая гэтая курыца
Дык жа вельмі худа!»
Баба тут не утрывала:
«То не дзіў, што ссохла.
Каб ты столькі пахварала,
То, напэўна б, здохла!»

## СПРЫТНЫ АДКАЗ

Ў дзень на вуліцы стаялі
Сяляне гурбою,
Смяяліся, жартавалі
Ўсе паміж сабою.

І як здаўна ў нас бывае
Пры гэтакай справе —
Адзін лоўка нешта збае,
А другі падправе...

Дый было іх там нямала,
Як стада авечак.
Аж праходзіць тут памалу
Нейкі чалавечак.

Дзень быў летні, не гультайскі,
Дык шоў мо да працы,
А ўвесь гэты тлум лайдацкі
Пачаў прыставаці,

Лезуць міма яго волі,
Быццам мухі ў вочы.
«Чаму,— кажуць,— брэшуць болей
Сабакі уночы?»

А той мовіць гэткім знакам:
«Хіба вось як будзе,
Што удзень брахаць сабакам
Памагаюць людзі!»

## ПРАМЧАЎСЯ МАЙ...

Прамчаўся май і веснавая
Пара мінулася у нас,
Ужо і лета наступае —
Гарачы наступае час.
Вясна, вясна — дзянькі любыя —
Так дарагі, так мілы час,
Чаму, як леты маладыя,
Так скора пакідаеш нас?!
Ты прыбірала ў зелень мая
Зямлю, дзярэўцы і кусты,
Хоць прыйдзе некалі другая,
Але не будзеш гэта ты!
Нам жаль тваіх дзянькоў пагодных,
Ціхіх і цёплых вечароў,
Так сэрцу дарагіх і родных,
І гэты час, як сон, прайшоў...
Гэтак і моладасць нясецца —
Жыцця людскога гэты свет —
І толькі памяць астаецца
Гэтых вясёлых, бурных лет!..

# ЗАЦІШНЫ КУТОК

Край не вельмі далёкі, знаная прырода,
Дзе мне жыць давялося так, мусіць, з паўгода.
Там няма гор вялікіх, ні балот трасучых,
Але крыху затое ёсць пяскоў сыпучых.
Ёсць і лесу мясцамі, як сказаць, патросе,
Відаць на вузкіх ніўках дробнае калоссе
Як жоўтага ячменю, так шэрага жыта.
Ёсць дарога гладкая з камення, убіта,
Высаджана прысадамі, цягнецца, як струнка,
І тут жа недалёка ідзе ўдаль чыгунка,
Стройная і гібкая, у рэчы * дзяўчына,
Гдзе на дзень па два разы прыходзіць машына,
Цягне многа вагонаў, аж пыхціць ад пары,
Вязе хлеб ды аружжа і усе тавары.
За чыгункай удалі лес сінее трошкі
І, як вокам абнімеш, густа стрымяць вёскі.
Два ставы немалыя, сенажаць і рэчка,
Поле, двор і магілкі і зараз мястэчка.
Там дамкі невялікі, крытыя дахоўкай,
Рынак доўгі, шырокі з драўлянай паркоўкай *,
Хоць не ўвесь ён з брукам чыста утрыманы.
І там жа зараз збоку касцёл мураваны,
Гдзе я кожнай нядзелькі, спазнаўшы дарогу,
Хадзіў разам з другімі памаліцца Богу.
А убаку паводдаль, напроці касцёла,
Як і ў кожным мястэчку, жыдоўская школа.
І, ўрэшце, як на дзіва, ззаду за царквою
Будынак, куды ходзіць сам кароль пехатою.

## У ДАЖДЖЛІВЫ ЧАС

Доўга у хаце нашыя брацці
Рукі зламыўшы сядзелі,
Бо, як на згубу, дождж ліў як з лубу,
Ліў праз чатыры нядзелі.

Цяпер жа многа выслаўляць Бога
За яго ласку патрэба,
Як за пагоду, так за уроду *,
Што яе выслаў нам з неба.

Ўжо пан Макары у календары
Жарку пагоду нам піша,
Сонейка грэе, і ветрык вее,
Спелую ніўку калыша.

Жнейкі рупліва рэжуць на ніве,
Ўюць перавяслы не слабкі,
Вяжуць снапамі, кладуць радамі,
А после ставяць у бабкі.

А на балоце ў гразі і поце
Нашы мужчыны працуюць:
Травіцу косяць, сушаць, выносяць,
Свежае сена гатуюць.

Цяпер у хатцы можа астацца
Сівавалосы дзядуля,
Унукаў кучка, котка і сучка
Або старая бабуля.

У дождж і слоту, буру, грымоту
Мы са слязамі ўздыхалі.
Прайшла трывога, як з ласкі Бога
Добрай пагоды прыждалі.

Як на пачатку, так на астатку
Дай, Божа, зжаці, звязаці
Хлеб гэты новы, свежы, здаровы,
У добрым здароўі спажыці.

## ПАЖАР

Шырока крылы распусціла
Ўжо ночка цёмна над зямлёй.
Усё зацiхла, супачыла,
Настала цішыня, спакой.

На ветках птушкі ўжо паснулі,
Пад кустам зайчык задрамаў,
З-за хмары зорачкі бліснулі,
Пугач у лесе загукаў.

У лузе ціха, і на рэчцы
Ні хвалі — чоўна не відно.
Вада ледзь-ледзь узварухнецца,
І рыба плюсне аж на дно.

З прыродай разам люд рабочы
Пайшоў спачыць — і стар і мал.
Прыклеіў скора сон ім вочы,
І ўсе паснулі напавал.

У поўнач пеўні заспявалі,
Завыў сабака ў ночнай цьме.
І глуш ізноў. А там ў аддалі
Мільгнулі ціха цені дзве.

. . . . . . . . . . . . .

Што гэта?!. Ў хаце ля дарогі
Бліснула полымя, йдзе дым...
Прачнуўся нехта, дзякуй Богу,
Зачаў крычаць: «Пажар! Гарым!»

І ў гэту цішыню начную,
Як панаваў нявінны сон,
Усе пачулі весць благую,
Калі на збор ударыў звон.

І зараз людзі наляцелі,
Хоць хто гдзе быў на старане,
Маўляў, мурашкі закіпелі,
Як муравейнік хто пырне.

Падняўся гоман, крык вялікі,
Агонь пякельна бушаваў,
Ішоў адгэтуль рогат дзікі
І з дымам іскры вецер гнаў.

Адзін скацінку выганяе,
Другі адзежыну імчыць,
А маці дзетак сабірае,
Бо хатка іх ужо гарыць.

Гарэлі гумны, хлевы, хаты,
Увесь дабытак гінуў так,
Што той, хто клаўся спаць багаты,
Сягоння стаў зусім жабрак...

І ўчора гдзе былі будынкі,
Тырчаць там печы, каміны,
І асталіся на ўспамінкі
Капцы гарэлікаў адны.

А людзі горка, горка плачуць,
І скаргі йдуць з усіх старон,
І па-над вёскай нудна крачуць
Стады збудзіўшыхся варон...

## ПРА ПАНОЎ

...Апавядаў ён не раз дзіва
Часам смешна, часам шчасліва,
Шмат чаго помніў, многа знаў
І вельмі не любіў паноў.
Бывала, так стары гавора:
Дзеткі, яшчэ, мусіць, не скора
Надойдзе гэтакі вось час,
Што блісне сонейка для нас.
Бо хоць яно й цяпер яснее
І у пагоду ёмка грэе
Ды ярка свеціць вось ізноў,
Але тыкеля... для паноў!
А мужык бедны у цямноце,
Карэлы, ў мазалях і ў поце,
Пакоран, баязліў і ціх,
Гаруе век свой на другіх.
Ніхто б таму і не дзівіўся,
Каб жа хоць труд яго цаніўся
І уважаўся хоць крыху,
Не было б, можа, і граху.
Але не мае шмат павагі
Наш брат ад шэрае сярмягі.
Крыўдзяць і кпяць з яго усе,
А ён усё гэта знясе.
На мужыка прыскеліць вока
І пазірае ізвысока
Духоўнік, пан, чыноўнік, жыд,
Хоць з яго працы будзе сыт.
Наслухацца можна і скора,

Што яно пра цябе гавора —
Пані або панок другі,
Не варт мужыцкае нагі.
Не раз яно цябе намуча,
І за гарэлую анучу
Цябе не лічыць яшчэ ён,—
А ты цярпі, будзеш спасён!
Няхай жа нашаму мужчыне
Быць трапіцца ў паноў ў гасціне,
Ну, дык магу смела сказаць,
Што будзе после праклінаць.
Бо там смяюцца з нашай мовы
Пустыя гэтыя галовы.
Выкпяць яны цябе капой,
Бо ў іх парадак ідзе свой.
Нярэдка там вось пачуць можна
Такое званне: «Bydło dwonożne»,
«Labity cham» і «Ciesny łob»,
Ці то зноў: «Chłopka» або «Chłop».
І знойдуць на цябе прычыну:
То за адзежку, то за міну,
Не гэтак стаў, то не там сеў,
То зашмат піў, замнога еў.
І як бы там ты ні стараўся
Ды драбней маку рассыпаўся
Ці быў, нібы трава, ціхі —
Не ўгодзіш пэўне ні крыхі.
І ў кожнай справе, ў кожным дзеле,
Ці то ў хароме, ці ў касцеле,
Гдзе толькі можа шляхціц, там
Ўтыкае спрытна слова «хам».
А не адна краля такая,
Што пад цыцкой кудзелю мае,
Намазаўшы парадна твар,

У рэчы дарагі тавар,
І зубы чужыя у роце,
Дзмецца, як жаба на балоце,
Або як вош так акурат,—
Аббрэша з галавы да пят...

# ВОСЕНЬ

Вось пасле бурнай жніўнай пары
Верасень хмурны, як дзед стары,
З торбаю поўнай да нас ідзець.
Малыя пеўні ўжо сталі пець.
Замільгацелі, як не былі,
І адляцелі ў вырай буслы.
Гусі ў грамадах цягнуць з двароў
Шнурам і ў стадах да выганоў.
А як кастрычнік спадзе на нос,
Бывае зранку ужо мароз.
Зямліца-маці, будзь ёй хвала,
Сваё багацце ёй аддала.
Ўжо гола поле, зняты пасеў,
Не звоніць болей вясёлы спеў.
Пташкі замоўклі, і гай заглох,
Лісце пажоўкла па дзераўцох.
Як бы спадманкам лета ўцякло.
Неба туманам завалакло,
Як цераз сіта, сыпле рунец —
Вясна забыта, лету канец.
Дзянькі пагодны прайшлі усе,
Вецер халодны лісце нясе,
Трусіць, зрывае, гоніць удаль
Ды завывае — наводзіць жаль.
Пяразвінелі косы, сярпы,
А загудзелі ў гумнах цапы,
Падаюць слаўна, аж звініць ток.
Зробяць нам спраўна новы хлябок!

## ПІРОГ

Раз так неяк на кірмашы
Восенню, мой братка,
Дзве сышліся бабы нашы —
Дачушка і матка.

Матка зараз усё знаці
Хоча як быць мае...
Ну, вядома, так як маці —
У дачкі пытае.

«А мая ж ты,— кажа,— кветка,
Як табе жывецца?
Ці не надта з мужам кепска?
Мо часамі б'ецца?»

«А матуля ж мая родна,
Лепш бы я сядзела —
Так мне замужам нягодна,
Так мне надаела...

Мой мужык, табе прызнацца,
Сыты ці галодны,
Ўсё яго трэба баяцца,
Гэткі ўжо нягодны!

А няхай сам Бог бароне!
Кажу без абману:
Я спякла яму сягоння
Піражок румяны,

Мяккі, жоўты, як той кажа,
Спечаны дарэчы.
А ён, гад, як ім засмажа
Проста мне у плечы!..

А няхай яго нячысты
Да сну ускалыша! —
Я ўжо думала, ўсе чыста
Косці мне пакрыша!..»

## КАМУ ШТО

Вясна хароша для паэта,
Ці, як там кажуць,— песняра.
Для хлебароба будзе гэта
Несамавітая пара.

Часамі хлеба ні крупінкі,
Ані ўламаць, ані уліць,
А тут яшчэ і для скацінкі,
Бывае, трэба прыкупіць.

Хаця красуюць кветкі густа,
Пяе пяўцоў крылаты хор,
Але... сумна, калі ў клеці пуста
Ды у гумне свісціць віхор!

Бо салаўя не кормяць песні,
Як ёсць прымоўка гэтка, знай,
І думай ты сабе, хоць трэсні,
Але ўсім есці падавай.

Хоць гэтага не скажа кожын,
Знаць гэта толькі бедаку,
Што як жывот твой, брат, парожан —
Тады і песні па баку.

Вось тут і маеце прычыну,
Ды, як гавораць, і «кручок»,
Што ані бэзу, ні язміну
Ніяк не ўкрышыш у гаршчок!

Наш брат тады зусім спакоен,
І весялосць яго бярэць,
Калі яго равеснік повен —
Тады ж ён можа і запець.

Вясковец мае тады свята
І можа сабе адпачыць,
Як восень паспее багата
Яго пладамі адарыць.

Як ён нажне багата хлеба
Ды пачне бульбачку капаць,
Усё ачысціць як патрэба —
Ніву, гарод і сенажаць.

Тады наш брат свінчо падкорміць,
Наробіць круп, мукі — тады
Усіх памёршых ён прыпомніць,
Жывых пакліча на Дзяды *.

## ДУМКА БЕЖАНЦА

Свеціць месяц, а аблокі
Хмарка засланяе,
А бежанец адзінокі
Думаньку думáе.

Прыйшла восень, зіма, весна,
Лета уцякае,
А ён позна і учэсна *
Вестачку чакае.

Удзень тошна, ўноч не спіцца,
Як катку ля плота.
Адзін жджэ, нібы зямліца
Дожджыка ў спякоту.

Стане Богу ён маліцца
Вольнаю часінай —
Пачынае з вачэй ліцца
Сляза за слязінай.

У змаганні траціць сілы,
Ападаюць рукі.
Калі ж будзе, Божа мілы,
Ўжо канец разлукі?!

Мо ўзышоўшы ясна сонца
З роднае старонкі,
Прымчыць вестку пад ваконца
Ад дзетак і жонкі?

А не знаў ён, мусіць, гэта,
Не думаў ніколі,
Што цяпер яго кабета
У цяжкай няволі.

Што ў сялібе засталіся
Толькі пустка, смецце,
Яго ж дзеткі распаўзліся
Ўсе па белым свеце.

## ЖАЛЬ

Неяк нядаўна адной нядзелі,
Маючы часу вольнага шмат,
Быў я з другімі разам ў касцеле,
Гдзе памаліцца часамі рад,

Скрушаным сэрцам, як бы з налогу *,
Ўздыхнуць да неба як мае быць,
Гора, цярпенне занесці Богу
І сваё сэрца прад ім адкрыць.

Я разглядацца стаў па святыне,
Як бы нарокам, так, пакрысе.
Бачу, што й людзі па той прычыне
Хіба што гэтак моляцца ўсе.

Аж разам песня там загрымела
Па ўсім касцеле ў суладны тон
І рэха ў неба там паляцела,
Спеў і музыка ў кампаніён.

Ўваччу слязінка мне заблішчэла,
Ў сэрца надзея ўступіла зноў,
І я паволі, як бы нясмела,
Стаў усміхацца зараз да слоў.

Знаная нота, знаны і словы,
І яе знае, пэўне, усяк.
Быў гэта польскі гімн нарадовы:
«Boźe, coś polskę...» і далей так.

Слухаў я, слухаў ды стаў маркотны,
Далей падумаў: Божа ты наш!
Чаму ж на нашай зямлі народнай
Аднаго сонца хоць бы — нямаш?!

І жаль зрабіўся мне непамерны
Ды стала горка, як і падчас.
Ці ж гэта, Божа наш міласэрны,
І ты забыўся ўжо пра нас?

Ці ж мы таксама не твае дзеці,
Ці ж не сыны мы гэтай зямлі,
І ці не шлём мы штодня Вашэці
Свой пот крывавы і мазалі?

Ці ж Це не молім кожну нядзельку
І кожна свята суполам тут?
Выбаў жа, Божа, нашу зямельку
Із-пад няволі — выбаў із пут!

## БОЯЗНА

У цяжкім змаганні з цёмнаю сілай,
Гдзе шмат мазольнай работы,
Добрыя людзі вестачкай мілай
Нам паддавалі ахвоты.

І часам слоўца адно, другое,
Сказана добра у пору,
Падніме духа, адгоніць злое
І як бы зверне з плеч гору.

Але і з верай, моцнай і правай,
Ніхто прапасці не можа,
І нашай чыстай і пэўнай справе
Сам Бог напэўна паможа.

Адна рэч толькі у гэтай рабоце
Варта дапраўды увагі,
Каб нам пры нашай добрай ахвоце
Ды не забракла адвагі.

Каб, як раслінка ў зелені дзікай,
Мы так без сонца не счэзлі
Ды гэтак з думкі надта вялікай
Хаця б на печ не палезлі.

## З НОВЫМ ГОДАМ

З Новым годам, родны браце,
Няшчасны ваяча!
Па табе не раз мо ў хаце
Там сямейка плача.

Выглядаюць дзеці, жонка
У час непагоды,
Ці не стукне у ваконца
Іх татулька родны.

Або маці, як галубка,
Праглядае вочы,
Ці павернецца Якубка.
Той сынок урочы *.

Вы, што біліся з варогам
І клалі галовы,
Варачайцеся жа з Богам
У гэты год Новы.

З Новым годам, браце мілы,
Хлебаробе з вёскі,
Няхай Бог прыспорыць сілы
І здароўя трошкі.

Няхай спорыцца вашэці
Па мазольным трудзе
У хляве, гумне і клеці,
У гаршку, ў арудзе.

Гараваў ты восень, лета,
Выліў многа поту,—
Спажывай здароў жа гэта
І не знай клапоту.

З Новым годам, браце стрэчны,
Што сядзіш ў палацы,
Ты, што сыты і бяспечны
І з чужой жыў працы.

Еў ты смачна, не на жарты,
Ды ў віне купаўся,
Гуляў ёмка, граў у карты
І ў пуху качаўся.

Скінь атласы і ядвабы,
Шубу з сабалямі
І забудзь, што быў ты «грабя» *,—
Параўнайся з намі!

Пакінь пыху, пане-браце,
Бо яе не трэба,—
Будзем разам працаваці
На кавалак хлеба!

## АПОШНЯЕ ЖАДАННЕ

Век цэлы біўся я, трапятаўся,
Бо гэтак, мусіць, судзіў мне Бог...
І тады толькі я ўжо здаўся,
Калі мяне немач зваліла з ног.

Ляжу ў пасцелі я адзінокі...
Пакой вялікі, быццам стадол,
А мае думкі блудзяць далёка,
Хоць дакучае пракляты боль.

Цісне і ломіць старыя косці,
Ды сэрца ные цяжэнька тут.
І як бы шэпча на вуха хтосьці,
Што ўжо прыходзіць скора капут.

Ноч доўга... Сумна, о мой ты Божа!
Ў маім хароме мёртвая ціш.
А гэтай цішы не патрывожа
Ні звонам муха, ні бегам мыш...

Ляжу і ныю адзін — бяздольны,
Чужыя людзі, чужы куток.
Пара ўжо скончыць свой труд мазольны,
Шкада мне толькі жонкі, дзяток.

Адно, прызнацца, хацеў бы штосьці
(Такія думкі ў мяне былі),
Каб после смерці ды свае косці
У беларускай злажыць зямлі.

Дык пахавайце гдзе на кургане
Паміж зялёнай кучкі дзярэў,
Гдзе разлягацца будзе ў тумане
Наш беларускі тужлівы спеў.

Толькі пастаўце крыжык дубовы
Мне на магілцы, прашу я вас,
А на крыжы напішыце словы:
«Тут пахаваны Стары Улас».



# Вершаванні апавяданні



## ГОД БЕЛАРУСА

Край беларускі, край ты наш родны,
Неураджайны ты і бязводны,
Нечарназёмна твая зямліца:
Глей, або гліна, ці камяніца.
Дробны загоны і скібы тонкі,
А замест межаў дык баразёнкі,
Доўгія ніўкі і надты вузкі,
Як быццам мотуз ад добрай стужкі...
Кажуць старыя, калі даць веры,
Што былі пушчы, лясы без меры,
Пчол надта многа, мёду — як гліны,
Птаства без ліку, процьма звярыны,
Дзікоў, мядзведзяў, гусяў і лосяў...
Цяпер жа нешта усё звялося...
Народ наш ціхі, прытом нясмелы —
Яго згубілі часты раздзелы.
Акром бядоты у беларуса
Добрае сэрца, хоць часам куса,
Вось, як той кажа, і з ім бывае,
Ён дае раду, не наракае.
Калі сашле Бог гадкі цяжкія,
То вельмі мокры або сухія,
Або паводка знясе, папсу́е,
Альбо нарэшце град адпітлюе,
Альбо зладзеі абчысцяць скрынкі,
Або пажарам змяце будынкі,
Аставіць курсні і папялішчы,
Або уб'ецца злая вяснішча...
Тады бываеш рад і мякіне,
Як няма есці сабе й скаціне,

То ён прыкупіць, то прыпазычыць,
Цяпла чакае, нядзелькі лічыць.
А як Бог вышле лягчэйшу пору,
Як пойдзе проста сонейка ўгору
Ды снег растане, дык ужо скора
Папрылятае вырай з-за мора,
Як цёплы ветрык знізу павее,
Нашаму брату шмат палягчэе.
Як скрозь абсохне, спадуць і рэчкі,
Пойдуць у поле цёлкі, авечкі,
Пастушкі сядуць там за палянкай.
Надойдзе хмарка з громам, з маланкай,
Казаў бы, дзеці будуць баяцца,
Яны ж са смеху стануць куляцца.
Дожджык пакропіць, сонца прыгрэе,
Цвяце вярбіна, рунь зелянее,
Сыпнула ўсюды ж з зямлі травіца,
Зямля абсохла, блішчыць расіца.
Вось жаварынка пяе дарэчы,
Стары дзядуля вылез з-за печы
І сеў на сонцы зубы пагрэці.
А там кацелку качаюць дзеці,
За сметнік пеўні дзяруцца ёмка,
Шпачок і дроздзік шчабечуць громка;
А там, на дубе, буслы клякочуць,
Гагаюць гускі, куркі сакочуць,
Бляюць авечкі, бычкі бадуцца,
Пастух іграе на новай дудцы;
А там, у стадзе, волік бузуе,
Зязюля ў белым садзе кукуе.
Там салавейка, там і жаўтушка,
Гудзіць і пчолка, звініць і мушка,
Ідуць мурашкі, як сонца ўбачаць,
Лятуць матылькі, і жабкі скачуць.

Гай, што быў цёмны, зазеляніўся,
Сад, што быў голы, ужо распусціўся,
Зацвіла яблынь, сліва і груша,
Зацвіла вішня і какалуша *.
Ёсць многа красак у лузе, ў дуброве.
Травы даволі ў полі карове,
Пойдзе скаціна ў «табар» рагата.
Паедуць з коньмі хлопцы, дзяўчаты:
Юрка, Тамашка, Міхаська, Янка,
Сымон, Нікіпар, Змітрок, Раманка,
Андрэй і Юзя, Астап з Қандратам;
Як сабяруцца ды перад святам
Або ў суботу перад нядзелькай,
Валы прыгоняць Наста з Марселькай,
Тэкля з Даротай, прыйдзе Раіна,
Доіць карову і Қацярына.
Уперад скацінку сваю агледзяць,
Дояць кароўкі, малачко цэдзяць,
Збанкі абвяжуць, у куст схаваюць,
Ды ўсе пойдуць дроў назбіраюць,
Ды як наложаць агонь вялікі!..
А з сваіх хлопцаў ёсць два музыкі:
Адзін па струнах смыкам пілуе,
Другі ў цымбалы ёмка пітлюе.
Нашым дзяўчатам многа пацехі,
Пачнуцца жарты, пачнуцца смехі,
Пачнуць усе гуртам песенькі пеці,
Скачуць, гуляюць, крычаць, як дзеці.
Паднімуць гоман малойцы нашы,
Як жыды тыя, што на кірма́шы,
Круцяць галовы з апошняй мочы
І так дурэюць да позняй ночы
Цёплай вясною так, як бы летам,
А спаць кладуцца дык ужо светам.

Павесялела мужыча доля,
Сыпнуў рабочы народ на поле,
Працуюць людзі, поту не чуюць.
Аруць і сеюць і барануюць
Аўсы, пшаніцы, хоць яравыя,
А хто гароху гонцы, другія,
То стрэхі правяць, платы гародзяць,
Ячмені сеюць, гнаі вывозяць
І садзяць спешку або хунтоўку,
Хто дарагону, хто асаноўку *,
Урэшце на полі грэчкі і лёну,
У гародзе рэпы і шабальбону *,
Буракоў, морквы, цыбулі, маку,
Бобу, капусты і пастарнаку.
І кожан весел, лёгак, як пташка,
Хоць ён працуе так, як мурашка.
Не углянецца, як час пяройдзе,
Вясна ўцякае, лета надойдзе.
Тагды гарачы ўжо час настане,
Наступіць жніва і сенаванне,
Тагды ўжо годзе сядзець у хаце,
Бо трэба брацца за сенажаці.
Бліснуць на сонцы сярпы і косы,
Звіняць мянтушкі, растуць пракосы.
Хоць залівае з працы пот вочы,
Кожан вясёлы, кожан ахвочы,
Касой махае, аж яна свішча,
Хоць бы у пояс расла травішча.
Нарэжуць траваў і капюшыны,
Хоць часам цягне пупа да спіны.
Другому, праўда, некалі гладзіць,
Каса не ўдасца або не ўладзіць.
А дзеўкі, бабы ім памагаюць:
То вернуць сена, то разбіваюць,

Пасля пластуюць і заграбаюць
І на астатку ў копы складаюць;
Урэшце, якая служыць дарога,
Возяць у гумны або да стога.
А сена пахне ад розных траваў
Лепш ад усякіх панскіх прыправаў,
І як жа добра, зняўшы адзенне,
Заснуць па працы на свежым сене!
Яшчэ сенаванне не надаела,
Глядзь, аж тут жыта ўжо падаспела.
Не час драмаці ні агіляцца,
Але за жніва трэба ўжо брацца.
Дык і бяруцца нашы кабеты:
Тэклі, Ганулі, Еўкі, Альжбеты!
Жнуць, снапы вяжуць, шапкі ламаюць,
Снапы падносяць, бабкі стаўляюць,
Спяшае баба, спяшыць дзяўчына,
Калом не гнецца і ў іншай спіна!
І цягнуць шнурам так, як салдаты,
Як свет — на поле, з цёмным — дахаты.
А як часамі ў каторай хаце
Ёсць маладзіца, дык мой ты браце,
Ну, дык снапшчыну тады спраўляюць,
А усе жнейкі гулянкі маюць.
Яе ж дык робяць з такой парадай:
Ідуць на поле усей грамадай,
Стануць на ніве укругавую
І выжнуць постаць адну, другую,
Снапоў наносяць, браўшы ў ахапку,
Дык як паставяць першую бабку,
Пастануць навокал яе, як дзеці,
Ды пачнуць песні ўсе разам пеці,
А маладзіца сувой расшые
Ды цэлым станам бабку накрые.

Пасля пасядуць кругом, як гускі,
Маюць гарэлкі шмат і закускі,
І лье другая, як у кадушку,
Ці манапольку, ці саматужку.
А як падвып'юць бабы і дзеўкі,
Пачнуцца жарты, смехі, прыпеўкі,
Пасля збяруцца усе да кучы
Ды пяюць «жніва», дамоў ідучы:
«Да ўжо сонца за бор зайшло.
Я, малада, дамоў пайшла,
Мне, маладой, не хочацца
Каля печы варочацца...»
Адны з парадку ўсё пачынаюць,
Другія гэтым, бач, адпяваюць
І так суладна — з боку здаецца,
Як быццам поле звініць, трасецца.
Цяжкая праца ўсім не да дзела,
Аж тут і лета ўжо праляцела.
Жніво ярное — гэта ўжо восень,
І, як той кажа, работак восем.
Ўжо дні пахмурны і карацейшы,
Халодны ночкі і шмат даўжэйшы,
Раніцы мокры або туманны,
Часам марозік выскачыць ранні,
І на начлезе сцюжай не спіцца,
І сам не знаеш, за што хваціцца.
Бо яшчэ сена на сенажаці,
Тут жыта сеяць, снапы ўбіраці,
Араць на зіму і ляны рваці,
Касіць атаву і забіраці,
Лён убіраці ды ўперад сушыці,
Каноплі рваці, пенькі мачыці,
То ляны слаці, то падбіраці,
Дамоў вазіці, а после мяці,

Урэшце і бульбу трэба капаці,
Пасля з гародаў трэба ўбіраці.
Ужо забыўся мужык аб горы,
Бо ў яго поўна ў гумне, ў каморы,
Поўна ў істопцы, поўна у клеці,
Сам не галодны, пад'еўшы дзеці,
Хоць ўстае рана і пры лучынцы,
Але й сабе ёсць, ёсць і скацінцы.
А як надойдзе ужо Пакрова *,
Ужо не наесца ў полі карова,
Тады халодны ветрык павее,
Трава пажоўкне і пачарнее.
Часам, як з коньмі ў полі начуеш,
Пяючых «восень» дзяўчат пачуеш:
«Ой, каліна, маліна, да не стой над вадою,
Не ківай галіною, не раўнуйся са мною...»
...«Чаму не прыйшоў, ані прыехаў,
Як я цябе прасіла?
Ці каня не меў, ці сам не хацеў,
Ці матка не пусціла?..»
І, сказаць праўду, дык, мой ты браце,
Ад гэтай песні за сэрца хваце,
Бо яе тая працяжна нота,
Хоць слёзы гоніць — слухаць ахвота;
Не то жалосна, не то праціўна,
Так неяк лёгка і неяк дзіўна...
Бо ў гэтай ноце як бы, здаецца,
Чалавек плача, то рад, смяецца,
Вясны шкадуе, маладых летак,
Зімы баіцца, старасці гэтак.
Як стане з дрэва ліст абсыпацца,
Птушкі у вырай пачнуць збірацца:

Жураў і бусел, пігаўка, пліска;
А калі гусі — ды лятуць нізка.
Тады гавораць старыя людзі,
Што ужо скора зіма к нам будзе.
Пойдуць ў край цёплы птушак грамады,
Варон і галіц лётаюць стады,
На дварэ стане сцюжа і слота
І па калені гразі ды балота.
Пачне памалу восень канчацца,
Стане паволі зямля сцінацца,
Наступіць холад, птушка не пісне,
Зіма настане, мароз прыцісне,
Ды па калені наваліць снегу.
Даставай сані, хавай цялегу,
Цягні суконкі цёплы з паліцы,
Трэба кажух, апрані рукавіцы.
Трэба ўстаць рана, не агіляцца,
Але ахвоча да цэпа брацца,
Бо тут гультайства не дапаможа,
Малаціць трэба і веяць збожжа,
Зярно да клеці трэба знасіці,
Саломай з сенам быдла карміці.
Хто каля дому корміць каровы,
А хто да лесу едзе па дровы,
А той па сена, хоць дзень кароткі,
Гэны з жыдамі у заработкі,
Хоць там не відна многа выгоды,
А хто дык часам едзе ў калоды,
Калі не мае ў хаце работы.
Так зарабляюць на соль, на боты,
На мерку газы ці на фунт мазі,
Стопчуць многа снегу і гразі.
І нашы бабы такжа ў рабоце:
Прадуць кудзелю на калаўроце

І ў клубкі ніці звіваюць з шпулі,
А после выткуць нам на кашулі.
Не спіць другая і слепіць вочы
Дымнай лучынкай, устаўшы з паночы,
А тут работа ідзе не гладка,
А у калысцы плача дзіцятка:
Ці то урокі, ці злыдні, можа,
Ці хто спалохаў, барані Божа!
За што хваціцца, чым тут ганяці,
Што скажа знахар, трэба спытаці.
Спіць яно мала, а плача болей,
Ці вады з рота, ці зносіць соляй,
Ці паіць макам з гарачым млекам,
Курыць бы хіба ды лавандрэкам? *
Знахар парадзіў (як жа ж не верыць),
Што яму трэба прычча памераць.
І цягнуць так, каб не ведаў ён конца,
Праз тры парогі, да ўсходу сонца.
Дык у клапоце бедна кабета:
Робіць і тое, робіць і гэта,
І ёй трудоў то больш, як мужчыне,
Ні з'есць парою, ні адпачыне...
Гэтак гаруе не адна хіба
Матка і б'ецца, як аб лёд рыба.
Трудна і горка не раз мужчыне,
Але не лепей ёсць і жанчыне...
Мусіць, ад Бога гэтак патрэба
Гараваць цяжка на кусок хлеба!

# КУРГАН

Ой вы, цяністы бары і пушчы!
Гдзе вашы будуць цемні і гушчы?
Гдзе тыя хвоі, гдзе елі тыя,
Ліпы, бярозы, дубы гладкія,
У тры абдымкі, роўны, без сýка,
Борці з пчалыма ля штукі штука,
Паміж каторых зубры баліся,
А на макоўках арлы вяліся?
Гдзе той здаровы прастор свабоды,
Прадзедаў нашых думкі, прыгоды?
Толькі ўспамінкі, падобны казцы,
У песні хіба сустрэць удасца...
Цяпер у пушчы як часам будзеш,
Можаш быць пэўным, што не заблудзіш,
Бо неяк стала многа палянак,
Многа абрэзкаў і шмат дзялянак,
І пнёў убачыш чорных даволі,
Як стады галіц увосень на полі.
У пушчы гэтай, сказаць вашэці,
Мінскай губерні, у Мінскім павеце,
Ёсць месца. Помню, як стаў на ногі,
Званне Вусцянскай носіць дарогі.
Гэта палянка хоць невяліка,
Па краях верас, сплёўшыся дзіка,
Сцелецца, пнецца на ўсе староны.
Сярод палянкі — курган зялёны.
Кругом, як згледзець, быў лес не тонак,
А на кургане між дзвюх сасонак
Расла бярозка кудрава, бела.
Яна такія ўспамінкі мела:

Што колісь даўна, як ў цвеце рожа,
У адной вёсцы вельмі прыгожа
Была дзяўчына, спрытна і дужа,
Гладка, румяна, лёгка, дасужа.
Усім яна вельмі была дасмаку,
Бо, сказаць праўду, не мела браку.
І усе знаді і гаварылі,
Што два малойцы яе любілі.
Адзін раз неяк цёплай вясною,
Згаварыўшыся яны з сабою,
Ці, можа, ўлетку, як дзень вялікі,
Пайшлі у пушчу ўтраіх па лыкі.
Дзень быў харошы, дык удалося
Усім надзерці многа палосся.
Нясуць дахаты, сабраўшы ў клумкі.
А яе ўзялі такія думкі:
Дома пярсцёнак, хустай пакрыты,
У лесе — ножык, у пень убіты.
А як забралі ўжо паўдарогі:
«Балець мне,— кажа,— пачалі ногі
Ды неяк крэпка кальнула ў плечы.
Я тут прысяду, буду сядзеці,
А вы ідзіце,— хлопцам гавора,—
Адзін да хаты: там у каморы
Знойдзеш пярсцёнак, пакрыты хустай;
Другі — да лесу: пад елкай густай,
Пры самай сцежцы, дзе я хадзіла,
На пні дубовым ножык ўстраміла.
Вось да змяркання часу ўжо мала,
Каб я доўга гэтта не ждала,
Дык і спяшайце і не драміце,
Нож з тым пярцёнкам мне прынясіце.
А з вас каторы ўперад прыбудзе,
Той ужо мужам маім і будзе».

Скочылі хлопцы нашы ахвоча,
Кожны уперад справіцца хоча.
Пруць цераз сілу праз цемні і гушчы
Адзін — да хаты, другі — да пушчы.
Мала к змярканню што асталося,
Але ёй доўга ждаць не прыйшлося,
Бо яшчэ зоркі не заблішчэлі,
Як ужо хлопцы назад ляцелі,
Пёрлі без духу апошняй сілай,
Кожны уперад хацеў да мілай.
Разам дабегшы, прад ёю палі
І тутка на месцы разам сканалі.
Учуўшы прыгоду, людзі сышліся
І зараз ра́дзіць там узяліся.
Радзілі доўга і гаманілі
І тут на месцы ўсё рассудзілі:
Каб пахаваці ў зямлю сырую
Тую дзяўчыну жыўцом, жывую,
З хлопцамі тымі, што пагубіла,
Каб яна гэтак больш не рабіла.
У чысту адзежу хлопцы прыбраны.
Дзеўка — у стужкі, вянок руцьвяны,
Руса касіца на усе плечы.
Як бы да шлюбу прыбрана ўрэчы:
Бела апратка, белы спаднічкі,
Белы панчошкі і чаравічкі.
Хоць ліла слёзы, цяжка ўздыхала,
Што ў красе, ў цвеце свет пакідала,
Як асудзілі, так і зрабілі:
Яе між хлопцаў тых палажылі
Ў адну магілу і пахавалі,
Курган парадны там накапалі.
І пайшлі ўсюды гэты ўспамінкі:
Выраслі з хлопцаў тых дзве хваінкі,

З дзеўкі — бярозка, спусціўшы коскі.
Ой, шкода, шкода белай бярозкі!
І доўга хвойкі тыя стаялі,
Тую бярозку галлём абымалі,
Як бы закрыўшы у час пануры
Ад слоты, сцюжы, грымоты-буры.
Разам стаялі, раслі, шумелі
І гэту песню з вятрамі пелі.
Ліхая доля стрэла палянку:
Цяпер папала яна ў дзялянку.
Сцялі бярозку і хвойкі тыя.
Дык асталіся тры пні таўстыя
На тым кургане, пры той дарозе,
Ды успамінкі хвоек, бярозы!

## КУМАВЫ МАГІЛЫ

Ў нашым краі, недалёка, ў Беларусі мілай
Ёсць мясцовасць адзінока — Кумавы Магілы.
Поле і камення кучы, верас пакруціўся,
А калісь праз бор дрымучы там гасцінец віўся.
Таго бору цяпер годзе, няма і галінкі,
Толькі ходзяць у народзе такія ўспамінкі:
Што калісьці, мой ты братка, зімняю парою
Ад хрысту вязлі дзіцятка неяк кум з кумою,
Ды спазніліся на ліха пасле надвячорку
І ў лесе грэшну сціха завялі гаворку.
Кум дурэці пачынае, кума слухаць рада,
Аж на іх тут нападае ваўкоў цэла стада.
Кум спалохаўся да смерці, ды ўжо жартаў досыць!
Пугай стаў каня ён дзерці, конь пачаў уносіць.
А ваўкі не астаюцца, але даганяюць,
Зубы скаляць, разяюцца, за сані хватаюць.
Кума ў голас: «Мусіць, згінем, прападзём, нябожа!
Хіба ваўкам дзіця кінем, самі ўцячом, можа?»
І, не думаўшы, шпурнула ў мяккі снег дзіцятка,
Ды ваўкоў не абманула хрышчоная матка,
Бо яны ўсе неяк сціха ды страшна завылі,
А тут санкі, як на ліха, да зямлі прыстылі.
Конь хоць стаў, але ад пугі даў ў хамут
парадна,
Дык тут выкрутні з натугі лопнулі абадва.
Конь віхром тады памчаўся, рваў із сіл астатка,
А там кум з кумой астаўся, санкі і дзіцятка...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Заржаў конік ля парога, прыляцеўшы ў мыле,
Тут паднялі ўсе трывогу і загаманілі.
Рынулі ўсе да астатка, кінуўшы бяседу,
Знайшлі санкі і дзіцятка, а кумоў — ні следу!
Толькі снег стаптаны дужа, у тое месца йдучы,
Ды крыві стаяла лужа і касцей дзве кучы.
Іх у лесе там схавалі, дзе быў дуб пахілы,
После месца то празвалі Кумавы Магілы.
І з тых пор на гэтым месцы, гаварылі людзі,
Нешта ўночы падарожным часта коні пудзе:
То ў канаву цябе згоніць, лопне гуж, атосы,
Парве вупраж і паломіць сані і калёсы.
І баяцца людзі сталі гэтых месц да смерці,
Завяліся там, казалі, хіба толькі чэрці.

Раз зімою — не забыўся — едуць людзі нашы,
Дай і я, але запіўся неяк на кірмашы.
(Не тайно ж гэта нікому: то з бяды, то з гора.)
А як кажуць, то п'яному па калені мора.
Месяц свеціць, хмаркі мчацца, сам я прыпяваю,
Зоркі свецяць ды іскрацца, еду ані дбаю.
Параўняўся з тым курганам я, здаецца, шпарка,
Аж тут месяц, як туманам, засланіла хмарка.
Стала цёмна неяк зразу; я патрос ляйцыма,
Бо мой конь — знай ты заразу! — стаў стрыгчы вушыма.
Ды убок, забыўшы пужку, як лінуў хто варам,
Я у снег, як у падушку, уваліўся тварам.
І з канавы пакуль вылез, як мядзведзь з мярлогу *,
Дык тут яснасць асвяціла прада мной дарогу.
Зірк — аж сані на дарозе; думаў: мае гэта,
Гляджу — не: сядзяць на возе з мужчынам кабета.

А кругом іх аступіўшы, як абручам душаць,
Ваўкоў стада,— палічыўшы, з сарачню іх,
мусіць.
Ўсе хібы́ панадуваўшы, і хвасты, як трубы,
Языкі павыстаўляўшы, страшна скаляць зубы.

Валасы мне падняліся, хмель адразу згінуў,
Рукі, ногі затрасліся, чуць ізноў не рынуў.
У вушах звінела нешта, перасохла горла,
Перайшоў мароз па плечах, і у грудзях спёрла.
Ногі з месца не парушу і рукой не цісну,
Стаяць трудна, але трэба, і слаўца не пісну.
Стаю гэтак я і ныю, так, як у магіле,
Аж ка мне вось людзі тыя так загаварылі:
«Чалавеча! Помніць будзеш добра месца гэта!
Знай жа тое, што мы людзі не з гэтага свету.
Тры вякі над вашым светам ужо праляцелі,
Як калісь мы ў месцы гэтым саграшыць хацелі.
А за тое тут час доўгі кару адбывалі:
Людзей зводзілі з дарогі і коні пужалі.
Тры вякі на месцы гэтым былі як прыкуты,
Трыста год прайшло нарэшце і — канец пакуты!
Чалавеча! Едзь дахаты і скажы тым людзям,
Што з сягонняшняе даты страшыць вас не
будзем.
Тут уночы ці ў дзень белы свабодна дарога.
Едзьце цэлы і здаровы, мы ідзем да Бога!»
Ўсё, пакуль змігнуці вокам, знікла і прапала:
Ні людзей тых, ані воўкаў, ні санак не стала.
Запеў певень дзесьці, чутна, зніклі хутка хмары,
Бледны месяц неяк смутна выплыў із-за хмары.
А ў мяне перад вачыма стаяў, азіраўся
Конь мой, бо у куст ляйцыма неяк ублытаўся.
Працёр вочы я, паслухаў ды перахрысціўся,

Сеў на воз і добрым трухам дахаты пусціўся.
Дома нашы трэслі бабы вушмі, быццам козы,
Што прыехаў я з кірма́ша дадому цвярозы.

У тым жа месцы больш ніколі ці хто йдзе,
ці едзе,
Аніякіх страхаў болей нідзе не угледзе.

# ЛЕГЕНДА І ПРАЎДА

## І

Жыў сабе дзяцюк Яська на свеце калісьці
І здумаў жаніцца для сваёй карысці.
І так, доўга не чакаўшы, ён адной нядзелькі
Сабраўся і паехаў да сваёй Анелькі.
Там яны, змеркаваўшы ўвесь свой стан сіроцкі,
Заручыны зрабілі на манер шляхоцкі
І, паводле ўставы і свайго сумлення,
Занеслі і два злоты на агалашэнне.
І Ясь у трэццю нядзельку, апрануўшы шубу,
Узяў сваю Анельку і павёз да шлюбу.
Ехаць, ды ў парадзе, дык было прыемна,
Але што ж, калі шлюбу не даюць дарэмна?
Духоўнік таўстапузы, як аконам панскі
(Відно, не знаў ён посту, мусіць, лютэранскі),
Пазваўшы маладога у сваю камору
І доўга не чакаўшы, так ён гавора:
«Слухай жа, Ясь міленькі, мой каханы сыну,
Ты гэтаку падобну бярэш дзяўчыну
І хочаш, каб парадна цябе павянчалі,
Дык дзесяць рублёў мусіш зараз даці
Ды, апроч тога, яшчэ з дружбы вясельнай
Трэба яшчэ што-кольвек для службы касцельнай».
Даць то было б не штука, гэта кожны знае,
Але штука ў гэтым, што не кожны мае.
І трэба яшчэ ведаць, што у пору гэну
Чырвоная паперка мела добру цэну.
Малады наш зжахнуўся, аж вышыблі поты,
Кажа: «Войчанька мілы, будзе дзесяць злоты».

А «войчанька» гаворыць: «За такія пянёнжкі
Магу табе шлюб даць, але з старое ксёнжкі.
Дык падумай жа сам ты і зваж належыце:
Якое ж тады ваша будзе усё жыцце?»
Падумаўшы, наш Яська так сабе гавора:
«Праз дзесяць рублёў на цэлы век гора?
За марных рублёў дзесяць цэлы век абрыда?»
Папёр як бачыш грошы пазычаць у жыда.
І хоць после Дыемны дзёр працэнт здаровы,
Але Яська затое браў шлюб з «ксёнжкі новай».

## II

Што вайна нарабіла ўсюды шкод нямала
І што яна на свеце людзей папсавала,
Што праз вайну ўсюды дарагоўля будзе —
Дык аб гэтым не трэба капацца ў талмудзе.
Да чаго ні даткніся, дык без перабору
Ад мала і да вяліка ўсё пайшло ўгору:
Уздаражалі тавары, работы ў час гэны,
Але і на малітвы падняліся цэны.

У адным месцы зацішным і пэўным нібы
Знаў я гэны закутак і тыя сялібы,
Гдзе трэццім прыказаннем назбыт вельмі
грэшаць
І адзін на другога, як сабакі, брэшуць.
Народ там, як і ўсюды, на чужое ласы.
Пры чужых людзях добрых, ад радні далёка,
Жыла адна бабулька сабе адзінока.
Сёмы крыжык канчала, помніла «паўстанне»,
І закончыла жыццё у дзявочым стане.
Памерла, дык і годзе, так штодзень бывае:
Адзін родзіцца на свет, другі памірае,

Прыходзяць і адыходзяць, як вада руч'ямі,
Змяняюцца народы, але свет той самы.
Знайшоўся і пляменнік — прыпёр без аглядкі,
Так урэчы з жалю, на дзеле — па спадкі *.
Але уперад трэба узяцца да дзела,
Трэба месца ачысціць, каб не смярдзела.
Дык з двара далі дошчак і пару мужчынаў,
Тыя выкапалі яму, збілі дамавіну,
Запраглі, як да звозкі гнілога тавару,
У голую цялегу недабойкаў пару,
Крыху старое саломы ўзяўшы на пасланне,
І павезлі бабульку на вечнае спанне.
Не было там спевакоў, ні з духоўных чыну,
Толькі крыж, са тры бабы і са два мужчыны.
Пляменнік жа наперад папёр як меў сілу,
Хацеў, каб духоўнік пасвенціў магілу.
А там не поп, не пастыр быў евенгеліцкі,
Але так, як патрэба — ды ксёндз каталіцкі.
Праўда, што не сам старшы, але вельмі шпарак.
«Плаці мне,— кажа,— зараз семдзесят пяць
марак!»
А гэны яму кажа: «Калі ж я не маю.
Пасвенці, войча, на возе, я сам пахаваю».
І, завярнуўшы коні ад другіх фурманак,
Падвёз бабу з дамавінаю аж пад самы ганак.
«Войчанька» ўзлаваўся, нібы дастаў шылам,
Хрысціўся вельмі шпарка і махаў крапілам
Так, што кроплі сыпнулі, ажно загудзела
І бадай што дасталі праз дошкі да цела.

## ЦІКАВЫ

З ліку ўсіх святаў у цэлым годзе,
Мусіць, для нашага брата
Адзін Вялікдзень у нашым народзе
Будзе найбольшае свята.
Бо йшчэ прычына будзе такая,
Што яго ждуць ўсей душою,
Бо яно звеку так прыпадае
Заўсёды ранняй вясною.
Будзіцца са сну наша зямліца,
Расце на кусце лісточак
І зелянее тады травіца,
Ажыў жучок, матылёчак.
Шэра зязюля зранку і ўвечар
Яра кукуе у садзе,
Павее ціхі і цёплы вецер,
Пойдзе скаціна у стадзе.
І, акром тога, ў нашым народзе
Ёсць успамінкі такія:
Сеўшы на сонцы ды пры пагодзе,
Часта гавораць старыя,
Штораз да году адна бывае
На цэлым свеце часіна,
Вось, як тыкеля поўнач настане
Прад гэтым святам вялікім,
У памяць Хрыстова з мёртвых устання
Людскім скаціна гаворыць языкам.
Учуўшы гэта мову такую,
Адзін цікавы знайшоўся:
Хацеў падслухаць гутарку тую
Ды ў хлеў на вышкі забраўся.

А яму ждаці прыйшлось не мала,
Бо час паволі цягнуўся,
Аж неяк жудка ўжо яму стала:
Пад шапкай волас уздуўся.
Як толькі поўнач глуха прабіла,
Цішыня стала нямая
І, уздыхнуўшы, загаварыла
Сціха кабылка гнядая:
«Ой, цяжка праца на мае грудзі!
Маю работу не мілу:
Гаспадара бо мне трэба будзе
Везці пазаўтра ў магілу».
Ён, як асінка, увесь затросся,
Хоць быў і смелай натуры,
Зусім без духу ў хату панёсся,
Мароз пачуўшы на скуры.
Прыпёр у хату, паў на кравацi,
А там сямейка ўжо спала.
Застагнаў толькі: «Ой, дзеткі! маці!
Надта ж нядобра мне стала!»
Знахара з вёскі пакуль пазвалі
І варажбітку кабету,
І хоць курылі і шмат шапталі,
Ён скончыў жыццё да свету.
Галосяць дзеткі, галосіць матка,
Плача сямейка, ўздыхае,
Радні, суседзяў прыйшла грамадка —
Труну павезла гнядая.
Доўга аб гэтым усе даволі
Успаміналі, прызнацца,
Але затое ў хлеў слухаць болей
Людзі хадзіці баяцца.

# ІГОЛКА

Даўнымі часы гэтак бывала —
Былі і дзейкі, былінкі.
І вады ў мора ўцякло нямала,
Як гэты ходзяць ўспамінкі.

Што вот калісьці у часы даўны,
На то ёсць доказ нязбіты,
Жыў «се» на свеце — пан вельмі слаўны,
Але затое сярдзіты.

Ў яго, бывала, бедны ці можны —
Широка дзверы наросцяж:
Заязджай путнік ці падарожны,
А ўжо напэўна угосціць.

Але пры першым зараз спатканні
У кожнага — так як быць мае —
Гэтак адразу на пачаканні:
«Ці маеш іголку?» — пытае.

І калі маеш пры сабе голку,
Дастанеш абед, сняданне,
А як не маеш, тады без толку
Дастанеш толькі трапанне.

«Я,— так гаворыць,— пан многіх
літосці,
Як то другому здаецца,
А маю голку, каб зашыць штосьці,
Як толькі дзірка парвецца.

А ты, няшчасна, ліхая галота,
Як жывеш гэта, не знаеш.
Як падзярэцца твая капота,
Дык, чым зашыці, не маеш».

І так упудзіў усіх нямала,
І так у знакі ўсім даўся,
Што й за парог другі, бывала,
Без голкі выйсці баяўся.

Адзін раз неяк, забыўшы чыста,
Бо то ж было даўнавата,
Прыехаў нейкі «ахфіцаліста»
Туды у госці да брата.

А як не ведаў таго звычаю,
Дык не асцерагаўся,
І вот акурат, так як быць мае,
На пана з голкай нарваўся.

Дастаўшы лазню сабе патросе,
Навуку гэта ён мае,
І зарубіўшы гэта на носе,
Да пары толькі чакае.

А пан меў звычай сабе такоўскі,
Што кожны месяц без мала,
Наклаўшы на «се» убор дзядоўскі,
Ішоў ў каплічку, бывала.

І там, як просты дзядок убогі,
Пакорным вельмі рабіўся,
Паводле гэткай сваей налогі
За свае грахі маліўся.

Як той аб гэтым толькі дазнаўся,
Дык і адплату ўжо чуе.
І на дарозе за куст закраўся
Ды там ужо пана пільнуе.

Аж паказаўся дзед не на пуста
У пору дажджліву і золку,
А гэны вылез там із-за куста:
«А маеш,— кажа,— ты голку?»

Дзед туды й сюды пачаў віляці,
Як ў такіх разах бывае.
І калі гэны стаў прыставаці,
Дык пасля кажа: «Не маю».

Дзядок адразу хацеў даць ходу,
Вымкнуцца слізкім уюнам,
А гэны скеміў дзядкову моду
Ды пачаў чысціць бізунам.

Тады дзед гэны, зараз тут маеш,
Успаў на помысел меншы,
Таму гаворыць: «Ці ж ты не знаеш?
Я ж буду пан ваш тутэйшы».

А гэны дзеду зараз наскора:
«Якіх хто, знаю, тут станаў».
Ды ўсё лупе, пасля гавора:
«Знаю я гэтакіх панаў!»

І без усякіх такіх клапотаў
Так неяк ёмка і складна
Ягомасць гэны сабе ў ахвоту
Адтрапаў пана парадна.

А пасля тога зблізка і здалі
Было усякага толку.
Але пакінуў пан, як казалі,
Болей хапацца за голку.

# ПАТРАПІЛА КАСА НА КАМЕНЬ

Знаная рэч на свеце, што калі збяруцца
Двое роўных, заўсёды, як каты, дзяруцца.
Ды калі чорна ў роце альбо прутка ў лапе,
Будзе так, як з касой, што на камень трапе.
Гэтака ёсць прымаўка ў нашым народзе.

Быў сабе поп сярдзіты у адным прыходзе.
Меў жонку маладую, гладкую худобу,
Косы саўсім рудыя і глядзеў з-пад лобу.
А такія прыкметы ўсім знаны вельмі:
Руды, крывы, вугнявы — то напэўна шэльмы.
Вота ж ён так, як баша *, на сваім хвальварку
Жыў раскошна без гора і вёў гаспадарку.
Як кожны з іх брата, меў таку патугу:
Галіў сваіх «авечак» і маліўся Богу.
А ў суседстве за рэчкай, гдзе млынок вясковы,
Шумеў, стоячы здаўна, цёмны бор хваёвы.
У тым баку, гдзе дарогі сходзяцца у вілкі,
Быў узгорак і на ім старыя магілкі.
А што вельмі старыя, можна па тым знаці,
Што растучых там хвояў удвух не абняці.
Бор той, як гаварылі, аддаўна быў дворны.
І як поп быў увесь рыжы, так ляснічы — чорны,
Шпаркі ён быў без меры, гарачы ваяка,
І казалі другія, быццам «аўстрыяка».
Ды, мусіць, была праўда, бо як настаў знова,
Саўсім мовы нашай ён не знаў ні слова.
Вота ж гэны ляснічы здумаў лес рубаці
Каля гэных могілак, а поп — не даваці.
Зрабіўся крык і гоман на увесь бярэзнік:

Ляснічы крычаў «каўтун», поп крычаў «мяцежнік».
Думалі, што з крыку пэўна драка будзе,
Але і пасля крыку было «дзела» ў судзе.
Бо поп, нядоўга ждаўшы, напісаў прашэнне
І за «самаўпраўства» і за «аскарбленне».
Суд як суд: завёў «дзела», паслаў па павестцы,
Што будзе гэту справу разглядаць на месцы,
І як для вінавацтва, так для абароны,
Каб былі ў час на месцы сведкі і староны.
Ляснічы сабраў стражу, узяў «прававеда»,
А поп — дзяка, старасту і старога дзеда
І так іх навучае: «Юрка і Васілі,
Глядзеце ж, каб вы гэтак усе гаварылі,
Што тут яшчэ нядаўна ўсе крыжы стаялі,
Што на гэтых могілках вы бацькоў хавалі,
Што ўрэшце і сягоння ёсць такая мода
Хаваць тут нехрышчоных з усяго прыхода».
Сабраліся ўсе разам на той бугор спорны:
Земскі, сведкі, поп рыжы і ляснічы чорны.
Зноў спрэчкі пачаліся, старыя рахубы *:
Адзін глядзіць з-пад лобу, другі скаліць зубы.
А земскі, пры медалі, ўрэчы на шнурочку,
Пачаў пытацца сведкаў, але ў адзіночку.
Дык правіць адзін гэта, а другі не тое,
Той гаворыць да дзела, іншы што другое.
Як спытаў старога: «Што ты знаеш гэтак?»
«Мы тут,— кажа,— хавалі і бацькоў і дзетак».
«Добра,— земскі гаворыць,— а пакажы ж, мілы,
Гдзе будуць твайго бацькі і маткі магілы?»
А стары, знаць, забыўся, што гаварыць мае,
Паскрабаўшы за вухам, кажа: «Чорт іх знае!»
Ну дык з гэтакіх сведак, як з лазовых лісцяў,
Не меў «бацька» для дзела вялікай карысці.
Бо судзіцца — трэ ведаць і сказаць, не жарты,

Гэта будзе ўсё роўна, што іграць у карты.
Вота ж з гэнага дзіва, як прыйшло да скутку,
Выйграў «бацюшка» гэны на касцеле дудку.
І здалося б, што трэба аб гэтым забыцца,
Але поп наш задумаў, каб на кім памсціцца
І спагнаць сваю злобу на кім нязгледным:
На дворным чалавеку, на лесніку бедным.
Той, сказаць, дурнаваты, для Бога угодну
Прыйшоў да баці споведзь адбываць велікодну.
А папу таго трэба, і каб больш пранюхаць,
Ён сказаў сваёй дзеўцы, каб прыйшла
падслухаць.
І выцягнуў, вужака, з таго панямножку,
Што той, быўшы на судзе, мусіць, прылгаў
трошку.
І як відзіш з даносам узяўся, як за ветку,
Сваю дзеўку у «дзела» пасунуў за сведку.
І пайшла цяганіна, бачыў гэта кожны —
Пракукор, следавацель, после суд акружны.
А на судзе, вядома, зараз адвакаты
Цягнулі з чалавека апошнія шматы.
І па ўсім па гэтым, як кажуць, нарэшце
Бедны ляснік адсядзеў восем дзён урэшце!
А з гэтага карысці не было нікому,
Вось хіба адвакату ды папу рудому.

## ГДЗЕ БЯРОЗЫ РАСАХАТЫ...

### 1

Гдзе бярозы расахаты
І вясною лужы,
Там стаяў двор старой даты,
Багаты і дужы.

І дзяды як талкавалі,
Помняць гэта ўнукі,
Пераходзіў як, казалі,
Ён із рук у рукі.

І, бывала, ў двары гэтым
У дождж ці пагоду,
Ці зімою, ці то летам
Шмат было народу.

Аж раілася на полі
Ад сваіх, нанятых,
І работнікаў даволі
Было прыгнанятых.

Быў вялікі у іх гоман,
Хоць толк малаваты —
Цівун, пісар, і акоман,
І рымар куртаты.

І усе пад песню стару
Жылі, пажывалі,
Бралі пенсію ў ахвяру
І да тога кралі

І зярняткі, і мякіну
Пакрысе, паволі,
І ячмень, і канюшыну
З мяшкамі на полі.

Доўгі час яны там дзесьці
Цягалі, насілі,
Аж пакуль такі нарэшце
Іх не палавілі.

Дык праз гэтую прычыну,
Як людзі казалі,
Акомана, як тычыну,
Із двара прагналі.

Дык цяпер, хай Бог бароніць,
І жальба знайшлася.
Бедны, горкі слёзы роніць,
Але ўжо — па часе!

**2**

Як акомана прагналі,
Дык вялікі быў канфуз,
Бо, як іншыя казалі,
Быў у іх там свой саюз.

После ж — гэтака манера:
З таго ж самага двара
Выправіць магазынера
Наступіла ўжо пара.

Дык яму там адказалі
У адвячорак у адзін
І бухгалтара паслалі,
Каб прыняў ён магазын.

Пісар наш пры гэтым важкі
Закруціў тыкеля нос
І сказаў, каб пляшку бражкі
Ў магазын з сабой прынёс.

І вось гэтак не ў кампаніі
Гэты нашы бабылі
Там удвух на пачаканні
Тую бражку распілі.

Разышліся пасля тога,
Штось пад носам бурчучы,
І бухгалтар як нічога
Ўзяў ад пісара ключы.

Даў іх касіру старому,
Пачакаўшы, як відаць,
І сказаў ён гэтак тому,
Што аброк трэ выдаваць.

Той праз гэтаку прычыну
На дзядзінец шмаргануў
І прыйшоў да магазына,
Ключом дзверы адамкнуў.

А пад то магазынера
Як на ліха прынясло,
Як убачыў ключы ў дзверах,
Дык аж яго затрасло.

Доўга ён сабе не думаў,
Так падсунуўся, як цень,
Памаленьку і без шуму
За ключы ды у кішэнь.

А касір стары у страху,
Што рабіць, і сам не знаў,
І каб часам не даць маху,
За бухгалтарам паслаў.

Той, прыпёршы, хваціў тога
(Відна, нораў меў брыдкі),
Гэны ж зноў не думаў многа —
І сцяліся ўзагрудкі.

Многа шуму нарабілі
Ў магазыне тым яны,
Але іх разбаранілі
Там на шчасце хурманы.

І цяпер адны гамоняць,
Што не пройдзе гэтак тут,
Але хай сам Бог бароніць —
Будзе дзела, будзе суд.

## СВАТЫ

Адзін хлопец зухаваты
Не без дай прычыны
Выбіраўся раз у сваты
Да адной дзяўчыны.
А дзяўчына та багата,
І зусім не мала.
Дык узяў сабе за свата
Добрага брахала.
Прыгаворка ёсць такая,
Што «грэх душу муча».
Дык ён свата падзывае
Ды вось гэтак вуча:
«Помні, кажа, маё слова,
Сваце даўгавязы:
Як скажу я то ці ова * —
Дадавай два разы».
«Добра,— гэны так гамоне
Адважна і смела,—
Ўжо за гэтым ў нас сягоння
Дык не стане дзела.
Толькі ты будзь, мой ты братка,
Адважан і смелкі
І бяры з сабой ў астатку
Чым болей гарэлкі».
Наліваюць самагонам
Цэлую баклашку
І для лепшага рэзону —
Манаполькі пляшку.
Ды не простай манапалькі,
Але гэткай лоўкай,

Што ўжываюць паны толькі —
З белаю галоўкай.
Едуць сабе да засценка
І заходзяць ў хату,
Гдзе знаходзяць і паненку,
І маму, і тату.
Іх там хораша прымалі,
Як сватоў, канечне,
Ўміг абрусам стол заслалі,
Напяклі яечні.
Выпілі і закусілі
Так укругавую
Ды інакш загаманілі
У пару у тую.
Дык наперад стары баця
Міргнуў на Марцэльку
І пытаецца ў зяця:
«Ці маеш зямельку?»
Гэны хлопец небажаты,
Сказаўшы не лішку,
Лжэ урэчы як наняты,
Кажа: «Маю крышку».
А сват зараз зауважа,
Падхапіўшы збоку:
«То ж ты маеш, браце, кажа,
Цэлую валоку!»
«Добра, добра,— стары мове.—
Мой ты, кажа, сынку,
Запытаўшы так па слове,
Ці маеш скацінку?»
Гэны ж зноўку не запнецца,
Урэчы на кпінку,
Але з месца адзавецца:
«Маю і скацінку».

А тут сват ізноў без спрэчак
Пад тое гамоне:
«Тры каровы, шэсць авечак,
Парсюк і хаўронне».
А стары ізноў пытае:
«А скажы, мой братку,
Ці то ж гэта зяць мой мае
Сваю ўласну хатку?»
«Я і хату, кажа, маю
Сваю ці чужую,
У каторай пражываю
Ды і не гарую».
А сват зараз падбягае,
Кажа без абмовы:
«Справа будзе вось якая:
Ты ж маеш дом новы!»
Тыя бачаць, што тут змова.
Дык так, галубочкі!
Зачынаюць тут ізнова,
Але з другой бочкі:
«А ці праўда гэта будзе,
Мой зяціку статны:
Да работы, кажуць людзі,
Вашць так мала здатны?»
«Гэта так, мой цесцю мілы.
Часам да работы
То нямашака і сілы,
Або і ахвоты».
А сват зараз жа пад тое,
Мусіць, з волі неба:
«Ані то, ані другое:
А гультай як трэба!»
«А ці праўда гэта ж знову,
Хоць васпан нам блізкі,

Бо гавораць так па слову,
Што на вочы нізкі?»
«Дзе там праўда! Баюць людзі
І бабы сарокі...
Як прызнацца, праўда будзе:
Крышку касавокі».
А сват зараз падыходзе.
«Досыць, кажа, ныці.
Ты ж сляпы зусім, і годзе.
Няма што круціці».
«А яшчэ адно пытанне
У гэтыя часы:
Быццам вашаць мосці пане
Да гарэлкі ласы?»
«З гэтым справа вось такая:
Не заходжу ў сварку.
Часам, скажам, так бывае,
Што заломіш чарку».
А сват кажа: «Не трэ зліцца.
Кварту ці касушку —
Толькі трэба падзівіцца —
Льеш, як у кадушку».
Дык па гэткім прывітанні,
Урэчы карытам,
Там сваты на пачаканні
Ад'язджалі з квітам.

## ТРЫ ЗЛАДЗЕІ

І цяпер, і бывала ёсць здарэнняў нямала,
Як нямала на свеце народу,
Я йшчэ помню — ці чулі? — як нам правіў дзядуля
Адну дзіўну і смешну прыгоду.
— Дзеткі,— так ён гавора,— ў адным месцы, за морам,
У Няmeччыне, за часаў даўных,
Дзе край мудры, багаты і народ панаваты,
Трох зладзеяў было вельмі слаўных.
Вось адною парою мелі раду з сабою,
Куды кінуцца ім на ўздабычу?
Адзін кажа: «Да вёскі», другі кажа: «Да Moські»,
Старшы кажа: «Да пана, я зычу».
А яму гавораць тыя: «Там сабакі ліхія,
І замкі вельмі крэпкі да тога,
Ды жалезны аковы, мур высокі і новы,
І дварні, як на ліха, там многа».
«Э, няма што баяцца, толькі трэба узяцца,
А ўжо добрыя будзем мець гулі!»
І, падкраўшыся ракам, сыпнуў зелле сабакам,
Тыя зразу як відзіш паснулі.
І, вайшоўшы ад саду, дастаў нейку прыладу
Ды акно з рамкай выняў без мукі,
Сам палез у пакоі, стаў збіраць сёе-тое,
Што папала наскора пад рукі.
Ён там доўга стараўся і да скарбца дабраўся,
Што быў туга, як кіем, набіты,
Ў ім ляжала без конца і рублёў, і чырвонцаў,
На дне пояс із золата літы.
Там яны, да астатка ўсё абчысціўшы гладка,

Усе чыста куточкі і шпаркі *,
Выйшлі, ўсё пазбіралі ды дзяліціся сталі
Між сабою без крыўды, без сваркі.
І ўзялі так класці на тры роўныя часці,
Але пояс быў вельмі прыгодзен:
За яго сталі брацца, пачалі тут спрачацца,
А ўступіць то не хоча ніводзін.
Старшы кажа: «Паждзіце, калатні не рабіце,
Бо дабра з таго пэўне не будзе,
Як нямашака згоды — пойдзем да ваяводы,
Ён нас хіба найлепей рассудзе».
Але ведаць не шкодзе, што таму ваяводзе,
Дзе згарнулі багацця нямала,
З чарады быць суддзёю над таей стараною
Акурат пад той час выпадала.
І суддзя той такую меў налогу брыдкую:
Любіў вельмі ён казкі, бывала,
Зіму, восень і лета трымаў хлопца на гэта,
І той баяў яму што папала.
Спаць — здаровы ці хворы — мусіў ў панскай
каморы,
У кутку пры дзвярах на памосце,
Пан, як толькі прачнецца, на хлапца адазвецца,
Каб ён баяў харошага штосьці.
Вот жа злодзей той старшы, пад вакном ціха стаўшы,
Абыдвом сказаў пільна паслухаць,
Сам палез да пакояў, лёг за хлопца спіною,
Таму зелле пад нос даў панюхаць,
А тады на трывогу нагой грукнуў ў падлогу
Ды захроп на ўсю панску камору.
Пан як відзіш прачнуўся, на хлапца навярнуўся:
«Кажы казку, ты шэльма!» — гавора.
Той, змяніўшы размову, пачаў казку такову:
«За гарамі, далёка на свеце

Было некалісь сталых трох зладзеяў удалых,
Двох малодшых, старэйшы быў трэці.
Яны ў ночку туманну к аднаму прыйшлі пану
(Дазналіся, што грошай меў многа).
Старшы знаў загаворы, дык палез да каморы,
На дварню сну навёўшы цяжкога.
Ён там лазіў і гнуўся, ажно ў скарбцы спынуўся,
Хоць той вельмі дарэчна быў схован,
Там, на самым вяршочку, як і ў нас, мой паночку,
Ляжаў пояс, із золата кован.
Злодзей гэны ўсё з дому падаваў быў другому,
А ўжо трэці адносіў йшчэ далей,
І вось гэткім парадкам, вельмі спраўна і гладка,
Таго пана начыста абкралі.
Па рабоце той смелай, як прыйшло да раздзелу,
Выйшла ў іх калатня немалая:
Раздзяліўшы ўсё гладка, за пояс выйшла звадка,
Яго кожан сабе забірае.
Як здаецца, паночку (ды сыпнуў із мяшочка),
Каму пояс павінен дастацца?»
А пан ціха і скора ужо сонны гавора:
«Во! старшому! — няма што пытацца!»
Як той вылез адтуля: «А што,— кажа,— ці чулі,
Што сказаў нам сам пан ваявода?»
Дык на тым асталося, што каму давялося,
І настала ізноў у іх згода.
Як дачуліся недзе ваяводы-суседзі,
Лезуць ў вочы і роўны, няроўны:
Людзі, к жартам ахвочы, кпяць, смяюцца за вочы,
А найгорай мясцовы духоўны.
Дык таму ваяводзе стала слухаць ўжо годзе:
Ён пусціў пагалоску такую,
Каб старэйшы той злодзей к яму смела прыходзіў,
Бо яму пан ўсё падаруе.

Неяк раз адвячоркам — серадой ці аўторкам,—
Як здаецца, вясенняй парою
Здаравенны мужчына, ростам са тры аршыны
Паявіўся у панскім пакоі.
Пан той зразу спужаўся ды ў таго запытаўся:
«Ты адкуль тут узяўся, як з ямы?
Мо ты пояс мне сплавіў, дый шчэ казку тут
правіў?»
«Гэта я, мой паночку, той самы».
«Вота ж табе, мой братка, выбачаю на гладка,
Можаш нат барыша спадзявацца,
Калі зробіш ты штуку духоўнаму ў навуку,
Каб я мог ды над ім адсмяяцца!»
«Добра! — гэны гавора.— Адсмяешся, і скора,
Абы толькі хватала ахвоты...»
І, пазваўшы дружакаў, злавіў дзве торбы ракаў
Ды забраўся да мудрай работы.
Пайшлі ў поўнач глухую у бажніцу у тую,
Што стаяла на краі ў аддалі,
Усім ракам на плечы наляпілі па свечы,
Запаліўшы іх, поўзаць пускалі.
Ды прыбраўшыся самі ўдвох паслугачамі,
Усё святло запаліўшы на кепства,
Старшы ўздзеў дзеля віду духоўную хламіду,
Пачалі разам правіць малебства.
Сторaж, калі прачнецца, сам не знае, дзе дзецца,
Кінуў вокам праз шчыліну ўсюды
І са страхам, з трывогай пёр да дому дарогай,
Ледзь прамовіў ён: «Дзівы ў нас, цуды!»
Пастар наш працёр вочы: «Што за ліха па ночы?
Звар'яцеў чалавек мо часамі?»
Той склаў рукі на грудзі: «Там анёлы, не людзі,
У бажніцы ў нас моляцца самі!»
Дык і ён прыпёр скора, «Fater Unser» *,— гавора,

На зямліцу упаўшы ніц тварам,
І слязінкі уроне, ажно гэны гамоне
Да яго, што стаяў прад алтарам:
«Браце,— кажа,— мой мілы, з боскай моцы і сілы
Табе ведаць сягоння патрэба
Насамперад вось тое, за жыццё за святое
З душой, з целам ты пойдзеш да неба.
Толькі помні, мой браце, што сваё ўсё багацце
Для убогіх павінна астацца,
Ты ж праз месяц із дому, не сказаўшы нікому,
У дарогу павінен сабрацца».
І, святло пагасіўшы ды ракаў палавіўшы,
Пайшлі, смеючыся, дадому,
А наш пастар, што мае, усё скора збывае
І не кажа нічога нікому.
А тут з ветрам, бы хмарка, праляцеў месяц шпарка
І пара ўжо збірацца ў дарогу,
Ў адну ночку пануру, пад грымоты і буру
Далі знаць у бажніцы трывогу.
А духоўнікаў неба будзіць доўга не трэба:
Ён лічыў сябе госцем удому,
Дык як бачыш прыходзе і таксама знаходзе
Тое ўсё, што было месяц тому.
Яму госць напачатку кажа: «Вота ж, мой братка,
Я ад Бога сягоння прысланы,
Што ведаць патрэба, каб дастацца да неба,
Трэба лезці у мех скураны».
І духоўнік наш бача, як удвох паслухачы
Падстаўляюць вялізны мех — з пуню!
Ён, няпэвен, што будзе, склаўшы рукі на грудзі,
Сваю бедну галоўку ўжо суне.
Тыя, доўга не ждаўшы, крэпка мех завязаўшы,
Пацягнулі яго ад парога,
Толькі з меха стагнала, як яго падкідала,

Пакуль скончылась ў неба дарога,
Аж бурчэлі каменні, як цягнулі з сялення
На гару, дзе віcельня стаяла,
Там вяроўкай мех скора падцягнулі угору
І пайшлі, як ні ў чым не бывала.
А назаўтрае з ранку ваявода з нагайкай
І гасцей напрасіўшы сабранне.
Ды ўсёй грамадою акурат ў месца тое
Здумаў ехаць на паляванне.
Быццам ўрэчы не знае ды уголас пытае:
«А тут што? Йшчэ чаго не бывала!»
І, рубнуўшы палашам: «Я це,— кажа,—
пастрашу!»
Мех упаў, аж зямля застагнала.
А тут служкі прыпалі ды мяшок развязалі —
Адтуль пастар вылазе паволі...
Ваявода ж пацеху меў вяліку і смеху,
Жартаваў з бедака ён даволі.
І расказываць годзе, што найлепш выйшаў
злодзей.—
Стары баяў,— вось помніце, дзеці,
Як двох роўных збяруцца ды калі задзяруцца,
Карыстае заўсёды там трэці.

## СУД

Неяк леташняй вясною
Было гэта, раскажу:
Два суседы між сабою
Завяліся за мяжу.

Адзін дзёрзкі быў, хоць голы,
Другі — слабай галавы.
Гэта Юзя Даўгаполы
І Казімер Канцавы.

Выставіўшы тоўста пуза
Ды са злосці аж сапаў —
Неяк з рання, мусіць, Юзя
На Казімера напаў.

«Ты мяжу зараў, завіднік,
Што няма дзе і ступіць.
Як табе не брыдка, стыднік,
Гэтакім зайздросным быць!

І зараў яе дашчэнту,
Ідзі толькі паглядзі.
І ты з гэтага маменту
Маім шнурам не хадзі!»

«Тваім шнурам? Во то дзіва!
Пазавём зараз людзей
І памерым, твая ніва
Будзе шырша ад маей».

«Эх ты, чалавек хвальшывы!
Лезеш ў вочы так, як гразь!
Ты лепш, покуль мерыць нівы,
Ў мае яблыкі не лазь!»

«А ты, бесава сабака,
Завёў гутарку яку?
Не брашы ты, як сабака,
Не узяўшы за руку!»

Зразу ціха і паволі
Разміналі языкі,
А паждаўшы, далей-болей
Узяліся й за чубкі.

Наш Казімер быў слабейшы,
Дык Язэп яго змалоў
І душыў, на грудзі ўссеўшы,
Ды спусціў і з носа кроў.

І Казімер быў ваяка,
Хоць нядуж, але хіцёр:
Кусаў з долу, як сабака,
Кіпцюрамі «маску» дзёр.

Тут суседзі крык учулі
Ды шмат біцца не далі,
Так, як пеўняў, расцягнулі
І вадою аблілі.

Наш Казюк з крывёй на твары,
Каб убачыў гэта люд,
Паляцеў да канцыляры
Падаваць Язэпа ў суд.

Але там, як на пачатак,
Пакуль дзела завясці,
Трэба яек хоць двацццатак
«Пану пісару» нясці.

Пані іх сама прымае,
Лічыць некалькі разоў,
Перад свечкай разглядае,
Каб не было баўтуноў.

Два дзесяткі да Кабялы
І да воласці павёз,
Толькі яны былі малы —
І крыўляла пані нос.

«Ты вось, мусіць, вінаваўца
Альбо ліхі чалавек,
Бо прынёс малыя яйца,
Хіба толькі як на здзек!»

«А няхай мяне Бог крые! —
Тут Казімер падхапіў.—
Гэта куры ў нас такія,
Каб іх ястраб залупіў!»

Пасля таго свет бы вымер,
Было ціха нядзель пяць.
Толькі «ліхі» наш Казімер
Пачаў «дзела» нарушаць.

Але «дзела» — як калёсы.
Хоць ты праў будзь і дасуж
І пазірай сабе скоса,
Не падмажаш — ані руш.

Дык Казюк наш добрай меры
Прыцягнуў мядку збанок.
Юзя ж праз другія дзверы
Паўсланіны прывалок.

Там, як гэта атрымалі,
Другі пайшоў разгавор:
І павесткі атрымалі,
І назначылі разбор.

А Казюк з Язэпам, гэтак
Як дурныя бараны,
Намаўляюць сабе сведак
Кожын з сваёй стараны.

Суд прыпадаў на суботу,
І народ з усіхніх мест,
Дома кінуўшы работу,
Пацягнуўся, як на фэст.

У святліцы памост мыты
І дзве лавы стаяць гэт,
Стол, зялёным сукном крыты,
На сцяне царскі партрэт.

За тым сталом пасядалі
Самі суддзі ўчатырох.
На грудзях маюць медалі
І над кнігаю залог.

Сыт і гладак, не сухотнік,
Бо здароў, як дуб лясны,
І да баб добры ахвотнік —
Гэта пісар валасны.

Ён законы усе знае,
І кіруе мазгаўнёй,
І рашэнні састаўляе.
А хіцёр жа, о-ё-ёй!

Першы Якуб, прадсядацель,
Пасярэдзіне сядзіць,
Носам дзюбае, як дзяцел,
Не то дрэмле, не то спіць.

Другі — Васіль. З смешнай мінай.
Смярдзіць водкай, як з катла.
Ды і з рота яго сліна
Аж на грудзі пацякла.

Трэці, Адам, знаць, набраўся,
Выглядае як бы злы,
Бо ўжо, відаць, засмаркаўся,
Скора будзе драць казлы.

А чацвёрты, як угрэўся,
Дык сапе, нібы мяшок,
Ды парадна ўжо забздзеўшы
І смярдзіць так, як шашок.

Усе яны падгулялі,
Аж тыкеля пыл пайшоў.
Толькі пісар наш, казалі,
Да Трылесаў не дайшоў.

Ён і кажа: «Будзе трудна
Гэта дзела нам рашыць,
Бо яно нам не падсудна,
Лепей будзе адлажыць».

Але суддзі сталі дубам:
Нашто маем адкладаць?
Кажуць Змітрок з Якубам:
«Трэба сведкаў запытаць».

«Клічце тады першу сведку!»
Ды глядзяць на яе ўсе —
Казімераву суседку —
І пытаюць пакрысе:

«Дзе была: дома ці ў полі?
І хто ўперад пачынаў?
Ды каторы гэта болей
З іх катораму наклаў?»

«Я была там мімаходам
Дык і бачыла крыху,
Як Казюк быў падысподам,
А Язэпка навярху».

«Многа было сукравіцы?
Кажы праўду, не крыві!»
«Былі поўны нагавіцы,
Але, мусіць, не крыві.

Бо ў калошах было поўна,
Няма тут чаго й казаць:
Адна была мера поўна,
І ў другой як завязаць».

Тут другога пазываюць
І з Язэпа стараны.
Той галавою целяпае,
Упёр дупу да сцяны.

Пытаюцца: «Што бачыў?
Ці Язэп Казюка біў?»
«Не, тыкеля акулачыў,
Але мала яго біў».

«Ну, Язэп, напраўду шчыра,—
Прадсядацель стаў казаць,—
Прасі у Казюка міру,
А то будзеш шкадаваць».

«Я прасіць ў яго не буду!
Каб ён толькі не даждаў!
Не даволен вашым судам!
Мала гузу тады даў!»

Тут узяўся пісар прэціць:
«Так няможна гаварыць,
Каб пры царскім пры партрэце
Пачаў кожан нам грубіць!»

А пад гэта нашы суддзі
Падхапілі ў адзін лад,
Што урэшце трэба будзе
Запісаць яму «узад».

Шапнуў Якуб да Адама:
«Яшчэ будуць барышы.
Я у зад і ты таксама,
Пан, у зад яму пішы».

## ПРЫГАВОР

У валаснае упраўленне
Стаў збірацца наш народ,
Бо тут, як на утрапенне,
Сказаў земскі сабраць сход.

Уперад дальшыя сяляне
Папрыходзілі таўпой,
А нарэшце і мяшчане
Прыцягнуліся парой.

Зборня поўна да парога,
Усе громка гаманяць.
Накурылі дыму многа,
Аж нічога не відаць.

Выйшаў земскі ды гавора:
— Трэба будзе вам зрабіць
Банчок сельскі, адкрыць скора,
Манапалькі ўсе закрыць.

На банчок трэба спачатку
Злажыць грошай адну часць,
А другую — наастатку.
Гэну, кажа, казна дасць.

Прадсядацеляў і членаў
Трэба будзе выбіраць,
А ўжо яны, каму трэба,
Будуць грошы пазычаць.

5 Зак. 3144

Банк зрабіўшы, ужо столькі
З вас жыдкі не будуць драць,
А закрыўшы манаполькі,
Будзе п'янства уціхаць.

Зашумелі нашы брацця
І нарэшце загулі —
Як касец на сенажаці
Пырне ў купіне чмялі.

— Добра,— кажуць,— земскі радзіць:
Нас не будзе драць Аўсей.
Але ж, пэўна, не пагладзіць
Ані Сцёпка, ні Андрэй.

І папраўдзе тут прызнацца,
Што, бадай, ці не ва ўсім
З жыдам можна меркавацца
Ці не лепей, як з сваім.

Хоць з вагой і мерай, самі
Знаем добра, нас дзярэ,
Пяньку і лён з канаплямі
За нішто у нас бярэ,

То яго ты, як скаціну,
Хоць у бараду наплюй,
А вот банкаўскаму чыну
Зрабіць гэтак паспрабуй!

Манаполькі, распіўныя —
Усё ліха, усё зло!
І тракціры, і піўныя —
Каб іх звання не было!

І крычалі усе людзі,
Той ахрып, а той спацеў.
Аж гукнулі: няхай будзе
Так, як земскі захацеў!

І ў той час па добрай волі
Распісаліся усе,
Што гарэлкі ніхто болей
Да губы не паднясе...

І падумаў бы хто, можа:
Люд там добры мае быць.
Але дзе! — барані божа! —
Яшчэ горай сталі піць.

Хоць так моцна наракалі
На папой гэны гаркі,
Манапулькі як прапалі —
Завяліся броваркі.

## ПАЛЯВАННЕ

Пагінуў снег ужо на полі,
Усюды стала гразь, вада.
Стральцам жа гэта не бяда —
Ёсць птаства ўсякага даволі:
Пішчыць кулік і цягне сломка,
Вабіцца шэры ярубок,
Ды і глушэц ляціць на ток,
І цецярук балбоча громка;
Шпакоў, драздоў, чаек нямала,
І стады качак ды гусей.
Трудна злічыць дзічы усей,
Што к нам яе папрылятала.
А тут Вялікдзень наступае,
Добра было б яно, але,
Каб мець звярыну на стале,
Бо чуць не кожны яе мае.
І вот не надта даўно, зрання,
Прыслаў стральца мне неяк Бог,
Дык мы як відзіш з ім удвох
Пайшлі сабе на паляванне.
Час нам папаўся непагодны,
Дзень вельмі дужа слотны быў,
Як цераз сіта дожджык ліў,
І ветрык павяваў халодны.
І чуць успелі мы дабрацца,
Не затрымаўшыся нідзе,
Брылі па гразі, па вадзе,
Цераз раку паўзлі па кладцы.
І хоць змарыліся, у поце —
Угаварылісь, як рабіць:

Лупіць, што толькі падляціць.
Заселі ў будках на балоце.
Мінула поўнач ўжо глухая,
На небе пачало шарэць,
Было ўжо значна, што світае,
Хоць і не надта, а ледзь-ледзь.
Аж недзе там, сярод балота,
Працяжна закрычаў жураў,
А тут баранчык забляяў
І чайкі рынулі, як слота.
Цяцеркі скора закакталі,
Зара́з зашыкалі самцы,
Як на ігрышчы ў нас хлапцы,
Уголас ўсе забалбаталі.
То адлятае, то садзіцца,
То хвост распусціць, як індык,
То шыю выцягне, як бык,
І схопяцца з сабою біцца.
Вот мы нагледзеліся многа!
Няма на што і наракаць,
Але каб што упаляваць —
Дык не ўдалося нам нічога!
Праз меру доўга мы сядзелі,
А чалавек — гэта не дуб.
У роце клікаў зуба зуб,
Аж нашы стрэльбы акалелі.
Цяпер успамінаць аж жудка,
Як было холадна, дык страх!
Трасліся стрэльбы у руках,
Цецерукі ляцелі ў будкі.
Праўда, ідучы каля мшару
Аж па калені у вадзе,
Хоць не было відно нідзе,
Ўзагналі неяк качак пару.

Відно, былі праз меру смелы,
Бо, ўзняўшыся яны ўгару,
Кружылі доўгую пару,
А мы далі чатыры стрэлы.
І няхай хто як хоча судзе,
Хоць не папалі мы у іх,
А страхаў далі не малых,
І жыцця, пэўна, ім не будзе!
Нам пасля тога палявання
Халодна было там сядзець:
З парожнім брухам і мяшком
Збіралася, мусіць, з вяршком
Вёрст із пятнаццаць да трапання.
Але мы там не асталіся
Ды пацягнуліся дамоў,
А мой кумпан саўсім прыстаў —
Ледзь-ледзь паволі дапляліся.
І на другі ўжо раз, бывала,
Ніяк і ногі не ідуць,
Як паляваць куды завуць:
Саўсім ахвота ўжо прапала.

## НЕ СПАНАТРЫЎ

Як чутно, дык гэтак, мусі,
Ў нас на цэлай Беларусі
Кожны двор і кожна хата
Мае прыказак багата
Ў кожнай справе, ў кожным дзеле,
Як падумаеш тыкеля.
А спісаць іх ўсе з натуры,
Дык валовай мала скуры.
Але прыказкі ўсе гэты
Не ліхой бываюць мэты,
Іх прыкмеціць толькі штука,
А там — кожнаму навука...

Ў адной вёсцы даўнавата
Жыў адзін мужык багата,
Так, як іншы раз бывае,
Калі ў масле сыр плывае.
Меў і грошай, і будынку,
І харошую скацінку,
Меў дачушку і сыночка —
Удалога адзіночка.
А пражыўшы веку спора,
Як прачуў канец свой скора,
Залёг стары ў караваці
Ды дзяцей к сабе стаў зваці.
«Дзеткі,— кажа,— мае мілы,
Я ўжо блізак да магілы!
Табе, дочка, трэба будзе
З волі божай пайсці ў людзі.
А ты, сынку, як Бог здарыць,

Калі будзеш гаспадарыць
Водле бацькаўскага ладу,
Дык старога помні раду:
Калі ты ідзеш з сахою,
З возам, з бараной, з сяўнёю,
Не кажы, ідучы з дому,
«Памажы, Божа!» нікому.
А другое знай, ці чуеш? —
Як арэш ці барануеш
Ды дамоў будзеш адходзіць,
Абгародзіць не зашкодзіць.
І нарэшце помні гэта:
Ці то восень, вясна, лета,
Ці зіма — каб круглым годам
Табе яда была з мёдам».
Расказаўшы гэта сыну,
Ён у тую жа часіну,
Так казалі ўсе аб гэтым,
І расстаўся з божым светам.
Яго пекна пахавалі,
Успамінкі, бач, спраўлялі,
Прадаўшы на то карову,
Далі на мшу трырублёву,
А яшчэ тры разы столькі
Заняслі у манапалькі.
Прызабыўшы крыху гора,
Сястра замуж выйшла скора.
Брат быў справіў ёй вяселле
І ўсяго на наваселле
Даў і нават не скупіўся.
Ды жаніцца сам жаніўся.
А натуру меўшы шпарку,
Ўзяўся сам за гаспадарку.
Як ідзе ці едзе, можа,

То не дасць «Памажы, Божа!».
А араць ідзе з сахою,
Вязе плоту воз з сабою,
І як толькі араць годзе —
Што ўзарэ, тое гародзе.
После даў сабе выгоду:
Накупляў і пчол і мёду,
Есць уволю і сыцее,
Але штось не багацее.
Парой не ўсее, не уробіць,
Дык і збожжа ўжо не родзіць.
І карысці няма з плоту,
Ды сагнаў з мёду ахвоту.
Спахмурнеў хлапец, казалі,
Ды смяяцца з яго сталі:
Ці пашкоджана сяліба,
Ці з мазгоў сышоў ён хіба?
Ён-то неяк раз вясною,
Сеўшы ў полі пад мяжою,
Аб сваім думаў няшчасці,
Плакаць стаў і бацьку клясьці,
Што не шэньціць і не родзіць.
Аж мяжою падыходзіць
Да яго дзядок старэнькі,
Ўвесь, як галубок, сівенькі,
Із кіёчкам, торба бела
На плячах яго вісела,
Ды каптанік на ім новы,
На нагах лапці ліповы.
З яго вочак святлом біла.
Стала хлопцу неяк міла.
А як стаў, разгаварыўся.
Дзядок стаў пытаць паволі,
Чаго плача ён на полі:

«Ці бацькоў то смерць забрала?
Ці няшчасце напаткала?
Ці жыццё табе дадзела?
Гавары мне, сынку, смела!»
«Не, не маю я нічога,
Ані крыўды ні на кога,
І ніхто мне не пашкодзіў —
Мяне бацька мой сазводзіў».
Ды прызнаўся перад дзедам,
Як той есці казаў з медам,
Гарадзіць пашню на полі,
Прытым не казаць ніколі,
Ідучы на поле з дому,
«Памажы, Божа!» нікому.
Паківаў дзед галавою:
«Сынку, робіш ты не тое
І на бацьку дарма брэшаш,
А за гэта цяжка грэшыш.
«Памажы, Божа!» не даці —
Гэта значыць не заспаці
І старацца, мой саколе,
Чым найраней выйсці ў поле.
Дык не ты ўжо дасі людзям —
Табе кожны даваць будзе.
З гарадзьбой рэчы такія:
Узарэш гонцы, другія,
Абжэнь сошкай ці баронкай,
Абгародзіш баразёнкай.
З мёдам то такая справа:
Кожная салодка страва,
З'ясі смачна, мёд пачуеш,
Калі добра папрацуеш».
Рэкшы гэта, дзед старэнькі
Зноў мяжою праз засценкі

Ўжо далёка апынуўся.
Покуль з думак быў ачнуўся
Наш хлапец, ніхто аднача
Анідзе дзядка не бачыў.
Скуль узяўся і дзе дзеўся,
І што ён рабіць тут меўся,
Хто ён быў, ніхто не знае.
Быццам сам Бог, хлопец бае,
Бо з той пары ў яго хаце
Скора знайшлося багацце,
Стала зноў радзіць на полі,
І ўсяго было даволі.
А суседзі яго тыя,
Людзі злосныя, благія,
Што смяяліся, брахалі,
Завідаваць яму сталі.
Гэтак бывае часамі,
Але ведаем і самі,
Што на свеце так бывае:
Хто працуе, той і мае!

## ПРАДАЎ

Паглядзеўшы, дык, здаецца,
Не найгорш у нас жывецца,
А прызнацца, даліпан,
Ўсюды лгарства ды абман.
І не трэба многа рыцца,
Каб шукаці ды дзівіцца.
Паслужыць можа цяпер
Хіба гэтакі прымер.
Пры сталіцы людной, спорнай,
На зямліцы жырнай, чорнай,
Між узгоркаў і раўнін
Там пасёлак быў адзін.
Ў тым пасёлку зухаваты
Дык селянін жыў багаты,
Бо ячмень хвацка радзіў.
Не найгорай дзядзька жыў!
Меў скацінку, грошай, хлеба
І ўсяго, чаго патрэба.
Ды сказаўшы акурат,
Быў той дзядзька скупават.
А прымаўка ёсць, мой браце,
Што скупы два разы траце.
Дык і з ім, сказаць, падчас
Так бывала іншы раз.
Раз было вось так аднака:
Укарміў ён падсвінака,
Як бы гэта вам сказаць,
Пудоў шэсць, а можа, пяць,—
Нібы вылепіў із цеста.
І павёз яго у места,

Спадзяваўся дзе, відаць,
Вельмі дарага прадаць.
А хацеў за свінку гэну
Ды трайную узяць цэну.
Таргаваў другі, глядзеў,
А купіць то не хацеў.
Прастаяў так торг, і годзе!
Аж пад вечар падыходзе
Да тавару сябра чыст,
Кажа: «Буду арганіст
І даўно хаджу па рынку,
Для ксяндза шукаю свінку.
Ваш тавар мне па душы,
Дайце зробім барышы».
І уміг, зараз без мукі
Перабілі ў торгу рукі.
«А па грошы сходзіш, Вашць,
Да касцёла — ксёндз аддасць.
Тож не дома, а ў дарозе:
Паляжыць свінчо на возе.
Мы з Вашэцяю уміг
Сходзім разам удваіх».
І вандруюць да бажніцы.
Ажно там у спавядніцы
Ксёндз вікары, дабрадзей,
Спавядаў сваіх людзей.
Пастаяўшы у народзе,
Да ксяндза ён падыходзе.
Стаўшы ціха пры акне,
І на вуха шапяне
Ды з вачэй пускае слёзкі.
Кажа: «Я з далёкай вёскі,
Тут дурнога брата меў
І да споведзі прывеў.

І як там стаяў з ім радам,
Адступацца узяў задам
І убіўся у народ
І з касцёла ды у ход!
Ксёндз на сябра паглядае.
Бачыць, нешта ён міргае,
Дык гамоне: «Ну, кленцай!»
А той кажа: «Грошы дай!»
«Што за грошы?» — ксёндз пытае.
А той зноўку паўтарае.
Кажа: «Война, не круці,
А за свінку заплаці!
Не патрэба было слаці
Арганістага купляці,
А так стаў, не варажы,
Толькі грошы палажы».
Здагадаўся ксёндз: ці чулі,
Хіба жулікі надулі!
«Вашэць, дык скарэй ідзі
І ці конік ёсць, глядзі».
Той на двор ў вялікім руху,
Ажно свінкі ані духу.
«Сябра» як упаў ў агонь.
Шчасце, што астаўся конь.

## ЖАЛЬБА ЎЦЕКАЧА

Гавораць людзі, што спрадвеку
Жылося цяжка чалавеку:
Цярпеў заўсёды бедны стан,
Бо яго крыўдзіў цар і пан.
Кажуць, што некалі, бывала,
Крыўды і слёз было нямала,
Але сказаць, і ў гэты час
Бывае моташна не раз.
Цяпер усюды ўголас баюць
І надта многа абяцаюць
Багацця і дабра ай-вай! —
Што ўжо на свеце будзе рай.
Але, як кажуць, абяцанка
Бывае для людзей спадманка
І радасць толькі для... дурных —
Такая гутарка старых.
Слабейшаму заўсёды цяжка.
Не — то і шэрая сярмяжка
Не раз твой карк худы сагне,
А можа, іншы скажа: не?
Даводзілася ўсім нам дужа,
Але найгорш таму, хто служа.
Той і сягоння пацярпеў,
Каторы з службы хлеб свой еў,
Хоць служба, як вялося здаўна,
Адна другой была не раўна.
Не будзем тога разбіраць —
Я аб сабе хачу сказаць.

*

Ў адной закінутай старонцы,
Гдзе ў дзень пагодны свеціць сонца,
Гдзе ўлетку — дождж, зімой — мароз,
Там я радзіўся, там і рос.
Бацькі мае хоць і хацелі
Мяне вучыць, але не мелі
Адкуль бы спосабу узяць,
Мяне ў навуку каб пасляць.
Ацец мой быў чалавек працы,
Служыў ў двярэ ён пры палацы
І там за працу і свой пот
Браў сарачню рублёў на год.
Само сабой, ў такія часы
Не мог аддаць мяне у класы,
Але затое, відзеў Бог,
Што ён зрабіў тае, што мог.
Дастаў надзел тры дзесяціны,
Крыху пашні, крыху бяліны,
Ў мястэчку шчупленькі пляцок
І збудаваў для нас дамок.
Матка мая, дык сказаць гэта,
Была гаротная кабета,
І вельмі мала светлых дней
На долю выпадала ей.
Мяне яна вельмі любіла,
Чытаць па кніжцы навучыла
І ставіць, помню як цяпер,
Кружкі і палкі на папер.
І гэтак — без вялікай штукі —
Усёй было маей навукі,
Але й праз гэту ўжо навек
Я стаў пісьменны чалавек.

Хоць я да гэтакай работы
Не вельмі многа меў ахвоты,
І, праўду божую сказаць,
Любіў я лепей пагуляць.
Але хто з нас ды без укору,
Не быў такім у гэну пору,
Калі нічуць не рупіць быт,
Абы не голы быў, а сыт?
Ой, гэты век! У людскім родзе
Чаму так скора ён праходзе?
І после той маленства час
Багат ўспамінкамі не раз.
Ён мне прамчаўся вельмі скора.
Прыціснула адразу гора,
Пазнаў адразу я бяду.
Дано так, мусіць, на раду,
А можа, баба, як купала,
На ўрокі спосабу не знала?
После і хрэст ўжо не памог.
А можа, гэтак судзіў Бог?
І, як усе з яго прыказу,
Змярлі бацькі мае адразу,
А я з парожняй калітой
Астаўся круглай сіратой.
Нягодныя насталі часы,
Як выйшлі скора ўсе запасы,
А тут якраз ішло к зіме —
Не сталі гульні науме.
А стала, як гавораць проста,
Нічога ўліць ані у вошта.
Тады прыйшлося спусціць нос.
Я думаў: згінуць трэба будзе.
Але перш Бог, а потым людзі
Сталі вучыць і памагаць,

Як трэба гора гараваць.
Як стаў саўсім я адзінокі,
Надумаў ехаць ў край далёкі,
Бо акурат у гэны час
За мора ехалі ад нас.
Але мужык — ён заўш варона:
Жаль стала роднага загона
Ды свайго ўласнага кутка,
Старэнькай цёткі і дзядка.
Вота ж я ў сваім хвальварку
Ўзяўся сам за гаспадарку
І папраўляцца стаў, але
Чуць не папаўся ў маскале.
І каб не дзед мой, каторы
Памёр у тыдзень па наборы.
Не захацеў на свеце жыць —
Пайшоў бы да цара служыць.
Паволі я крыху абжыўся,
Крыху паждаўшы, ажаніўся:
Дастаў кабету не на жарт,
Хоць, можа, быў яе не варт.
Хоць не з вялікае навукі,
Ды залатыя мела рукі,
Усё зрабіць сама магла —
І жонка добрая была.

*

Да вас, удалыя малойцы,
Мне хочацца сказаць два слоўцы
І раду добрую падаць,
Як трэба жонак выбіраць.
Звяртайце заўсягды увагу,

Каб многа не шукаць пасагу,
Ані ўганяцца за красой,
Ні за багатаю раднёй.
Пустая твар і ўся фігура,
Калі нягодная натура,
Язычлівая ці гультай.
О, гэтакай ты не чапай!
Пяройдзе грош, краса прывяне,
Радня цурацца цябе стане,
А з благой бабай чалавек
Прапашчы будзе на ўвесь век.
Глянь, гдзе дзяўчына акуратна,
Хоць будзе бедна, ды апратна,
І не лядашчая ізноў,
Добрай радні, добрых бацькоў,
Не любіць ветрыць, як другія,
Але і вытча і пашые,
Ды як не мажа на твар фарб,—
Такая жонка — гэта скарб!
Я ж дык узяўся, ўрэчы з карты,
За гаспадарку не на жарты,
За барану, саху і цэп —
Стаў дабываць паволі хлеб.
А ведама, з такой валокі,
Як быў яшчэ я адзінокі
І покуль што з кабетай сам,
Жылося з горам папалам.
Але ад Бога ці нарокаў,
Як стала прыбываць прарокаў,
Трудно з батраччыны пражыць,
Пайшоў і я у двор служыць.
Служба — от, ведама, як служба,
І, як гаворaць, што не дружба,
Няхай яе агорне бес!

Мяне назначылі у лес
Пільноваць значнага абшару
Ад крадзяжоў і ад пажару
І ад усякіх іншых шкод
Зіму і лета — круглы год:
Палосся, моху каб не дралі,
Сабак у лес каб не пушчалі,
Гарэхаў, ягад і грыбоў
Каб не збіралі без квітоў...
Бо на пашу ў лесе жывёлы,
На шышкі, венікі, памёлы,
Ўрэшце, на віткі да барон
Быў вельмі строгі забарон.
Вота ж гэтакім парадкам
Было хлапотаў пад дастаткам,
Было не раз многа бяды,
Былі разбоі і суды
І пры пасадцы, пры прадажы,
Але найгорш дык пры пакражы
Бывала прыкрасці падчас,
Кляцьбы і лаянкі не раз.
Бо і даўней і ў нашы часы
Мужык заўсёды на лес ласы,
Не ўсцеражэш яго нідзе,
Калі захоча — украдзе.

*

Наш пан, так, як і ўсе, вядома,
Ніколі не сядзеў ён дома:
Круціўся ўсюды як на здзек —
Быў не найгоршы чалавек.
Калі не сам пан, дык паната

Не гладзілі нашага брата,
Не спагадаючы нічуць,
Часта любілі падцягнуць.
А іх — і большанькіх, і меншых,
І паўнамоцных, і слабейшых,
Як маладых, так і старых —
Было прыезджых і сваіх.
Бывала — каб на іх халера! —
Другі на грош табе не вера,
І кожан гэтакі мядзведзь,
Гдзе горш — туды цябе папрэць.
З іх кожнаму, каб зналі-чулі,
Так нараві, як ліхой скуле,
Ды карк свой нізенька прыгні
І сваю лямку дальш цягні.
Так і глядзі, адкуль што будзе:
Адтуль — паны, адгэтуль — людзі;
Адны цябе усюды пруць,
Другія — лаюць і клянуць.
І будзь тут мудрым ў такім смаку!
І хоць рассыпся драбней маку
Або уголас галасі —
Ніколі рады не дасі.
Бо такі, мусіць, і не сніўся,
Не толькі што не нарадзіўся,
Каб так усім як мае быць
Патрапіў роўна угадзіць.
І так цягнулася гадамі,
То крыху лепш, то горш часамі,
Часта змяняліся паны,
І так жылося да вайны.
Але настаў той час нязгоды —
Захваляваліся народы,
Многа паклалася галоў,

І палілася ракой кроў.
Ад Бога ці ад злога духа
Пайшла па свеце завіруха,
Прапаў парадак, згінуў лад,
Калі паўстаў на брата брат.
Пайшло пад ногі ўсё святое,
На глум, на здзек — дабро людское,
Загінуў стыд, забыты грэх,
Вера бацькоў пайшла на смех...



# Публіцыстыка



# З ДОПІСАЎ У «НАШУ НІВУ»

## *1909 год*

### 1

Чытаючы аб тым, што людзі маюць мала зямлі, бярэ ахвота сказаць аб Валожынскай воласці. У нашай воласці вялікая зямельная цесната. У нас мужыцкі надзел быў ад 8 да 12 дзесяцін, а цяпер многа людзей падзялілася на 6, 8, 10 і 16 часцей, не гаворачы аб трацінках і чацвярцінках. У Валожынскай воласці жыве 13 тысяч душ, хат усяго 2062; з іх 673 хаты маюць менш адной дзесяціны, 833 хаты маюць па дзве дзесяціны, 377 хат ад двух да трох дзесяцін і толькі 178 хат маюць больш трох дзесяцін. На душу наогул выходзіць трохі больш як палавіна дзесяціны — з усіх валасцей павета Валожынская найбяднейшая.

У нашым двары прадаецца зямля па 100 рублёў дзесяціна, а банк дасць 40—50 рублёў, дык багаты купляе зямлю, бо можа далажыць, а бедны не мае сілы купіць. Так і гінем ад малазямелля; хто можа, пераязджае ў Амерыку, Пецярбург і другія месцы [1].

### 2

Валожын (Віленскай губерні Ашмянскага павета) — гэта звычайнае беларускае мястэчка, якіх многа ёсць у нашым краю; дзве часці яўрэяў, а трэцяя часць хрысціянаў, больш праваслаўных; калісь

было больш каталікаў, а рэшта уніяты, але пазней касцёл забралі на цэркву, і зрабілася больш праваслаўных. У нас жыве земскі, следавацель; ёсць воласць, аптэка, дзве манапалькі; ёсць 4 вучылішчы, у тым валасное рамеснае, гдзе вучаць плесці кошыкі. Гарэлку ў нас смаляць усё больш і больш. Нядаўна адзін мужык быў у гасцях у свайго брата, парабка ў фальварку Шапавалы, ды так нарэзаўся спірту, што і дамоў не даехаў: дарогай памёр.

На свята быў сход, хочуць адкрыць сельскі банчок. Рэч вельмі добрая [2].

### 3

У чацвер 11 юня ў нас была вялікая навальніца з грымотамі, і быў па каліву град; паводка папсавала гароды і пожні, а на полі, дзе крыху па ўзгорках, пазносіла пасевы і вельмі паразмывала нівы. Пярун забіў каля сяла Забрэззе двух чалавек, а ў нашым мястэчку ў гаспадара Васіля Мышлёна двое коні; у засценку Руднікі спаліў хату Янука Каляды, а ў вёсцы Рачаняты — дык тры гумны і свіран, і гэта ўсё ў адзін дзень. Хоць пажар і можна было ўгасіць, бо як ліў вялікі дождж, дык вада ляцела рэчкай і не трэба было яе ані насіць, ані вазіць, як гэта часта робіцца пры пажарах, але што ж, калі ў нас гэта праклятая цемната! Кажуць так: калі ўжо пярун запаліў хату, дык гасіць не можна; і стаяць, пазбіраўшыся, ды прыглядаюцца, як агонь скача з адной будыніны на другую. А іншыя кінуліся выносіць свае лахамоткі, хоць у тую старану і ветру не было. Адно толькі шчасце, што дождж, дык стрэхі былі мокрыя, а то ўся вёска пайшла б

з дымам. Цяпер трудна будзе як пагарэльцам, так і гэтаму, што коні падбіла, бо ўсе яны бедныя. Хіба добрыя людзі памогуць...[3]

## 4

Ужо трэцяя нядзеля, як пайшоў дождж, і кожны дзень ён усё сыпле, а вельмі патрэба пагоды, бо ўжо каля нас многа травы людзі панакашывалі, і яна мокне ў вадзе, а некаторую дык і зусім вада панесла. Найбольш накошана ў маёнтку Вішнева графа Храптовіча — Буценева; ва ўрочышчы Улавіна скошана дзесяцін са 300, ды ўсё на вялікай нізіне, і калі яшчэ гэтак будзе, дык усё прападзе.

Уночы з 23 на 24 юня быў пажар і згарэла тры дамы яўрэйскія і адзін хрысціянскі; казённая манаполька тры разы загаралася, але яе неяк загасілі, толькі гарэлка вельмі паглумілася, бо яе шмат патаўклі, а рэшту немаведама куды павыносілі. Яно бы, мусіць, гэтым не кончылася, бо надта вялікая гушча будынкаў, і быў добры вецер, але шчасце, што сажалка была пад носам з вадой, і людзі хутка сабраліся і вельмі добра ратавалі. Агонь пачаўся з хлева разніка Перскага з невядомай прычыны — кажуць, нехта падпаліў [4].

## 5

Сёлетняе лета не скупіцца бурамі і грымотамі, каторыя нам робяць надта вялікую шкоду. Не забыліся мы яшчэ той навальніцы, каторая была 11 юня, аж тут якраз цераз месяц, 11 юля, у суботу пад вечар, ізноў праняслася страшэнная хмара з маланкамі і перунамі, каторыя білі раз-пораз, не

перастаючы; людзі папалохаліся да паўсмерці і думалі, што ўжо настаў канец свету. Адзін пярун ударыў у валожынскую каталіцкую капліцу і па дроце ад званка ўляцеў усярэдзіну, дзе выдзер кусок сцяны і пайшоў у зямлю. Другі — ударыў у рабінаў дом, праз комін упаў у хату, рассадзіў там печ і, разбіўшы акно, вылецеў на двор, нікога не зачапіўшы. Трэці пярун спаліў у вёсцы Літве гаспадара Антона Карташэвіча, а ў вёсках Бітуці і Пяшкуры забіў па кані.

Каля Лебедзева пярун спаліў два засценкі; у фальварку Батурах у гумне пасэсара Вайсборда пярун аглушыў трох мужчын і адну бабу; мужчыны ў скорасці адышлі, а баба яшчэ хварэе: ёй заняло мову.

Каля нас цяпер бадзяюцца шалёныя сабакі. Нядаўна гэтакі сабака пакусаў у ляснічага пана Праневіча ўсіх свіней, і немаведама, ці яны не пашалеюць. Хоць у нас і дае ад гэага нейкія зёлкі Грышка М., але яны не кожын раз памагаюць. Трэба бадзячых сабак сцерагчыся і зніштажаць, бо могуць нарабіць шмат бяды [5].

6

27 юля (ліпня) ізноў быў у нас пажар. Згарэла 10 яўрэйскіх дамоў; праўда, што блізка ўсе яны багатыя, але гэтакае няшчасце, як пажар, трудна перанесці кожнаму. Дамы былі застрахованы, але дабытак дамовы ўвесь прапаў, бо каб гэта было ўдзень, дык скарэй чалавек хопіцца ратаваць, і напачатку шмат лягчэй агонь утушыць; але запалілася ў самы глухі сон, а 2-ой гадзіне ночы. Пакуль людзі сабраліся, агонь ужо добра разгуляўся і трудна было даступіцца. Найбольш страты меў фельчар

І. Шварц, бо каля яго пачало гарэць; бадай усё згарэла, а шкода, бо гэта добры чалавек і прытым небагаты. Пажар пачаўся ад хлева купца А. Поляка. Кажуць, што нехта падпаліў, бо ў тым гаду ён два разы запальваўся. Ёсць такія подлыя людзі-зверы, што для свайго інтарэсу так страшна губяць другіх. Пажарная дружына слаба памагала, няма ніякага парадку: усе камандуюць, а ніхто не слухае [6].

7

У наша мястэчка ўжо трэці раз даведуецца пажар. Гэтым разам згарэла «на далу» 5 яўрэйскіх дамоў з усімі прыбудоўкамі і сяліба гаспадара Марціна Карабана, але не ўся, бо ў яго асталіся гумно і хата, а хлявы і свіран пайшлі з дымам — і гэта ўсё з рукі благога чалавека. Але гэтым разам, здаецца, не павінна ўвайсціся за штуку, бо злавілі аднаго малайца з сяла Бурнейкі Міхася Палешчука, як ён, падсмаліўшы хлеў у далавога яўрэя, уцякаў у поле. Гэта малады хлапец, і яму трэба было сёлета станавіцца на прызыў; быў у Пецярбурзе і там, мусіць, навучыўся гэтай штукі; ён цяпер сядзіць у Ашмянах у клетцы і бадай што ўжо адтуль яго не выпусцяць.

Нядаўна людзі добрай волі рабілі тэатр на бяднейшых пагарэльцаў, і адбываўся ён у скарбовым свірне праз два вечары. Сабралі шмат грошай, бо кожны ішоў паглядзець не столькі з цікавасці, скольк з ахвяры.

У гэтым часе быў у сваім маёнтку Валожын дзядзічны пан граф Тышкевіч, і да яго прыходзілі з просьбамі ўсе пагарэльцы, і ён кожнаму памог патроху. Добры гэта пан, не такі, як другія. Толькі кажуць, што яго справы дрэнна стаяць, быццам яго

«лападэнты» ўвялі ў кабалу, з каторай яму трудна выкруціцца. Цяпер ён намагае ўсё лесам, але і лес ужо вельмі перапаласкаўся. Цяпер то яшчэ ёсць уволю і дроў, і бярвення, але, паждаўшы, не будзе ані з чаго будаваць хатаў, ані тапіць чым у печах. Хіба будзем ставіць будынкі з гліны, а тапіць торфам, бо гэтага багацця каля нас уволю, толькі трэба ўмець, як за яго ўзяцца [7].

**8**

Лета ў нас было вельмі дажджлівае, і людзі баяліся неўраджаю, а некаторыя варажылі голад. Але пад канец стала пагода і ўсё збожжа добра пазбіралі — як жыта, так і аўсы, ячмені і льны. Бульбу цяпер капаць дык надта добра, бо яна сухая, без пяску, не так, як у мокрую восень, калі яе трэба выбіраць з гразі дый яшчэ студзіць у кулакі, бо часам бывае і мокра, і холадна. Хоць, праўду кажучы, каля нас на бульбу завідны год, у адных яе процьма, а ў другіх саўсім няма, а гэта дзеля таго, што адзін садзіў яе па высокіх месцах, дык таму і ўрадзіла, а другі па нізкіх, то ў яго і прапала. Збожжа то, каб не зграшыць, было добрае, сена маем зялёнае, і многа яго, канюшына толькі рэдка ў каго ёсць, бо яна нешта з зімы кепска павыходзіла. У нас усё наракалі, што кепскае насенне было, бо каля нас яе на насенне мала кідаюць, а купляюць па таргах, дык другі, купіўшы якой травы, рад, што танна, а тым часам после вырасце адзін верабейнік.

Хоць каля нас і ўраджай, але скаціна саўсім танная, затое дык мяса ў цане: фунт сала свінога 12 капеек, бараніны 10 капеек, масла 30 капеек, а гэта ж мястэчка! [6]

## 9

10 вёрст ад Валожына ёсць вялікае сяло Дубіна, і чутно аб ім далёка-далёка. Мае яно, мусіць, са 300 хат, ёсць там і манаполька, і карчма. Народ вельмі паганы, самыя п'яніцы і зладзеі: не то што на дварэ нічога не пакінь, але і з будынку павыцягваюць. У прошлым гаду дык выцягнулі ў Янука Палоўскага з пуні сячкарню, дык яна і прапала. У кудраўскага лесніка Максіма пазнімалі калёсы з восяў. А пабіць каго, дык гэта ў іх нават мода: няхай будзе толькі хто на каго злы або другі папросіць, дык нападуць ці на полі, ці на дарозе і забіваюць да паўсмерці. Трэба каго абараць, пабіць або і падсмаліць — ідзі ў Дубіну, там усё гэта знойдзеш. Але няма чаго дзівіцца: яны маюць вучыцеля, каторы не дае ім добрага прыкладу.

Нядаўна тутэйшыя злодзеі на 8 хурманках уночы ўкралі з Кавалёўшчыны 60 коп гонтаў і развезлі па полі па ямах, ды цяпер смяюцца і хваляцца, што надта мудра ўправіліся.

Бедныя, цёмныя людзі! Калі ж і да іх загляне сонца ў ваконца? [9]

## 10

На ўсходняй часці нашага мястэчка ёсць ладны ўзгорак, на каторым жыве, пасяліўшыся, бацюшка. Гэты ўзгорак пачынаецца ад мястэчка агародам, а канчаецца невялікім курганом паміж двух дарог, і там, як відаць, былі некалі могілкі. Якія яны былі, аб гэтым ніхто з нашых старых не помніць, і няма шака ніякага аб іх успамінку. Яшчэ за нашай памяццю на сярэдзіне таго курганчыка стаяла малень-

кая каплічка, пасля стары бацюшка яе прыняў і на тым месцы паставіў чыгунны крыж. Цяпер зямля пакрысе абвальваецца, і адтуль выпадаюць людскія косці: галёнкі, скабы, чарапы, і валяецца гэта ўсё па дарозе, гдзе ходзяць і ездзяць людзі і ганяюць скаціну. Смутны і прыкры гэты выгляд, каб гэтак людскія косці валяліся ў паняверцы. Ці мы гэтак крэпка здзічэлі, ці гэтая праклятая цемната пазасланяла нам вочы, што мы не можам прагляну́ць на свет божы? Ці ж гэта ўжо не знойдзецца ў нас добрага чалавека, каторы б заняўся гэтай справай? Тут не трэба вялікага кошту і трудоў, тут трэба толькі добрай ахвоты. Спярша трэба пазбіраць і пазакапываць у зямлю косці і аблажыць дзёрнам з бакоў гэты курганок, і хоць крыху абгарадзіць, хоць бы па тры плацінкі, каб скаціна не абсоўвала дзёрну, пакуль ён не зрасцецца — вось і ўсё!

Наш беларускі народ мае добрае сэрца, але нямашака добрага даводу: ён прывыкшы, каб яго папхнуць, панукаць, а тады ён возьмецца з усяе сілы. Хоць са стыдом трэба прызнацца, што на добрыя рэчы трэба прынукі, а на благія дык людзі самі як мухі да мёду ліпнуць. Калі ў нас задумалі адкрыць гарадское вучылішча і на гэта патрэбна было 500 рублёў грошай, дык іх збіралі, збіралі дый далі пакой, а як быў у нас у Валожыне на Пранцішка кірмаш, дык нашы дзве казённыя манапалькі ўтаргавалі чуць не паўтары тысячы рублёў у адзін дзень. А трэба ведаць, што ў нас такіх вялікіх кірмашоў у гаду пяць і што кожны чацвер — торг, гдзе за п'янымі няма як павярнуцца [10].






Дом у Валожыне, дзе нарадзіўся і доўгі час жыў Стары Улас.



824. Wyhawarytańie
Niejak každy mnie papata
Hetaju niebylicu
Jak kabieta pradawała
Na tarhu kurycu
Hrebień krasny, sama čorna
Ale skrydły raby
Niepačesna, niepakorna,
Ot wiadoma ŭ baby.
Dyk praz hetaju pryčynu
Prynacca kaściciam
Tu mi rernaju ptašynu
Mało chto zamieciŭ
Tolki niejkaja kupčycha
Tudy prydybała
Dy ŭ čyjeś jak na licho
Tarhawacca stała
Kaže, što za niebylica
Chiba warta Juda
Ikraja heta kuryca
Dy jošč wielmi chuda

Рукапіс верша
Старога Уласа.


Serja A. Nr 155169

RZECZPOSPOLITA POLSKA

Województwo Nowogródzkie

Powiat Wołożyński

DOWOD OSOBISTY

DLA

OBYWATELA RZECZYPOSPOLITEJ POLSKIEJ

№ dowodu 169.

Пашпарт Старога Уласа.




Пашпарт Старога Уласа.



— 3 —

RYSOPIS:

Wzrost wyżej-średni

Oczy szare

Usta mierne

Nos proporcjonalny

Włosy szpakowate

Twarz owalna

Szczególne znamiona —

Posiada znajomość czytania i pisania: polskim, i rosyjskim

Włada językami: polskim, rosyjskim i białoruskim

Stwierdza się tożsamość właściciela niniejszego dowodu osobistego z jego fotografją, oraz jego własnoręczny podpis.

STAROSTA WOŁOŻYŃSKI

Pieczęć

Podpis

Пашпарт Старога Уласа.



— 4 —

Imię i nazwisko Władysław Siwy-Siwiecki

Data urodzenia lub wiek 10. III - 1865 r.

Miejsce urodzenia m. Wołożyn

Imiona rodziców Piotr i Ludwika

Religja Rz.-katolicka

Zawód leśniczy

Stan rodzinny żonaty

Miejsce osiedlenia (miejsce zapisu do ksiąg stałej ludności, przynależność gminna, miejsce zapisu do ksiąg organizacji stanowych) gm. Wołożyn pow. Wołożyński.

Miejsce zamieszkania (faktycznego stałego pobytu) maj. Sużany pow. Wileński

Narodowość białoruskiе

Пашпарт Старога Уласа.



На гэтым месцы ў вёсцы Шашэльгішкі (Літоўская ССР)
калісьці стаяла хата Старога Уласа,
у якой пісьменнік жыў з 1934 года
і памёр у 1939 годзе.



Надгробак Старога Уласа.
Вёска Сужаны Літоўскай ССР.
Побач ахоўнік магілы А. М. Курчэйка.

11

Каля нас сенажаці балотлівыя, і сена з іх возяць зімой, а цяперашняй дарогай дастаць яго нельга, дык нашая скаціна галадае надта на адной саломцы [11].

## *1910 год*

1

Перад святам у маёнтку Пяршаі ў лоўчага Браткоўскага згарэла гумно і хлеў.

Падрад ад купца на возку дрэва да берага ўзяў у нас Б-і і гэтым адняў у нашага брата апошнія заробкі [1].

У нас на самую куццю шаснаццацілетні хлапец — сын удавы Гарасімчыхі хацеў перарубаць на свята дроў, але, паслізнуўшыся, упаў з паленам на лёд; палена ўдарыла яго па галаве і забіла на месцы. Бедная нешчаслівая матка разбіваецца з плачу, ды і суседзі яго шкадуюць, бо добры быў хлопец [2].

2

*«Думаем за морам, а смерць за плячыма»*

Павёў гаспадар каня паіць, а конь брыкнуў і падковай разбіў яму галаву [3].

*«Праспаў бядак ногі»*

Адзін хлапец, запаліўшы восець, лёг каля печкі пагрэцца дый так моцна заснуў, што і не чуў, як па-

пёк сабе ногі. Калі давядзецца падлячыць яго, то ўсё ж такі астанецца бядак на ўсё жыццё калекай [4].

*«Бядуй не бядуй, а за працу бярыся»*

Сёлетняя зіма не вельмі цікавая і шмат каму ўжо далася яна ў знакі, бо да гэтага часу саўсім не было снегу і ездзілі ў калёсах; часта праходзіў дождж — вада вылівалася, замярзала, і рабілася тады страшэнная слізгота. Шмат пакалечылася коней і жывёлы.

Цяпер падсыпала крыху снегу, дык лягчэй будзе прывезці дроў з лесу дый сена з балоціны [5].

*«Канец свету, бо не ўскрэсла прасвету»*

Каля нас ходзяць чуткі, што сёлета будзе канец свету. Кажуць, што будзе ісці нейкая «камета з хвастом», каторая зачэпіць нашу зямлю і сатрэ яе ў парашок. Людзі старыя так кажуць: «Усім стала нягодна, цяжка жыць — хіба прыйдзе ўжо нейкі канец!» І праўда: няма дабра на свеце. Пайшла нейкая нянавісць: адзін аднаго ў лыжцы вады ўтапіў бы, адзін аднаго паляць, забіваюць; людзі парабіліся горш звяроў. Даўней гэтага не бывала, а цяпер дзень у дзень пачуеш: то на дарозе чалавека затаўклі, то на полі, то сам на сябе рукі налажыў. І канца няма — ажно неяк страшна робіцца...[6]

### 3

*«Кепскае тое ігрышча, дзе кулак свішча»*

У нашай вёсцы было ігрышча. Гулялі, гулялі дый па чубах заігралі. Адна кабеціна стала бараніць сынковага чуба, дык яе, мала таго, што моцна збілі, яшчэ, прыляцеўшы да яе хаты, пабілі ўсе вокны [7].

## 4

*«Вінаватых шмат, а ў атвеце Ігнат»*

У канцы нашай вёскі ёсць глыбокі роў, а як намяло на дарогу гурбы снегу, то прыходзіцца, абмінаючы іх, ездзіць над самым гэтым ровам. Так ездзілі і свае, і суседзі, і начальства. Ажно нядаўна прыйшлося ехаць аднаму хлопцу з возам лёну над гэтай пропасцю: воз перакінуўся туды і задушыў бедака. Хто ж дасць атвет за гэта маладое без пары прапаўшае пры працы жыццё? [8]

*«У нас калі хочаш каго знайсці,*
*то мусіш у карчму пайсці»*

Здарылася мне патрэба да аднаго чалавека тутэйшай вёскі. Шукаў, дыбаў — аднак патрафіць да яго не мог. Ажно параілі мне тутэйшыя людзі зайсці ў карчму: там, кажуць яны, усіх знойдзеш. І праўда: і старых, і малых, і кабет, і дзяўчат — поўненька. Ці ж там ім месца?.. [9]

## 5

*«П'юць, п'юць і душу прадаюць»*

Морам ліецца ў нас гарэліца, і нашы сяляне так абласаваліся ёй, што іншыя дзеля яе і пад прысягу сведчыць несправядліва ідуць. Ой, ці не пара б было апомніцца? [10]

Тутэйшы гаспадар паехаў з парабкам рубаць дровы ў лес. Але як вольха, каторую яны падрэзалі, зачапілася за другую, дык прыйшлося і тую спусціць. І яна, валячыся, зламала вярхоўку падгніўшай бярэзіны суседняй, каторая трапіла па галаве парабка і забіла яго на месцы [11].

## *1911 год*

### 1

Чытаючы «Нашу ніву», часта трапляецца пачуць шмат наракання на гарэлку, але, разгледзеўшыся, дык і каля нас вельмі самавіта з гэтым. Дзе ты ні кінься, куды ні ступі, усюды наткнешся на гарэлку. Прадае часам кабеціна парася, другая купляе авечку або цяліцу — п'юць барыш. Наймаюць чаляднік̇а ці чаляднічу, а хоць бы і пастуха — барыш. Здарыцца к табе які госць, сваяк, добры знаёмы, дык чым жа яго ўгасціць? Гарэлкай! Трэба каму вазіць сена ці бярвенне — прыходзіцца спрасіць суседзяў і даць гарэлкі. Дасць каму Бог дзіцятка, спраўляе радзіны — трэба гарэлкі, хрэсьбіны — трэба гарэлкі. А на вяселле дык часам і кароўкі на гарэлку не хваціць. Ну, яшчэ на гэтыя патрэбы дык, можа, другі і скажа, што гэта тут падыходзіць, але на пахаронах, калі здарыцца ў каго нябожчык — ці стары, ці хоць бы толькі малое дзіцянё, дык і там без гарэлкі не абойдуцца людзі. Нядаўна ў нашым сяленні памерла адна наша суседка, і паводле нашага абычаю ўсе ідуць маліцца. Пайшоў і я. Пасярод хаты ў труне ляжыць нябожчыца. Каля яе, кругом стоячы, галасілі дзеці і дамовая сямейка. А на стале — крыж, гарэлка, грамніцы, бохан хлеба і дзве пляшкі манапалькі. І хто толькі прыходзіў, дык кожнага частуюць. «Нашто вы гэту гарэлку даяце?» — пытаю. «А што ж,— кажуць,— не дай гарэлкі, дык ніхто і дзвярэй не адчыніць, а што ж адзін зробіш? Трэба і дамавіну зладзіць, і дол выкапаць, і на могілкі занесці, а без гарэлкі гэтага не зробіш, бо ніхто не пойдзе». Як гэта нядобра, што ўсё за гарэлку робіцца.

А бывалі яшчэ і такія прыпадкі, як гэта было летась у Бандарах. Памёр гаспадар, дык яго кінулі аднаго ў хаце, а самі ў другім канцы давай гнаць «саматужку» з лікёру. Можа, ніхто аб гэтым і не даведаўся б, але неяк наехалі стражнікі, дык забралі і гарэлку, і ўсе іхнія інструменты.

А не давядзі Бог каму судзіцца, дык чуць-чуць не па ўсёй Беларусі такі звычай, што хоць гінь другі, а гарэлкай залівай усюды: старасту, панятых, старшыню, суддзяў, сведкаў і памагатарам не шкадуй гарэлкі, калі хочаш, каб справа выйшла. Аднаго пісара часам толькі гарэлкай не пагладзіш, бо яму ўжо трэба чаго лепшага [1].

2

Нядаўна ў нас два чалавекі, узяўшы ў вясковага гаспадара каня, паехалі за дзесяць вёрст на вечарынку. Крыху пабавіўшыся, вярталіся дамоў. Але яшчэ намеркавалі заехаць крыху ў старану да аднэй удавы — Бог іх там ведае, мусіць, мелі да яе нейкае дзела. Едучы, збіліся з дарогі ды ўсадзілі ў капаніцу каняку. А пакуль хадзілі па людзей, дык той бедны і акалеў, і цяпер, мусіць, прыйдзецца заплаціць таму гаспадару за коніка. А ўсё гэта праз мароз, які ў той час тут стаяў [2].

3

Няма дзіва, што ў Думе гавораць па сем гадзін аб гарэлцы, бо і ў нас, калі аб гэтым падумаць ды ўсё расказаць, дык і за сем дзён не даў бы рады. У нас ёсць дзве казённыя манапалькі, каторыя паводлуг сваіх правоў і парадкаў не прадаюць гарэлкі

ва ўсе святочныя і табельныя дні, ані ў той час, калі адбываюцца суды, сходкі і богаслужэнні. Дык гэта выглядае так, што ў гэты час не павінна быць зусім п'янства. Але куды там! Як толькі сход, суд ці святочны дзень, дык трудна прайсці за п'янымі. А дзе ж яны бяруць гарэлку, спытаеце? А ў нашых услужлівых мяшчан.

Нядаўна ў нас быў кірмаш на «масленую», дык нашы патайныя шынкары ёмка к яму прыгатаваліся. Але адкуль нанясло ліха вішнеўскага акцызніка. Ну, дык той вазамі вазіў гарэлку, узятую з хат. Але затое ўжо кірмаш быў такі ціхі і спакойны, што, мусіць, такога другога не было ніколі ў нашым мястэчку. Усе спакойна раз'ехаліся да хат, не было разбояў, і нідзе не відаць было п'яных людзей [3].

## 4

Каля нас зразу вясна паказалася вельмі харошай: увесь красавік быў пагодны з цёплымі дожджыкамі, стаяла харошая пагода і ўсе спадзяваліся ўраджайнага лета. Але як наступіў травень, дык усё неяк адмянілася, урэчы сакануў хто тапаром: зразу настала суша і сцюжа. Жыта засела і не расце, трава паўнікала і памерзла разам з ранняй гароднінай, а пасеяная ярына ляжыць наверсе зернем і не думае ўзыходзіць. Цэлыя тыдні не было дажджу, хоць часам пачыналі збірацца хмаркі і ўрэчы капаў дожджык, як з-пад крапідла свянцоная вада, але зараз жа падападаў сярдзіты вецер і так, як нячыстая сіла, пруцячы віхрам стаўны і хвалі пяску і пылу, праганяў дажджлівыя пузыркі некуды далёка-далёка...

Затое кожын дзень то там, то сям убачыш клубы

чорнага дыму, што паднімаюцца ўгару: гэта гараць панскія і казённыя лясы, а нярэдка і цэлыя вёскі. А як нашы гаспадары па старадаўняй прывычцы дзеляць бацькаўшчыну на дробныя матузкі і ляпяць свае будынкі адзін на другі, ну дык затое як уб'ецца агонь, тады ніякага ратунку. Гэтак нядаўна было ў адной нашай вёсцы Шчаўканах: як загарэўся адзін канцавы гаспадар, дык усю вёску як бы змяло і ачысціла мятлой. Як гэта дрэнна, што нашы людзі не хочуць рассяляцца на хутары, дзе многа лепш гаспадарыць і ў пажарным няшчасці многа бяспечней, як цяпер. Хіба, можа, бяда нас як прыцісне, дык мы пазнаем, што лепш [4].

## 5

Сказаўшы божую праўду, дык каля нас яшчэ вельмі цёмны, але прытым і вельмі добры, а як другія кажуць, і вельмі дурны народ, і з гэтай прастаты карыстаюць усякія несумленныя людзі, каторыя на ўсякі лад ашукваюць нашага брата. Дык і нямашака дзіва, што часамі беларуса трудна намовіць да чаго-кольвечы добрага: ён будзе слухаць і на словах патураць, але ў душы дык саўсім табе не паверыць, бо ён ужо за гэта паплаціўся калісьці. Нядаўна было каля нас такое здарэнне: пакралі ў вёсцы Зафільцы ў аднаго гаспадара коні. Праз нейкі час, так неяк адвячоркам, прыходзіць да гэтага самага гаспадара чалавек, нейкі быццам купец, і гаворыць, што ён сын нейкага падрадчыка з Вілейкі, каторы быццам дастаўляе хлеб арыштантам, і ён чуў, як адзін свежаарыштаваны расказваў сваім таварышам, як пакраў коні ў вёсцы Зафільцы і куды іх падзеў. Вось ён таму гаспадару і кажа: «Калі дасі мне

50 рублёў, дык я пакажу табе, дзе твае коні знаходзяцца, і памагу іх шукаць; толькі нікому аб гэтым гаварыць не можна, бо як дачуюцца тыя, у каго яны ёсць, дык перададуць у другое месца і будзе прапашчая справа». Гаспадар той думае сабе: хоць 50 рублёў і шкода, але ж за гэтыя грошы двое коней не купіш, а пры тым гэта ж такі будзе свая скаціна, да якой ён прывык. А тут бяда — нямашака грошай. Павытрасаўшы ўсе вузёлчыкі, ледзь сабралі 10 рубельчыкаў з вялікай труднотай і гэтыя апошнія грошы аддалі на задатак, а праз ноч састараліся яшчэ 40 рублёў, пазычыўшы іх у добрых людзей, і, наняўшы хурманку, паехаў той гаспадар з тым купчыкам па коні, узяўшы, аднак жа, дзеля смеласці свайго сына, дужага мужчыну, як дуба.

Ад'ехаўшы за 5 міль ад дому да мястэчка Каменя, астанавіліся на папас у карчме і там выпілі, закусілі парадне ды аддалі свайму сябру яшчэ 40 рублёў. А той, наеўшыся добра на месцы, набраў яшчэ з сабою гарэлкі і булак, пайшоў быццам у лес па коні, а ім сказаў падаждаць. Дык тыя бедакі, праждаўшы два дні і дзве ночы, вярнуліся з парожнімі рукамі дахаты [5].

## *1912 год*

### 1

У нас, дзякаваць Богу, як і ў людзей, адкрылі сельскі банчок і, атрымаўшы з казны 2000 рублёў на пачатак, за адзін тыдзень усе іх рассунулі. Распазычыць то вельмі было лёгка і скора, бо каля нас

народ вельмі на грошы патрэбны, немаведама, ці будзе гэтак лёгка іх пасысківаць. «Дай, Божа, але не ведаю».

Недалёка ад нашага мястэчка ў вёсцы Рачэнях адзін селянін зарубаў на смерць сваю жонку сякерай. Казалі, яна была вельмі злосная баба, а ён дык саўсім ціхі, а як іншыя казалі, дык і дурнаваты чалавек, так што яна яго з сынкамі часта заганяла. Але, відаць што, перабралася мерка, бо гэтак, казалі, было і гэтым разам. Яны яму ўперад нагрэлі добра каркавіну, а ён, ад іх уцякаючы, схапіў папаўшуюся сякеру на сцежцы ды стукнуў жонку ў лабаціну.

А ў прысёлку Сідаравіч у аднаго багатага гаспадара была парадная сямейка, як баб, так і мужчын, і самы малодшы з іх крэўчык быў яшчэ не жанаты, і яму, як відаць, заманулася жаніцца, а тут старэйшыя не пазваляюць, хоць ты ім кол на галаве чашы. Тады ён прыдумаў вось якую штуку: прыгледзеўшы, як бабы варылі зацірку на вячэру, падсыпаў туды добрыя прыгаршчы блёкату, а тыя як нахлябаліся, дык і пайшлі выранджаць усялякія штукі. Адны пяюць, другія выюць, трэція галосяць; дзеці пазалазілі пад печ ды дзяруць казлы, як кажуць, у прапрадзедаўскім уборы. Аж жудка, што там нарабілася. Назаўтра, казалі, прывозілі знахара, але беднаму крэўчыку жаніцца як не давалі, так і не даюць [1].

## 2

У нас было вось якое здарэнне. Быў у воласці сход. Было многа народу, і, як гэта вядзецца, вечарком некаторыя зайшлі ў карчму прагнаць сма-

гу. У гэтай кампаніі быў адзін заможны і паважны гаспадар, М. В-ч, з вёскі Сермяжнікоў — за дзве вярсты ад мястэчка. Вось гэты чалавек, не могучы вызваць сваіх суседзяў з тае бяседы, кінуў іх там і адзін пайшоў дахаты. А да суседняй з той, што яны выпівалі, хаты заехаўся нейкі падарожны чалавек, казалі, што пагарэлы, і, паставіўшы свайго каня пад паветкай, забыўся прывязаць яго ды зайшоў у хату. Загаварыўся тамака, а бедная скацінка, відаць, згаладалася, выйшла праз незачыненыя вароты шукаць сабе яды і, мусіць, гэтак блытаючыся, зайшла ў вёску Сярмяжнікі да аднаго чалавека на падворак і там пабірала натрэсенае па сцежцы сена. Як агледзіцца после той чалавек, што нямашака яго каня, як падніме крык, што гэта, мусіць, нехта ўкраў! Папёр ён да ўрадніка, але таго не было дома, ледзь знайшоў яго на хрысцінах. І вось яны гарачымі слядамі знайшлі гэтую каняжыну ў чалавека на дварэ. Тутураднік прыстаў да таго чалавека, што ён украў каня. А той кажа: «Хрысціцеся вы, я сягоння з дому нікуды не выходзіў».— «А хто быў сягоння ў Пяршаі?» — «А гэта, кажа, быў В-ч на сходзе». Ідуць да В-ча, а той спіць як пшаніцу прадаўшы, і ані яму сніцца, якая над ім збіраецца бура. Будзяць таго. «Ты быў сягоння на сходзе?» — пытае ўраднік. «Быў».— «З кім варочаўся дамоў?» — «Адзін».— «А каня не бачыў?» — «Якога каня?» — «А таго, што я знайшоў у твайго суседа на дварэ».— «Не бачыў, не ведаю». Але ўрадніку паказалася гэта падазрыцельным, і ён загадаў гэтаму чалавеку адпраўляцца з сабой у арыштанцкую пры воласці. На другі дзень калі ўз'юрыцца таго чалавека жонка, прыпёрла да ўрадніка ды ў плач, ды тыц яму ў рукі тры чырвонцы, каб пусціў

мужыка — ведама, баба. А той, не доўга думаючы,— відаць, каб адлічыцца,— тыя грошы ў пакет і з тым чалавекам у стан. Яго адтуль пусцілі дахаты, але казалі, што будзе суд. Цікавая рэч, як гэты суд выйдзе; бо той чалавек у гэтым дзеле Богу душой хіба вінны [2].

### 3

Каля нас вельмі цешыліся, што пасля марознай зімы неяк скора пагінуў снег, і думалі, што ўжо будзе цёпла. Бо ў гэтым годзе зіма хоць не вельмі была доўгая, але добра далася ў знакі. Мала таго што парадна пражыў мароз, але пасля сухога лета вада павыбіралася ў калодзежах і яе трэба было вазіць — як сабе, так і скацінцы — за некалькі вёрст. Цяпер затое вады ўжо маем даволі, але таго цяпла, якога ўсе спадзяваліся, дык нешта нямашака, бо насталі нейкія золкія і слотныя дні, часта праходзіць дождж са снегам, а гразі ані вылезці, хутчэй да восені, чым да вясны, падобна. Без пары загінула дарога, і хто астаўся без дроў і без сена, спадзеючыся, што яшчэ будзе мецць на гэта часу, цяпер за благой дарогай гэтага зрабіць не можа [3].

### 4

У нашай старане народ вельмі любіць суды, але яшчэ больш любяць гэта нашы адвакацікі сваёй гадоўлі, каторых завялося ў нас парадна, і іншыя такія мудрыя, што хоць ты стой ды дзівуйся, як яны ёмка абрабляюць свае справы. Завядуцца з сабой браты ці суседзі або ўздумаюць дзяльбу, зараз да адваката. А яго доўга шукаць не трэба. Кожную

нядзельку і чацвер іх можна знайсці ў карчме на покуці. Там яны разглядаюць закон, падбіраюць стацці, каторыя трэба «апаласкаць», і тады ўжо адвакацік бярэцца за дзела, каторае іншы раз вядзе з двух канцоў: за аднаго ставіцца ў судзе, а другому піша прашэнні. Бывае часам і так: другому нельга даступіцца да адвакаціка, бо ўжо з ім засеў той, з каторым судзіцца, дык трэба ісці да яго дахаты і занесці парадны сувісцель. А ў судзе часам усяляк бывае, і найчасцей выйграе толькі... адзін адвакацік!

Нядаўна з бліжэйшых нашых вёсак дзяліліся два браты, і, як гэта з давён вядзецца, пры дзяльбе прадзёўб адзін другому галаву. Той падаў у суд, і ўездны член прыкінуў гэнаму тры месяцы адсідкі. Гэны незадаволены і перадаўся ў акружны суд, і там яму зменшылі кару на адзін месяц. Добра і гэта, але ўсё ж трэба сядзець, а тут рабочы час — сяўба. Вось ён ідзе да адваката параіцца, як тут зрабіць, каб адбыць кару пасля сяўбы. Адвакат узяўся за нітачку і, намахаўшы прашэнне, сказаў занесці ў валасць пасведчыць подпіс, бо ён быў непісьменны. У валасці як прачыталі тое прашэнне, дык сталі ўсе рагатаць, бо там было гэтак напісана: «Ён незадаволен гэным судом і просіць прадоўжыць кару». Выходзіла так, што заместа аднаго месяца ён сам сабе прасіў тры! І добра яшчэ, што пісар быў добры чалавек і загадаў свайму памочніку напісаць прашэнне па-людску, а то, чаго добрага, гатовы былі да аднаго месяца далажыць яшчэ два. Быў і я ў той час у валасці і пытаюся: «Колькі ж, ваша, даў адвакату за гэткае прашэнне?» А ён мне адказаў: «Гатоўкі не даваў, але гэтак, па-суседску, шкалікаў з чатыры апаражнілі» [4].

## *1913 год*

### 1

Гэтымі днямі каля нас было некалькі нешчаслівых здарэнняў. У вёсцы Жураўцах налажыў на сябе рукі адзін малады чалавек. Ён пагнаўся на пасаг, ажаніўся ў мясаедзе, бо яму цесць абяцаў дзве дзесяціны зямлі пасагу. Тым часам, як у нас кажуць, «абяцанка — цацанка, а дурному радасць». Гэтак было і тут: жонку ён дастаў няўдалую, з той зямлёй парадку яшчэ не было, а тут, як на злосць, маладзёж у вочы лезе. Дык ён, налізаўшыся ў Валожыне парадна манапалькі, пайшоў дамоў, насыпаў паўрукі пораху, шроту і наверх кулю ў стрэльбу, выйшаў за гумно і ўляпіў сабе ў грудзі.

А ў вёсцы Замасцянах быў вялікі пажар, згарэла 22 хаты з усімі будынкамі. І хоць вёска Замасцяны ляжыць на самым беразе ракі Бярозы, але ў гэту суш ды пры такой праклятай шнуравой гаспадарцы не можна было даць ніякага ратунку, і агонь тады толькі ўняўся, як прыпёрся да прагонкі. А яшчэ, як на бяду, мужчын не было дома, бо цяпер у нас правяць дарогі, дык усіх гоняць на дарогу. Да агню кінуліся ўсе, хто толькі мог, адны ратаваць, а другія для цікавасці, от як гэта і заўсягды пры пажарах у нас. Дык гэтаксама і з вёскі Крыжына ўзялі людзі перабірацца на чаўнах праз раку да пажару, і ў адзін човен села трое дзяўчат і адзін хлапец, але чаўнок быў невялікі, не мог утрымаць на вадзе ўсяго цяжару і пачаў сёрбаць ваду, а ў палавіне ракі пачаў тануць. Пачуўся крык і лямант, і пакуль даспелі іх ратаваць, дык хлапец выплыў, двух дзяўчат выратавалі, а трэцюю, 19 гадоў дзяўчыну, дасталі ўжо нежывую. Трудна апісаць гора бедных пага-

рэльцаў і гора нешчаслівых бацькоў дзяўчыны! Зразумее гэта кожны селянін, што значыць бацькам свая дачка работніца! Браты беларусы! Кідайма старыя парадкі, а пераходзьма жывей на хутары. Будзе менш няшчасцяў, а карысці многа [1].

**2**

*У сваёй хаце — свая сіла*

«Служы пану верна, дык ён нос адверне» або яшчэ інакш; ёсць такая прымаўка. А што гэта святая праўда, кожан гэта скажа, бо, можа, не адзін хто і з нас гэтага дазнаў. А дазнаць гэтага не вельмі трудна, бо такіх здарэнняў можна сягоння налічыць сотні, і, каб прыйшлося ўсе іх апісваць, многа патрэбна было б зглуміць і часу, і паперы. А ўсё ж такі адным здарэннем хачу падзяліцца з чытачамі.

У адным глухім кутку нашай маці Беларусі ёсць невялікая вёска, а званне мае такое нейкае мудронае, што трудна яго ўцяміць (але, можа, гэта будзе для чытача не вельмі патрэбна). Вот жа ў той вёсцы жыў калісьці адзін заможны гаспадар, каторы цэлы свой век праслужыў у дварэ лесніком і памёр на гэтай службе. Ён праз цэлае сваё жыццё сцярог панскае дабро днямі і начамі, цягаўся па судах і сведчыў не раз проці сваіх суседзяў, а за гэта, разумеецца, не быў у іх у ласцы. Але пакуль жыў, усё ж такі суседзі яго крыху баяліся, бо, па праўдзе сказаўшы, як багацейшага дык не адзін шукаў яго ласкі. Пад гэны час у дварэ пачалі прадаваць зямлю і акурат пусцілі на прадажу кусок балота проці надзелу таей вёскі, за каторы ўпярод сяляне судзіліся з дваром, і той жа гаспадар (ляснік) угаварыў суседзяў, каб купіць тое балота цэлым сялом сабе на пашу. Сяля-

не спачатку не хацелі, а после неяк наважыліся і згадзіліся. Далі задатку і плацілі рату па раскладцы, а ў сёлетнім гаду трэба было ўносіць рэшту грошы і рабіць «купчую». А тым часам гаспадар гэны памёр, і после яго смерці астаўся гаспадарыць яго ўнук. А ў вёсцы найшліся павадыры, каторыя сталі падбухторваць сялян і гаварыць: «Яго дзед быў лесніком, сведчыў процi нас за гэта балота, і каб не ён, балота было б наша, дык мы яго ўнука не прымем у хаўрус і выкінем з пашы, а гэту часць, што на яго долю прыпадае, разбяром на вёску». А ў вёсцы так, калі адзін гаркнуў, дык усе возьмуцца як за нітачку і як нападуць гурмам на аднаго, дык трудна ацерабіцца. Гэны малады гаспадар, не трацячы надзеі, ідзе ў двор і думае: «Што ж, дзядуля мой служыў двару, а двор калі захоча, каб мяне не скрыўдзілі суседзі, дык яны нічога не зробяць. Прасіць я паноў не буду, каб мне ці падаравалі, ці спусцілі з цаны, няхай мне нараўне з усімі пазволяць купіць, мой жа задатак таксама заплачаны». У дварэ ўжо не тыя былі паны, каторым служыў яго дзядуля, але ўсё ж ткі былі некаторыя паняты, што аб гэтым ведалі і абяцалі яго не папусціць у крыўду. Але як прыйшлося да дзела, дык не захацелі мяшацца ў вясковую справу і памагчы ўнуку таго, каторы сцярог калісьці панскае дабро, як вока ў лобе. Паны без клопату ўзялі грошы ад вёскі, а сяляне з вялікай бядой ледзь адступілі гэнаму маладому гаспадару дзве дзесяціны карчоў. І цяпер сяляне будуць мець выгоду, а ўнук леснікоў за даўгалетнюю ўслугу дзеда астаўся без пашы і будзе цэлы свой век успамінаць панскія абяцанкі [2].

# ЖЫЦЦЯПІС МАЙГО БАЦЬКІ

## *Гелена Сівіцкая*

### I

Уладзіслаў Сівы-Сівіцкі нарадзіўся ў Валожыне 10.III.1865 г. Бацькі: Пётр і Людвіка з Емільянскіх, сялянскага паходжання, валодалі гаспадаркай у некалькі гектараў і хатаю ў Валожыне па вуліцы Віленскай, цяпер — Савецкая, № 49. Бацька працаваў кухарам у валожынскім маёнтку графа Тышкевіча, а маці займалася гаспадаркаю. Бацькі таты памерлі рана, пакінуўшы адзінага дзесяцігадовага сына Уладзіслава, які рос, выхоўваўся і вучыўся пры цётцы Юзэфе Емільянскай у Валожыне.

У 1892 г. ажаніўся з Антанінай Вайцяхоўскай і ў тым годзе пачаў пісаць вершы. У 1894 г. стаў працаваць у валожынскім маёнтку графа Тышкевіча аб'ездчыкам, а пасля, праз некалькі гадоў працы, дарос да ляснічага і на гэтай пасадзе працаваў у Валожыне, Сужанах і Ашмянах у таго самага гаспадара. У 1934 г. пайшоў на пенсію. За саракагадовую працу ў якасці пенсійнай узнагароды атрымаў ад Тышкевіча кавалак зямлі ў Шашэльгішках (Немянчынская гміна Віленскага павета). Бацька працаваў да глыбокай старасці, бо меў вялікую сям'ю: дзесяць дзяцей, якіх трэба было гадаваць, і ўнукаў. Жыццё закончыў у Шашэльгішках 30 верасня 1939 года. Пахаваны на могілках у Сужанах (той жа воласці і гміны).

Увесь час, пачынаючы з 1892 г., пісаў вершы, якіх сабралася шмат. Але ў час вайны многа іх панішчылася. У мяне захавалася нямала вершаў, напісаных пры розных акалічнасцях у 1932—1933 гг. (нумары ад 1013 да 1064)...

Я апекавалася бацькам да апошніх гадоў яго жыцця, а пасля смерці даглядала маці. Прывезла яе да сваякоў у Польшчу ў 1958 г.; памерла яна 6 чэрвеня 1964 г. ва ўзросце 94 год.

*6.I.1966 г.*

## II

Мой бацька любіў беларускі край і беларускую мову. Сам у маладосці перажыў многа гора і бяды, таму меў чулае сэрца да ўсіх бедных сялян, якім у тую пару вельмі цяжка жылося. Сваю жыццёвую пазіцыю здабыў толькі сваімі здольнасцямі. Не ганарыўся перад беднейшымі, а калі мог, памагаў ім добрай радай і ўсім, чым мог. Неаднойчы прасіў мяне напісаць упраўляючаму маёнткам ад імя ўдавы або пагарэльца і прасіць дрэва на хату ці якую іншую дапамогу.

Бацьку майго паважалі блізкія і дальнія сяляне. Бывалі такія дні, што ў нашай хаце было аж цесна ад сялян, якія прыходзілі ра́дзіцца, і заўсёды выбіралі яго, калі трэба было бараніць іх інтарэсы.

Мы, родныя, добра помнім, як ён, сагнуўшыся над сталом, кожную свабодную мінутку, а часта і ў познюю ноч, пісаў вершы. Калі меў вольную часіну, то і чытаў іх нам. Многа часу для сям'і не меў: апрача службы ў графа апрацоўваў сваю зямлю. Сам араў і сеяў, а мы на полі і ў гумне яму дапамагалі. Жылі нашы бацькі згодна, і я не салгу, калі скажу, што не бачыла, каб яны сварыліся.

Мой бацька добра ведаў, як цяжка жыць без навукі. Ён аддаў палавіну сваёй хаты пад школу, дзе вучылася многа дзяцей.

Я надта шкадую, што ў час першай і другой войнаў загінула больш тысячы вершаў бацькі, а тое, што я прыхавала, захоўваю як памяць...

*15.II.1966 г.*

## III

Мой бацька быў чалавекам, які вырас у асяроддзі прыдворнаместачковым. Меў таварыскую натуру, што склалася як у дамашнім асяроддзі, так і ў кантактах са служылымі людзьмі графскага маёнтка, дзе працаваў

кухарам яго бацька, пра якога ніколі нам не расказваў. Пасля смерці бацькоў як малалетак гадаваўся пад апекай цёткі Емільянскай. З самага дзяцінства меў вялікую цягу да кніжак. Самастойна навучыўся чытаць і пісаць, а пасля, ужо дарослым, актыўна набываў польскія і рускія кнігі і часопісы. Калі ж з'явіліся ў друку беларускія выданні, бацька імі вельмі зацікавіўся і заўсёды купляў і выпісваў.

Пачатак творчай працы яго датуецца знаёмствам з дзяўчынай, што стала нашай маці, якой прысвяціў нямала вершаў на польскай мове. На беларускай мове пачаў пісаць з часу абуджэння народнага руху.

Да жаніцьбы з маёй маці працаваў на гаспадарцы, якую пакінуў яму яго бацька. Пасля ж жаніцьбы, калі стала прыбаўляцца сям'я, бацька вымушаны быў пакла-паціцца аб дадатковым заробку ў маёнтку графа Тышкевіча. З 1894 года працаваў аб'ездчыкам, а праз некалькі гадоў стаў выконваць функцыі ляснічага ў маёнтках Тышкевіча на Валожыншчыне. У 1917 годзе бацьку перавялі служыць у Ашмяны, дзе працаваў ляснічым у тышкевічаўскіх маёнтках Ашмяны і Сужаны. Калі ж па гадах і здароўі не змог працаваць на ранейшай пасадзе, то стаў служыць касірам і рабіў ім да 1934 года. У тым жа годзе вясною пасяліўся ў Шашэльгішках на дзялцы, якую атрымаў за выслугу.

Мой бацька не быў чалавекам, аддадзеным толькі працы ў двары. Ён глыбока ўрос у беларускі народ, паходзіў з яго, разумеў яго і любіў. Размаўляў з людзьмі па-беларуску. Народныя звычаі, легенды, паданні найчасцей былі любімай тэмай размоў. Бацьку любілі, шанавалі ваколічныя сяляне, ганарыліся ім. Ён меў сувязь з усімі прылеснымі вёскамі. Заўсёды выступаў як блізкі чалавек, што адным раіў, другіх пераконваў, трэціх перасцерагаў. Вучыў, як лепш бараніцца ад бяды і гора.

У 1913 годзе выбухнуў пажар насупраць нашай хаты. Усе людзі выбеглі з царквы (было нейкае свята) і кінуліся ратаваць наш будынак, які ўжо зачынаў гарэць. Многа тады дамоў пагарэла, але наш, хоць з вялікай

цяжкасцю, быў уратаваны. Бацька прымаў удзел у грамадскай працы. Арганізаваў пажарную службу, зборы пажарнікаў і іх вучэнне праводзіў сам. Меў уражлівую натуру. Не мог пагадзіцца з уціскам купцоў, таму арганізаваў некалькі суседзяў, і яны пад кіраўніцтвам бацькі бралі непасрэдна са склада некаторыя тавары і дзялілі іх паміж сабой без дадатковай аплаты. Адным з першых у той час бацька зразумеў значэнне кааператыўнай працы.

Бацька вельмі любіў коней. Дбаў пра іх выгляд і чысціню. Ён быў добрым хлебаробам і ўзорным гаспадаром. Запомніўся маёй сястры такі выпадак: аднойчы прынесла бацьку на поле сняданне; коні стаялі ў баразне, а бацька, абапёршыся на плуг, запісваў нешта ў сшытак. Незвычайна прыгожая прырода, асабліва самотны спеў жаваранка, натхнялі яго на пісанне вершаў. Гаспадарка ў бацькі была невялікая, і хоць служба забірала вельмі шмат часу, знаходзіў пару гадзін на працу ў полі, беручы нас у помач.

Сям'я наша была вялікая. Апрача бацькоў, нас васьмёра дзяцей (чатыры сыны і чатыры дачкі) і дзве бабулі. Усе дзеці закончылі сярэднюю школу, а старэйшы сын Станіслаў і малодшая дачка Крыстына атрымалі універсітэцкую адукацыю. Бацька ў адносінах да нас, дзяцей, быў добры, але патрабавальны. Прысвячаў нам крыху часу. На свята гуляў з намі ў мяч, расказваў казкі, чытаў нам творы свае і іншых паэтаў беларускіх.

Пісаў шмат. Натхняўся светам прыроды, рознымі сямейнымі здарэннямі, працоўнымі перажываннямі, успамінамі, вопытам знаёмых і менш знаёмых людзей. Ці ведаў бацька беларускіх паэтаў, ці сустракаўся і кантактаваў з імі — таго не знаю...

Мой бацька кепска адчуваў сябе, выехаўшы з Валожына, тое асяроддзе, у якім вымушаны быў жыць, не было яму па душы. Не меў там задушэўных сяброў, з якімі можна было б пагаманіць і пачытаць ім свае вершы. Апошнія гады ў жыцці бацькі былі цяжкія, бо ён вымушаны быў будавацца, але заўсёды быў у настроі

і неаднойчы, калі мы прыязджалі на канікулы, сустракаў нас сваімі сімпатычнымі творамі. Пісаў амаль да апошніх дзён свайго жыцця.

Восенню занядужаў. Захварэў на запаленне лёгкіх. Памёр 30 верасня 1939 года. Пахавалі яго на сужанскіх могілках. На магіле паставілі вялікі дубовы крыж без надпісу...

На заканчэнне некалькі ўрыўкаў з вершаў бацькі, якія запомніліся:

Бо там смяюцца з нашай мовы
Капялюшныя галовы...
Нашы паны не так гуляюць,
Яны не па-нашаму пяюць,
Не нашу гутарку вядуць.
Наш брат, калі распусціць ногі,
Аж трэскі сыплюцца з падлогі,
Тупне нагой, як перуном,
Аж пыл падымецца віхром...

*18.XI.1967 г.*

# КАМЕНТАРЫІ

Творы Старога Уласа асобным выданнем ніколі не выходзілі, друкаваліся толькі ў перыёдыцы і асобных зборніках. У дадзенае выданне ўвайшло лепшае са спадчыны пісьменніка. Творы падаюцца, як правіла, па апошніх прыжыццёвых публікацыях (калі яны друкаваліся, а не захаваліся ў рукапісах), у сучасным напісанні. Лексічныя і некаторыя фанетычныя асаблівасці мовы аўтара (дзе гэта выклікаецца патрабаваннямі вершаванага рытму і рыфмы) захоўваюцца. Датуюцца творы (калі няма прамых аўтарскіх указанняў) годам першапублікацыі.

Усе творы, згодна іх жанравых характарыстык, групуюцца ў трох раздзелах: «Вершы», «Вершаваныя апавяданні», «Публіцыстыка». Унутры раздзелаў храналогія напісання твораў не захоўваецца (за выключэннем «Публіцыстыкі»).

Асобныя вершы і вершаваныя апавяданні Старога Уласа друкуюцца з рукапісаў, што знаходзяцца ў прыватных зборах. Перапісваючы свае творы ў агульныя сшыткі, паэт звычайна іх нумараваў. У некаторых рукапісах нумарацыя адсутнічае. Як правіла, адсутнічаюць і даты напісання твораў.

У каментарыях да асобных твораў паказваюцца іх першыя і ўсё найбольш значныя наступныя публікацыі.

## ВЕРШЫ

...*Слоўца адно, а часам другое* (с. 21). Упершыню — «Наша ніва», 1910, 8 ліпеня, з паметкай: Валожын. Пры жыцці аўтара друкаваўся таксама ў Беларускім календары

«Нашае нівы» на 1913 год (Вільня, 1913, с. 95) і ў выдадзеным лацінскімі літарамі Беларускім календары на 1914 год (Вільня, 1914, с. 11). Уваходзіў у Анталогію беларускай паэзіі ў трох тамах, т. 1 (Мн., 1961, с. 558) і зборнік «Беларуская дакастрычніцкая паэзія» (Мн., 1967, с. 451).

*Зімою* (с. 22). Перадрукоўваецца з рукапісу (№ 413). Пад вершам паметка: Сужаны, 5.1.1922 г.

*Зноб* (рус. озноб) — дрыжыкі, холад.

*Сватаўство* (с. 23). Упершыню — «Наша ніва», 1911, 10 лютага, з паметкай: Валожын, 2.2.1911 г. Пры жыцці аўтара друкаваўся ў «Беларускім дэкламатары» (Мн., 1924, с. 300), «Хрэстаматыі новай беларускай літаратуры (ад 1905 году)», укладзенай І. Дварчанінам (Вільня, 1927, с. 234) і ў зборніку «Дэкламатар, IV» (Мн., 1928, с. 354—355). Перадрукоўваўся ў Анталогіі беларускай паэзіі ў трох тамах, т. 1 (с. 558—559) і «Беларускай дакастрычніцкай паэзіі» (с. 452—453).

*На вяселле сваяку (с. 25).* Перадрукоўваецца з рукапісу (№ 854). Не датаваны.

*Цярплівы нябожчык* (с. 27). Упершыню — «Новае жыццё» (Вільня), 1923, 30 мая, з паметкай: мяст. Сужаны.

*Амбарас* (польск.) — клопат.

*Галас* (польск.) — шум, гоман.

*Тарапаты* (польск.) — турботы.

*Абяцадла* (с. 29) Упершыню — «Крыніца» (Вільня), 1924, 15 сакавіка. Абяцадла (польск.) — азбука, алфавіт. У гэтым мнеманічным вершы, лёгкім для запамінання і адрасаваным перш за ўсё дзецям, кожны радок пачынаецца з чарговай літары лацінскага алфавіта: A, B, C і г. д. Дзякуючы мнеманічным уласцівасцям вершаванай мовы ў памяці чытача заставаліся ўсе літары алфавіта ў іх належнай паслядоўнасці. Лацінскі алфавіт, побач з кірыліцай, даволі шырока выкарыстоўваўся ў беларускім пісьменстве на тэрыторыі былой Заходняй Беларусі. Гэта і прадвызначыла з'яўленне верша Старога Уласа.

*Вясна* (с. 30). Упершыню — «Наша ніва», 1911, 21 красавіка, з паметкай: Валожын.

*Тыкеля* (дыял.) — толькі.

*Сонейка прыгрэла* (с. 32). Упершыню без назвы — «Наша ніва», 1909, 28 мая. Перадрукоўваўся ў «Беларускай дакастрычніцкай паэзіі» (с. 450).

*З кутка праўды* (с. 33). Упершыню — «Наша ніва», 1909, 4 чэрвеня, з паметкай: Валожын. Друкаваўся пры жыц-

ці аўтара ў Беларускім календары «Нашае нівы» на 1912 год (Вільня, 1912, с. 93).

*Мода* (с. 34). Перадрукоўваецца з рукапісу (№ 909). Не датаваны.

*Цыбы* (дыял.) — доўгія худыя ногі.

*Выгаварылася* (с. 36). Перадрукоўваецца з рукапісу (№ 824). Не датаваны.

*Спрытны адказ* (с. 37). Упершыню — «Родная страха» (Вільня), 1922, 7 сакавіка.

*Прамчаўся май...* (с. 38). Упершыню без назвы — «Наша ніва», 1909, 2 чэрвеня, з паметкай: Валожын, 20.VI. Пры жыцці аўтара друкаваўся ў Першым беларускім календары «Нашае нівы» на 1910 год (Вільня, 1910, с. 60). Уваходзіў у Анталогію беларускай паэзіі ў трох тамах, т. 1 (с. 557).

*Зацішны куток* (с. 39). Упершыню — «Беларусь» (Мінск), 1920, 3 чэрвеня, з паметкай: Паміж Асаўца і Беластоку м. Кнышын.

*Урэчы* (дыял.) — нібы, як быццам.

*Паркоўка* (дыял.) — плот, паркан.

*У дажджлівы час* (с. 40). Упершыню варыянт верша на чатыры страфы пад назваю «Рабочы час» — «Наша ніва», 1912, 24 мая, з паметкай: 1909 г. Гэты варыянт перадрукоўваўся ў Беларускім календары на 1914 год (Вільня, 1914, с. 95), «Хрэстаматыі новай беларускай літаратуры (ад 1905 году)» (с. 233). Публікуецца па газеце «Беларускае жыццё» (Вільня), 1919, 30 ліпеня.

*Урода* (дыял.) — тут у значэнні «ўраджай».

*Пажар* (с. 42). Упершыню — Беларускі каляндар «Нашае нівы» на 1911 год (Вільня, 1911, с. 83), з паметкай: Валожын, 17.IX. 1909 г. У аснову верша пакладзены, відавочна, рэальны выпадак — пажар у Валожыне (гл., у прыватнасці, «З допісаў у «Нашу ніву», 140—141).

*Пра паноў* (с. 44). Перадрукоўваецца з рукапісу, які захаваўся не поўнасцю. Не датаваны.

*Восень* (с. 47). Перадрукоўваецца з рукапісу. Не датаваны. Наступны варыянт гэтага верша пад назвай «Беларуская восень» змешчаны ў «Нашай ніве», 1909, 5 лістапада:

Мінула лета — гарачы час,
Восень за гэта прыйшла да нас.
Стала няроўна сонейка грэць,
Затое поўна гумно і клець.
Голае поле. Зняты пасеў.

Не звоніць болей птушыны спеў...
Як бы заранне лета ўцякло.
Неба туманам завалакло,
Як цераз сіта сыпле рунец,
Лета ўмірае, лету канец.
Цёплыя летнія прайшлі дзянькі.
Вецер заносіць лісцем цянькі,
Круціць угору, заносіць удаль.
Сэрца сціскае туга і жаль.

*Пірог* (с. 48). Упершыню — «Родная страха», 1922, 25 лютага.

*Каму што* (с. 50). Упершыню — «Крыніца», 1924, 2 лютага.

*Дзяды* — дзень памяці продкаў, які беларусы адзначаюць восенню, 1 лістапада (у адрозненне ад вясенняй Радаўніцы, якая прыходзіцца на другі аўторак пасля Вялікадня).

*Думка бежанца* (с. 58). Перадрукоўваецца з рукапісу. Мяркуючы па невыразна напісанай даце — 12.V.191...— напісаны паміж 1915 (пачатак масавага бежанства беларусаў на Усход пад націскам нямецкіх войск) і 1920 гг.

*Учэсна* (польск.) — рана.

*Жаль* (с. 54). Перадрукоўваецца з рукапісу. Не датаваны.

*Як бы з налогу* — нібы па прывычцы.

*Боязна* (с. 56). Упершыню — «Беларуская думка» (Вільня), 1919, 7 чэрвеня. У вершы выкарыстаны (у некалькі змененым выглядзе) радкі з верша «...Слоўца адно, а часам другое» (гл. другую страфу).

*З Новым годам!* (с. 57). Упершыню без назвы — «Вольная Беларусь» (Мінск), 1918, 28 студзеня.

*Урочы* (польск.) — прывабны, чароўны.

*Грабя* (польск.) — граф.

Апошняе жаданне (с. 59). Упершыню «Крыніца», 1924, 4 студзеня.

## ВЕРШАВАНЫЯ АПАВЯДАННІ

*Год беларуса* (с. 63). Упершыню — «Наша ніва», 1910, 23 снежня, з паметкай: Валожын, 12.IV. 1909 г. Друкавалася таксама ў кнізе «Апавяданні і легенды вершам розных аўтараў» (Вільня, 1914, с. 40—48).

*Какалуша* (дыял.) — чаромха.

*Спешка, хунтоўка, дарагона, асаноўка* — назвы гатункаў бульбы.

*Пакрова* (Пакровы) — асенняе рэлігійнае свята, якое адзначаецца 14 кастрычніка.

*Шабальбон* — від фасолі, больш буйная фасоля.

*Лавандрэк* — лаванда.

*Курган* (с. 72). Упершыню — «Наша ніва», 1911, 21 ліпеня.

*Кумавы Магілы* (с. 76). Упершыню — «Наша ніва», 1911, 28 красавіка. Друкавалася ў кнізе «Апавяданні і легенды вершам розных аўтараў» (с. 76—79).

*Мярлог* (дыял.) — бярлога.

*Легенда і праўда* (с. 80). Упершыню — «Беларусь» (Мінск), 1920, 3 чэрвеня.

*Спадкі* — спадчына.

*Цікавы* (с. 83). Упершыню — «Bielavus» (Вільня), 1913, 11 красавіка. Друкавалася таксама ў «Нашай ніве», 1913, 3 мая, і ў кнізе «Апавяданні і легенды вершам розных аўтараў» (с. 92—94).

*Іголка* (с. 85). Упершыню — «Крыніца», 1924, 11 кастрычніка.

*Патрапіла каса на камень* (с. 89). Упершыню — «Беларусь», 1920, 3 чэрвеня.

*Баша* — паша.

*Рахубы* (польск.) — рахункі.

*Гдзе бярозы расахаты...* (с. 92). Перадрукоўваецца з рукапісу, дзе мае назвы «Абразок» (№ 855) і «Абразок 11» (№ 856). Не датавана.

*Магазынер* — загадчык магазына, агульнага вясковага свірна, у які сяляне ссыпалі страхавы фонд зерня.

*Сваты* (с. 96). Перадрукоўваецца з рукапісу (№ 1034). Уваходзіць у рукапісны зборнік Старога Уласа «Беларускія вершы 1932—1933 гг.».

*То ці ова* (польск.) — тое ці іншае; што-небудзь.

*Тры зладзеі* (с. 100). Упершыню — «Наша ніва», 1912, 3 жніўня, з паметкай: Валожын, 24.VII. 1912 г. Пры жыцці аўтара друкавалася ў Зборніку «Нашае нівы» № 2 (Вільня, 1912, с. 61—66), у кнізе «Апавяданні і легенды вершам розных аўтараў» (с. 64—69) і ў Беларускім календары «Нашае нівы» на 1916 год (Вільня, 1915, с. 63—68).

*Шпаркі* (польск.) — шчыліны.

*Fater Unser* (нямец.) — ойча наш.

*Суд* (с. 106). Перадрукоўваецца з рукапісу. Датуецца 12 мая 1912 г.

*Прыгавор* (с. 113). Упершыню — «Наша ніва», 1910, 20 мая, з паметкай: Валожын. Друкуецца па рукапісе.

*Паляванне* (с. 116). Упершыню — «Гоман» (Вільня), 1917, 13 ліпеня, з паметкай: Валожын, 1.IV. 1911 г.

*Не спанатрый* (с. 119). Упершыню — «Наша ніва», 1911, 17 лістапада. Пры жыцці аўтара неаднойчы перадрукоўвалася: у кнізе «Апавяданні і легенды вершам розных аўтараў» (с. 25—29), у Беларускім календары на 1914 год (с. 81—83), у «Хрэстаматыі новай беларускай літаратуры (ад 1905 году)» (с. 234—236).

*Спанатрыць* (польск.) — зразумець, уведаць, даўмецца.

*Прадаў* (с. 124). Перадрукоўваецца з рукапісу. Не датавана.

*Жальба ўцекача* (с. 127). Упершыню — «Беларусь», 1910, 7 ліпеня, з паметкай: Канец будзе. Расшукаць нумар газеты з заканчэннем твора не ўдалося.

## ПУБЛІЦЫСТЫКА

### З допісаў у «Нашу ніву»

*1909 год*

1. «Наша ніва», 1909, 7 мая. Гэты допіс, як і ўсе наступныя (за выключэннем асоба агавораных), пачынаецца з указання месца падзеі: м. Валожын Віленскай губерні Ашмянскага павета; усюды подпіс — Стары Улас.
2. «Наша ніва», 1909, 16 красавіка.
3. «Наша ніва», 1909, 25 чэрвеня.
4. «Наша ніва», 1909, 16 ліпеня.
5. «Наша ніва», 1909, 23 ліпеня.
6. «Наша ніва», 1909, 6 жніўня.
7. «Наша ніва», 1909, 24 верасня.
8. «Наша ніва», 1909, 8 кастрычніка.
9. «Наша ніва», 1909, 15 кастрычніка.
10. «Наша ніва», 1909, 5 лістапада.
11. «Наша ніва», 1909, 3 снежня.

*1910 год*

1. «Наша ніва», 1910, 21 студзеня. Падпісана ініцыяламі С. У.

2. Там жа. Месца дадзенай падзеі — «в. Ганчары Віленскай губерні Ашмянскага павета».

4. Там жа.

3. «Наша ніва», 1910, 4 лютага. Месца падзеі — «в. Ганчары Віленскай губерні Ашмянскага павета».

5. Там жа. Допіс з Валожына.

6. Там жа. Да гэтай нататкі дадзена наступнае рэдакцыйнае тлумачэнне: «Канца свету ад каметы не будзе — вучоныя людзі гэта ўжо растлумачылі. Але добра было б, каб скарэй прыйшоў іншы свет — лепшы; а то нейкі туман пайшоў па гасударстве, неяк як бы гніе жыццё, а людзі святлейшыя і рукі апусцілі. Трэба з гэтым гнойным жыццём ваяваць чым льга! Самі сабе людзі найгоршыя ворагі».

7. «Наша ніва», 1910, 11 лютага.

8. «Наша ніва», 1910, 18 лютага.

9. «Наша ніва», 1910, 18 лютага. Месца гэтай, як і папярэдняй, падзеі — вёска Брылькі.

10. Там жа. Месца падзеі — вёска Бурмакі.

11. Там жа. Месца падзеі — вёска Расолішкі.

*1911 год.*

1. «Наша ніва», 1911, 27 студзеня.

2. «Наша ніва», 1911, 17 лютага. Падпісана крыптанімам Ст. У-а-с.

3. «Наша ніва», 1911, 17 сакавіка.

4. «Наша ніва», 1911, 9 чэрвеня.

5. «Наша ніва», 1911, 6 кастрычніка.

*1912 год*

1. «Наша ніва», 1912, 5 студзеня.

2. «Наша ніва», 1912, 5 красавіка. Месца падзеі — «Пяршаі Віленскай губерні Ашмянскага павета».

3. «Наша ніва», 1912, 22 сакавіка.

4. «Наша ніва», 1912, 14 чэрвеня.

*1913 год*

1. «Наша ніва», 1913, 31 мая. Допіс надрукаваны пад загалоўкам «Што чуваць каля Валожына Ашмянскага павета».

2. «Наша ніва», 1913, 7 лістапада. Пад допісам паказана месца падзеі: «Ашмяншчына».

## ГЕЛЕНА СІВІЦКАЯ.
## ЖЫЦЦЯПІС МАЙГО БАЦЬКІ

Гелена Уладзіславаўна Сівіцкая — малодшая дачка Старога Уласа, якая жыла з ім да яго смерці ў 1939 годзе. «Жыццяпіс» склалі лісты Г. Сівіцкай 1966—1967 гг. да літаратуразнаўца Г. Каханоўскага ў адказ на яго просьбу рассказаць пра бацьку. Аўтарка лістоў жыла ў той час у горадзе Гнезна (ПНР). Напісаны яны на польскай мове. На беларускую мову перакладзены ўкладальнікам дадзенай кнігі.

## ЗМЕСТ

Паэт-самавук з Валожына. *Вячаслаў Рагойша* . . 5

ВЕРШЫ

«Слоўца адно, а часам другое...» . . . . . . . 21
Зімою . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 22
Сватаўство . . . . . . . . . . . . . . . . 23
На вяселле сваяку . . . . . . . . . . . . 25
Цярплівы нябожчык . . . . . . . . . . . 27
Абяцадла . . . . . . . . . . . . . . . . . 29
Вясна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 30
Сонейка прыгрэла... . . . . . . . . . . . 32
З кутка праўды . . . . . . . . . . . . . . 33
Мода . . . . .. . . . . . . . . . . . . . . 34
Выгаварылася . . . . . . . . . . . . . . . 36
Спрытны адказ . . . . . . . . . . . . . . 37
Прамчаўся май . . . . . . . . . . . . . . 38
Зацішны куток . . . . . . . . . . . . . . 39
У дажджлівы час . . . . . . . . . . . . . 40
Пажар . . . . . . . . . . . . . . . . . . 42
Пра паноў . . . . . . . . . . . . . . . . 44
Восень . . . . . . . . . . . . . . . . . . 47

Пірог . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 48
Каму што . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 50
Думка бежанца . . . . . . . . . . . . . . . . 52
Жаль . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 54
Боязна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 56
З Новым годам! . . . . . . . . . . . . . . . 57
Апошняе жаданне . . . . . . . . . . . . . . 59

## ВЕРШАВАНЫЯ АПАВЯДАННІ

Год беларуса . . . . . . . . . . . . . . . . . 63
Курган . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 72
Кумавы Магілы . . . . . . . . . . . . . . . . 76
Легенда і праўда . . . . . . . . . . . . . . . 80
Цікавы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 83
Іголка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 85
Патрапіла каса на камень . . . . . . . . . 89
Гдзе бярозы расахаты . . . . . . . . . . . . 92
Сваты . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 96
Тры зладзеі . . . . . . . . . . . . . . . . . . 100
Суд . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 106
Прыгавор . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 113
Паляванне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 116
Не спанатрыў . . . . . . . . . . . . . . . . . 119
Прадаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 124
Жальба ўцекача . . . . . . . . . . . . . . . 127

## ПУБЛІЦЫСТЫКА

З допісаў у «Нашу ніву» . . . . . . . . . 137

Жыццяпіс майго бацькі. *Гелена Сівіцкая* . . . . 160

Каментарыі . . . . . . . . . . . . . . . . . . 165

**Стары Улас**

С 77 Год беларуса: Вершы. Вершав. апавяданні. Публіцыстыка/Уклад., падрыхт. тэкстаў, уступ. арт. і камент. В. Рагойшы.— Мн.: Маст. літ., 1990.— 174 с., [5] л. іл., партр.— (Спадчына).

ISBN 5-340-00529-1.

Старый Улас. Год белоруса: Стихи. Стихотворные рассказы. Публицистика.

Гэта кніга — першае выданне твораў Старога Уласа (Уладзіслава Пятровіча Сівога-Сівіцкага (1865—1939), беларускага паэта, пра якога М. Гарэцкі сказаў, што такія паэты «...маюць у нашай паэзіі літаратурна-маральнае значэнне як паэты з мазолістай рукою, што не толькі «з народа», але і «сам народ». Большасць вершаў — мастацкая апрацоўка народных легенд і паданняў.

**С** $\frac{\mathbf{4702120202—130}}{\mathbf{М\ 302(03)—90}}$ **122—90** **ББК 84Бел7**

*Литературно-художественное издание*

**Старый Улас**
**(Сивый-Сивицкий Владислав Петрович)**

***ГОД БЕЛОРУСА***

Стихи. Стихотворные рассказы.
Публицистика

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Стары Улас**
**(Сівы-Сівіцкі Уладзіслаў Пятровіч)**

***ГОД БЕЛАРУСА***

Вершы. Вершаваныя апавяданні.
Публіцыстыка

Рэдактар *Л. Р. Законнікава*
Мастак *Я. П. Зельская*
Мастацкі рэдактар *Л. Я. Прагін*
Тэхнічны рэдактар *Л. М. Шлапо*
Карэктар *Я. Ф. Харко*

ІБ № 3321
Здадзена ў набор 14.12.89. Падп. да друку 11.05.90. Фармат 70×100 1/32. Папера друк. № 1. Гарнітура літаратурная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 7,15+0,40. Ум. фарб.-адб. 8,69. Ул.-выд. арк. 6,81. Тыраж 3900 экз. Зак. 3144. Цана 80 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па друку. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

80 к.

Стари глас